№ 21 (427) 3 чэрвеня 2005

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Гісторыя прыгажосьці**
Эсэ Умбэрта Эка.
старонка 18

**Галадоўка ў Жодзіне**
Першая перамога.
старонка 2

**Куды варта ехаць**
Афіша чэрвеня.
старонка 9

З УСІХ СТАРОН

**Цьвёрдае францускае “non”**

Французы галасавалі і супраць беларусаў таксама. **Старонка 2.**

САЛІДАРНАСЬЦЬ

**Выкупіць фэн Марыны Багдановіч**

У краме канфіскату на Купрыянава, 4. **Старонка 6.**

ТЭАТАР

**Падпольная прэм’ера Купалаўскага**

Усе ведалі, што Ўладзімер Шчэрбань падрыхтаваў нешта нечаканае. Толькі за дзень да прэм’еры ўдалося знайсьці пляцоўку — у кавярні “Графіці”, ля барнай стойкі, у цыгарэтным дыме. **Старонка 8.**

СПОРТ

**Карупцыя ў шахматах**

Вялікі спорт поўніцца скандаламі, і “каралеўская гульня” ў Беларусі ня стала выняткам. **Старонка 21.**

ПАЛЕМІКА

**Ці сапраўды лібэральныя беларускія “лібэралы”?**

У адным з апошніх “Праскіх акцэнтаў” на радыё “Свабода”, у якім абмяркоўваліся вынікі моўнага рэфэрэндуму 1995 году… **Старонка 2.**

**Дык падпісвайся на паўгодзьдзе!**

Падпісны індэкс «Нашай Нівы» 63125. Падпіску на «НН» прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку». У чэрвені можна падпісацца адразу на паўгодзьдзе. Для прыватных асобаў — 4510 рублёў на месяц, для арганізацыяў — 5631 рубель. Падпіска на шапікі “Белсаюздруку” каштуе 3340 рублёў на месяц. «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень.

# Як пасадзіш, так і сажнеш

Кампанія–2006 у атмасфэры тэрору: **Мікола Статкевіч** і **Павал Севярынец** атрымалі па два гады хіміі за «арганізацыю масавых беспарадкаў» — старонка 12. Забаронена выкарыстоўваць словы «беларускі» і «нацыянальны» ў назвах — старонка 2. Сход інтэлігенцыі вылучае Коласа — старонка 3.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Паўзучая нерухомасьць

Цэны на кватэры ў Менску параўняліся з цэнтральнаэўрапейскімі. Намесьнік міністра будаўніцтва: «цэны нагналі расейцы, якія масава скупляюць беларускую нерухомасьць». Піша **Алесь Кудрыцкі**.

Цэны на менскую нерухомасьць працягваюць імкліва расьці. Запаволеньня іх росту ў найбліжэйшай будучыні не прадбачыцца. Разабрацца, чаму так адбываецца, няпроста: адыгрывае ролю і рост сталічнага насельніцтва, а таксама павышэньне ягоных прыбыткаў, і абмежаваньні на продаж кватэр, пабудаваных на льготных умовах, і няздольнасьць будаўнікоў пасьпець за патрэбамі рынку. А намесьнік міністра архітэктуры і будаўніцтва Міхаіл Абрамчук, адказваючы на мінулым тыдні ў палаце прадстаўнікоў на пытаньні парлямэнтароў, наагул выказаў думку, што цэны на нерухомасьць нагналі расейцы, якія масава скупляюць кватэры ў сталіцы.

Прычыны прычынамі, а вынік навідавоку: аднапакаёвай кватэры за 20 тысяч даляраў у сталіцы ўжо не адшукаць. Сярэднюю цану вызначыць цяжка — усё ўпіраецца ў тое, якія кватэры ўключаюцца ў статыстыку. Калі аналізаваць цэны выключна на стандартныя кватэры, вынік будзе адзін, а калі ўлічваць унікальныя кватэры, накшталт аднапакаёвак вялікай плошчы ды экстравагантных шматпакаёвак, то сярэдняя цана атрымаецца больш высокай. Такім чынам, найчасьцей фігуруюць лічбы ад 770 да 850 даляраў за квадратны мэтар. Прычым найбольш каштуюць мэтры ў аднапакаёўках — самым даступным, а таму пажаданым тавары на рынку нерухомасьці.

Сярэдняя цана аднапакаёўкі — крыху больш за 30 тыс. даляраў, двухпакаёвай кватэры — 42 тыс., трохпакаёўкі — 55 тыс., а чатырохпакаёвай кватэры — 60 тыс.

Працяг на старонцы 5.

50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЎНІВЭРСЫТЭТ. Жодзінская галадоўка актуалізавала адзін даўні праект — стварэньне нацыянальнага ўнівэрсытэту. Вядома, задача з разраду немагчымага — стварыць такую школу ў Беларусі (патрэбная яна менавіта ў Беларусі, каб запабегчы вывазу нашых сьветлых галоваў за мяжу). На грамадзкіх пачатках? на кватэрах? у андэграўндзе? Калі незалежнаму грамадзтву ўдасца такое гістарычнае дасягненьне, хлопцы не застануцца без адукацыі.
КРЫНІЦА ЎЛАДЫ. Указ аб забароне выкарыстаньня словаў “беларускі” і “нацыянальны” ў назвах камэрцыйных структураў мае дапячы незалежным газэтам. Аднак ён ударыць адначасова і па брэндах капіталу “Беларускі абутак”, “Беларускія песьняры”. Дый словы “нацыянальны” й “беларускі” будуць ужывацца радзей. Нагадвае забарону ўжываньня слова «Беларусь» у царскай Расеі і тагачасныя назвы капіталу «Северо-Западный рынок»...
Калі зрабіць апытаньне, хто ў нас крыніца ўлады, дзевяць зь дзесяці чалавек адкажа — прэзыдэнт. Між тым канстытуцыя адназначна пастулюе, што крыніца ўлады, г.зн. крыніца дзяржаўнасьці — народ Беларусі. Не вэртыкаль, не дэпутаты — усе грамадзяне разам. З чаго вынікае, што ніхто ня мае права казаць “улада — гэта я” ці пытацца, “хто вам даваў права ісьці супраць улады”. Адпаведна, і недзяржаўныя, і дзяржаўныя інстытуты ці выданьні маюць роўныя правы называцца “беларускімі”, ці “нацыянальнымі”, ці якімі хочуць. Яны ў прынцыпе маюць роўныя правы. Іх заснавалі грамадзяне, якія складаюць гэты самы “народ”.
ЗНОЎ ПРА РЭФЭРЭНДУМ. Ці можна было будаваць дэмакратычную Нямеччыну, скасаваўшы вынік усіх гітлерскіх рэфэрэндумаў, акрамя першага? Можна, мяркуе лібэрал Леанід Злотнікаў. Гэтак я вобразна перадаў сэнс ягоных выказваньняў з нагоды 10-годзьдзя Ганебнага рэфэрэндуму на круглым стале радыё “Свабода”. Сп.Злотнікаву адказвае наш лёнданскі аўтар Сяржук Вінаградаў — **старонка 2**.
Калі вы прызнаеце справядлівасьць таго рэфэрэндуму, вы прызнаеце справядлівасьць усяго, што здарылася пазьней, што зь яго лягічна вынікала і было непазьбежным “ажыцьцяўленьнем волі”. Рэфэрэндум 1995-га — гэта ключ да разуменьня ўсяе пазьнейшае гісторыі Беларусі. А супраціў яму — гэта зародак усяго руху грамадзянскага непадпарадкаваньня, які разгарнуўся пасьля. (Як рэфэрэндум палітызаваў абсалютна апалітычных людзей — мэмуары Лёліка Ушкіна **на старонцы 14**.) Ня можа быць фактычнае свабоды ў Беларусі, пакуль працягваецца фактычнае вынішчэньне беларускае культуры. Незваротную зьмену рэжыму можна будзе канстатаваць толькі пасьля адмены вынікаў таго першага рэфэрэндуму. Бо гэта яны ёсьць самай асновай гэтага рэжыму. Прызнаючы гэтую аснову, ніякіх зьменаў не дасягнуць.

# Незалежная рэспубліка Жодзіна

Жодзінскія хлопцы працягваюць трымаць галадоўку. Акцыя пачалася тыдзень таму, у сераду. Горад у Смалявіцкім раёне зрабіўся магнітам, які прыцягвае да сябе ўсіх, хто ведае смак свабоды. Анатоль Лябедзька і Марына Багдановіч былі першымі з апазыцыйных палітыкаў, якія наведалі хлопцаў. У панядзелак Кася Камоцкая сьпявала хлопцам пад гітару. 1 чэрвеня хлопцаў наведалі сябры Рады беларускай інтэлігенцыі. Тэлефон не змаўкае.

У Жодзіне актыўна ідзе збор подпісаў у падтрымку хлопцаў. Цяпер у горадзе галадаюць шасьцёра юнакоў: Зьміцер Чарткоў, Аляксандар Вінаградаў, Яўген Ваўкавец, Сяржук Мурашка, Павал Каранюхін і Сяржук Марчык (з Баранавічаў). 30 траўня да іх далучыўся зубровец Міхась Кандрашоў, які галадае ў Барысаве. Распачалі акцыю таксама і менчукі — кіраўнік маладафронтаўцаў Зьміцер Дашкевіч і яго паплечнік Артур Фінькевіч. У Бабруйску галадае Валер Мацкевіч, у Кіеве — Ігар Шчыкарэвіч.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

1 чэрвеня акцыі салідарнасьці з галадоўшчыкамі прайшлі ва Ўкраіне, у Швэцыі, Польшчы, Нарвэгіі, Літве, Латвіі, ЗША, Бэльгіі. Найбуйнейшая акцыя прайшла ў Менску, ля будынку Міністэрства адукацыі. 28 вядомых у краіне асобаў – народныя паэты Беларусі, акадэмікі, рок-сьпевакі, палітыкі, журналісты, праваабаронцы — падпісалі зварот да ўладаў з патрабаваньнем выканаць патрабаваньні галадоўнікаў.

Пакуль падпісанты вялі перамовы з начальнікам упраўленьня вышэйшай і сярэдняй спэцыяльнай адукацыі Юр’ем Міксюком, пяцёра маладафронтаўцаў на вуліцы пачапілі на грудзі плякаты “Дзеці жадаюць вучыцца”. Падышлі два міліцыянты і папрасілі патлумачыць, што тут адбываецца. Пікетчыкі адказалі, што выказваюць пратэст супраць выключэньняў школьнікаў і студэнтаў. “Дык выключылі ж за штo-та!” — сказалі міліцыянты і адышлі.

Рашэньне выйсьці на вуліцу адна зь пікетоўцаў, Тоня Вежнявец, абгрунтоўвае так: “Тое, што адбываецца — гэта няправільна. Кожны чалавек мае права на асабістую думку, а яму затыкаюць рот”. Яе сяброўка Наста Палажанка кажа: “Цяпер у нашай краіне пануе такі жах, калі ўсе людзі маўчаць і ня могуць нічога зрабіць. Мы супраць гэтага”. У пікеце стаіць і 19-гадовы Кірыла Шымановіч, якога адлічылі зь Менскага юрыдычнага каледжу. Пасьля Чарнобыльскага шляху Кірыла адседзеў 10 сутак на Акрэсьціна, а калі прыйшоў у каледж, яму паведамілі, што ён ужо адлічаны. “Быццам бы я парушыў статут юрыдычнага каледжу і самога БДУ, у структуры якога знаходзіцца каледж”.

Жодзінцы цешацца першай невялікай перамозе: Натальлю Максімаву і Вольгу Галубец, якім пагражалі адлічэньнем з гімназіі, запрасілі ў Жодзінскі гарвыканкам і папрасілі выбачэньня “за непаразуменьне”. Дзяўчаты будуць вучыцца.

**Алесь Кудрыцкі**

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Беларусь—Славенія

20 тысяч квіткоў было прададзена на матч Беларусь—Славенія па стане на ранак серады. Адборачны матч да чэмпіянату сьвету пройдзе ў суботу (пачатак а 20-й), і на “Дынама” мяркуюць запоўніць усе 40 тысяч месцаў.

ВОСЬ СЫМБАЛЬ ТВОЙ...



### І рак з клюшнёю

У раку Лясную, што цячэ ад Каменца да Берасьця, праз 20 гадоў адсутнасьці вярнуліся ракі. За сьветамі ракі зьвяліся праз забруджваньне рэчкі, што амывае Белавежу. Калі за часоў незалежнасьці экалёгію наравістае рэчкі нармалізавалі, ракам ужо не было адкуль вярнуцца. Берасьцейскія прыродаахоўнікі вырашылі аднавіць папуляцыю. Сто кіляў ракаў для Лясной перавезьлі з возера Олтуш, што на Маларыччыне.

ЦЫТАТА

### Жырыноўскаму ў Беларусі раздольле

Уладзімер Жырыноўскі, лідэр расейскіх нацыяналістаў, сказаў на сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам: “Беларусь для мяне — цудоўная краіна па ўсіх кірунках: у эканоміцы, культуры, спорце. У Беларусі станоўчыя тэндэнцыі, адмоўных практычна няма”.

МУШТАРДА

## Цьвёрдае францускае «Non!»

Французы галасавалі і супраць беларусаў, супраць палякаў і ўкраінцаў. Яны нам не давяраюць, і маюць на гэта поўнае права. Піша **Алесь Белы**.

Менш за ўсё гэтага можна было чакаць ад радзімы Вальтэра і дэ Сада, шматвяковай хаўрусьніцы турэцкай і расейскай дэспатый, цытадэлі бюракратызму. Аж раптам менавіта суайчыньнікі Астэрыкса пракацілі на рэфэрэндуме брусэльскіх цэзараў. Не давяраючы ўласным народам, эўрапейскія ўрады дзе толькі магчыма вырашалі лёс Эўропы ва ўтульных кулюарах. Зь дзевяці краін, дзе дагэтуль прагучаў адказ “так” эўрапейскай канстытуцыі, толькі ў Гішпаніі ён быў атрыманы на рэфэрэндуме. І вось цяпер — цьвёрдае францускае “Non!”.

Тэарэтычна сам сучасны фармат эўрапейскай еднасьці можна лічыць правалены: для ўхвалы Канстытуцыі ЭЗ патрабуецца поўны кансэнсус усіх 25 краін-сяброў. Аднак ня будзем сьпяшацца з высновамі: пакаленьне таму Маастрыхцкая дамова таксама ня мела аднадушнай падтрымкі эўрапейцаў, але ў “праблемных” краінах рэфэрэндумы праводзілі колькі хочаш разоў, пакуль не атрымлівалі слушнага, г.зн. патрэбнага Брусэлю, выніку.
Астранамічныя заробкі поп-зорак, завоблачныя падаткі, бязглуздыя СМІ, распад традыцыйнай сям’і, масавая абыякавасьць 450-мільённае папуляцыі да грамадзкіх праблем усіх узроўняў — ад мясцовых супольнасьцяў да кантынэнту ў цэлым — вось што характарызуе монстра-супэрдзяржаву.

Працяг на старонцы 11.

ПРАВАКАЦЫЯ ТЫДНЯ

### Народна-вызвольная армія

31 траўня беларускія СМІ атрымалі праз электронную пошту пасланьне нейкай Беларускай народна-вызвольнай арміі. Паўстанцы патрабуюць адстаўкі Аляксандра Лукашэнкі, ліквідацыю палітычнага, ідэалягічнага і прапагандысцкага апаратаў цяперашніх уладаў, стварэньне ўраду народнага даверу. Для пачатку БНВА ўльтыматыўна заклікае кіраўнікоў Беларусі «ўступіць у дыялёг з прадстаўнікамі апазыцыі». У адваротным выпадку яна пагражае «перайсьці да баявых дзеяньняў» з 15 чэрвеня.

Газэта «Народная воля» мяркуе, што дакумэнт мог быць сфабрыкаваны з мэтаю апраўдаць распачатыя палітычныя рэпрэсіі супраць апазыцыі і СМІ.

ПАЛЕМІКА

## Ці сапраўды лібэральныя беларускія «лібэралы»?

У адным з апошніх «Праскіх акцэнтаў» на радыё «Свабода», у якім абмяркоўваліся вынікі моўнага рэфэрэндуму 1995 году, адбылася цікавая і паказальная дыскусія між старшынём ТБМ А.Трусавым і эканамістам Л.Злотнікавым. Падчас абмеркаваньня сп.Злотнікаў некалькі разоў абвясьціў сябе «лібэралам». З другога боку, сп.Злотнікаў падчас дыскусіі ня выявіў ніякае салідарнасьці ў дачыненьні да змаганьня беларускамоўных сугрмадзян за свае моўныя правы.
Паспрабуем прааналізаваць, ці стасуецца гэткая абыякавасьць да беларушчыны зь лібэральнымі прынцыпамі, якія быццам бы спавядаюць беларускія «лібэралы».
Спачатку зірнём на значэньне слоў «лібэралізм» і «лібэральны». Паводле оксфардзкага слоўніка ангельскае мовы, лібэралізм — ідэалёгія, прыхільная да паступовых палітычных і сацыяльных рэформаў у напрамку асабістае свабоды і дэмакратыі; дэмакратыя — форма кіраваньня, якая падтрымлівае роўныя правы. Роўныя правы разумеюцца як супрацьлегласьць дыскрымінацыі людзей на падставе іх расы, полу, узросту, этнічнага паходжаньня, мовы і гэтак далей.

Працяг на старонцы 15.

«ARCHE»: падпіска і продаж
Толькі да канца чэрвеня ў краме “Марат” можна купіць усе пяць апошніх нумароў “ARCHE”. Інтэрнацыянальная, 11а.
Працягваецца падпіска на незалежны часопіс. На другое паўгодзьдзе на “ARCHE” можна падпісацца на любым аддзяленьні “Белпошты”. Падпісны індэкс 00345.


# Сход ста пад Радашкавічамі: Коласа ў прэзыдэнты

Сто гадоў таму Якуб Колас трапіў у турму за ўдзел у нелегальным сходзе настаўнікаў, а цяпер для Ўладзімера Коласа «маёўка» стала крокам на шляху да прэзыдэнцкіх выбараў—2006. У апошнюю суботу траўня ягоную кандыдатуру прапанаваў III Усебеларускі сход інтэлігенцыі.


ГЕОРГІ ЛІХТАРОВІЧ

### Крытыка Франкенштайнаў

Улічыўшы досьвед зьезду сацыял-дэмакратаў і віцебскай абласной канфэрэнцыі па вылучэньні адзінага кандыдата, арганізатары мерапрыемства вывезьлі ўдзельнікаў за Радашкавічы, на памежжа Маладэчанскага і Вялейскага раёнаў. За паўтары гадзіны паставілі лавы, паміж дрэваў нацягнулі вялізныя белыя й чырвоныя расьцяжкі-палотнішчы — ідэя Артура Клінава. На заднім пляне тахкаў дызэль, даючы сілкаваньне мікрафону.

Агулам сабралося сто дэлегатаў з усіх рэгіёнаў. Проці абяцаньняў сямідзесяці дэлегатаў ад кожнай вобласьці — няшмат.

Прысутнічалі на лясным сходзе прадстаўнікі замежжа — дэлегаты Клюбу каталіцкай інтэлігенцыі з Польшчы Марак Келяноўскі ды Павал Брашкоўскі і дырэктар грузінскага аналітычнага цэнтру «Сусьветная лябараторыя» Сасо Цыскарышвілі. Палітыкаў было трое — Людміла Гразнова, Валер Фралоў, Аляксей Кароль. Затое прысутнічала шмат літаратараў — Сяргей Законьнікаў, Анатоль Вярцінскі, Уладзімер Содаль, Франц Сіўко, Максім Клімковіч, Лера Сом — ды мастакоў — Рыгор Сітніца, Георгі Ліхтаровіч, Алесь Цыркуноў. Не было рокераў, былі лічаныя інтэлектуалы маладзейшага пакаленьня.

У сваёй прамове Ўладзімер Колас згадаў легенду пра стварэньню Франкенштайнам пачвару. З таленавітым, але бессаромным навукоўцам, які спарадзіў на сьвет жудасную істоту, ён параўнаў тых, «хто прывёў дыктатара да ўлады». Зрабіў дырэктар Ліцэю і некалькі выпадаў на адрас палітыкаў-калегаў — маўляў, за прэтэндэнтам на прэзыдэнцкую пасаду не павінен цягнуцца шлейф параз у папярэдніх кампаніях. Ён таксама заклікаў не спакушацца на харызматычнага лідэра: маўляў, Данка, прыйшоўшы да ўлады, ператвараецца ў хітрага Урфіна Джуса, які хаваецца за сьпінамі драўляных салдатаў. Асобную ўвагу старшыня Рады інтэлігенцыі зьвярнуў на распаўсюджаныя аблуды. Мітамі назваў сьцьверджаньні пра сьціпласьць і безьлівасьць беларусаў («Ці ня самі мы распаўсюджваем показкі пра цьвік і вяроўку?»). Аблудай — перакананьне ў заведамай несумленнасьці палітыкі.

### Даішнікі-эколягі

Прыблізна праз гадзіну пасьля пачатку сходу на паляне зьявіліся супрацоўнікі ДПС, чамусьці з апэратарам. Даішнікі палічылі транспарт удзельнікаў сходу… няправільна прыпаркаваным ды папрасілі адагнаць машыны з маладой травы на дарогу. Ад апэратара ж адракліся: журналіст, мы яго ня ведаем. Цікаўным удалося падслухаць, як старшы ў групе папрасіў па тэлефоне выслаць на дапамогу машыну з АМАНам…

Сход працягваўся. Намесьніца галоўнага рэдактара «Народнай волі» Сьвятлана Калінкіна адзначыла, што неабходна распрацоўваць стратэгію хуткай перамогі: «Ідуць гаворкі пра радыёстанцыі й гэтак далей. Калі мы разьлічваем змагацца яшчэ дзесяць гадоў, то можна так казаць». У адказ дасталося самой «Народнай волі». Яе раскрытыкавалі за надрукаваны якраз у суботнім нумары артыкул пісьменьніка Васіля Якавенкі з абвінавачаньнямі старшыні Рады інтэлігенцыі ў нецярплівасьці да іншадумства ў арганізацыі.

### Колькі людзей у Коласа

Адчувалася крытычнае стаўленьне да старшыні Рады інтэлігенцыі і ў асобных выступах дэлегатаў і гасьцей сходу.

Сацыял-дэмакрат А.Кароль скарыстаў трыбуну для агучваньня «тэзісаў Казуліна, якія зьяўляюцца і пазыцыяй партыі», ды «наехаў» на Лябедзьку, які назваў экс-рэктара БДУ беларускім Януковічам. Сп.Кароль прапанаваў не пазьней чым у лістападзе правесьці шырокае сацыялягічнае апытаньне, каб вызначыць найбольш папулярнага лідэра, па выніках апытаньня арганізаваць круглы стол для выпрацоўкі выбарчай стратэгіі і толькі пасьля гэтага пры канцы 2005 году правесьці Кангрэс.

Слуцкая настаўніца Зінаіда Цімошык заклікала Коласа й прысутных быць рэалістамі. Яна адзначыла, што для перамогі кандыдат у прэзыдэнты павінен мець у кожным раёне ня менш за 40—50 актывістаў, гатовых ісьці за ім да канца: «Ці ёсьць столькі людзей у Коласа? Такой сілы сёньня ні ў кога няма! Дэлегаты сходу самі зьяўляюцца сябрамі розных партый і, значыць, будуць уключаны ў іншыя кампаніі».

Яе падтрымаў генэрал Фралоў, які прапанаваў уключацца ў адзіны працэс па вылучэньні кандыдата: «Трэба ўжо выбраць аднаго (хай, можа, і ня самага лепшага) і працаваць на яго». Сам жа Фралоў з камандай аднадумцаў (А.Вайтовіч, А.Яращук, У.Парфяновіч) рыхтуецца арганізаваць рэфэрэндум па зьменах у Выбарчым кодэксе.

На яшчэ адзін момант падрыхтоўкі да прэзыдэнцкіх выбараў зьвярнуў увагу рэпатрыянт Алесь Абрамовіч з Барысава: «Улады глухія да нашых патрабаваньняў, таму трэба выкарыстоўваць вулічны ціск. Трэба быць гатовымі вывесьці 10, 20, 50 тысяч людзей на Кастрычніцкую плошчу падчас прэзыдэнцкіх выбараў».

Зрэшты, пакуль што такая ваяўнічасьць застаецца толькі на словах. За рэзалюцыю сходу дэлегаты вырашылі не галасаваць, каб ня даць падставы для рэпрэсій. Генадзь Бураўкін, які вёў сход, папрасіў згодных з рэзалюцыяй паставіць пад ёй подпіс. У рэзалюцыю ўлучылі забавязаньне для Коласа правесьці абавязковыя перамовы зь іншымі кандыдатамі ў прэзыдэнты.

**Аркадзь Шанскі, Тамаш Гурба, радашкавіцкія лясы**

## СЬЦІСЛА

### Трагедыя ў Конга

Стала вядома імя пілота, што загінуў на тым тыдні ў авіякатастрофе ў Конга. Гэта — Аляксандар Амельчанка, 1972 г. н., які раней працаваў у авіякампаніі "Горадня". Самалёт АН-12 вылецеў з гораду Гома 25 траўня, а потым раптоўна зьнік з экранаў радараў. Праз нейкі час міністэрства абароны Конга пацьвердзіла авіякатастрофу. На борце самалёта знаходзілася 22 пасажыры і пяць членаў экіпажу — чацьвёра расейцаў і украінцаў і адзін беларус. Усе загінулі. Нагадаем, што ў сакавіку ў Танзаніі разьбіўся транспартны самалёт ІЛ-76 з шасьцю пілотамі-беларусамі.

### Новыя патрабаваньні да юрыдычных ВНУ

Мінюст зробіць больш жорсткімі патрабаваньні да юрыдычных ВНУ. Робіцца гэта ў мэтах удасканаленьня якасьці падрыхтоўкі юрыдычных кадраў. Так, паводле патрабаваньняў Мінюсту, у такіх ВНУ на адпаведных спэцыяльнасьцях павінны працаваць ня менш за 10% дактароў юрыдычных навук і прафэсараў, 50% кандыдатаў юрыдычных навук і 40% выкладчыкаў, што маюць навуковую ступень. Апроч таго, выкладчыкі, што навучаюць студэнтаў па спэцыяльнасьці "права", павінны мець ня менш за тры гады стажу па спэцыяльнасьці.

### Як паскардзіцца на мытніка

Дзяржаўны мытны камітэт заклікаў грамадзян інфармаваць аб выпадках парушэньняў прафэсійнай этыкі мытнікамі пры ажыцьцяўленьні мытнага кантролю, а таксама фактах мытных парушэньняў (кантрабанда, няправільнае дэкляраваньне, ухіленьне ад выплаты мытных плацяжоў). Пра ўсе факты паведамляць на нумар 218-92-92, альбо на e-mail: doverie@customs.gov

### Перамога БХК

Касацыйная калегія Вышэйшага гаспадарчага суду 1 чэрвеня пацьвердзіла рацыю РГА "Беларускі Хэльсынскі камітэт" у канфлікце з падатковай службай. ВГС адхіліў касацыйную скаргу інспэкцыі Маскоўскага раёну сталіцы Міністэрства па падатках і зборах, пакінуўшы ў сіле рашэньне гаспадарчага суду Менску, які пацьвердзіў законнасьць дзеяньняў БХК у рамках праграмы TACIS.

### Літоўскія візы патаньнеюць

У найбліжэйшы час будзе прынята рашэньне пра зьмяншэньне цэнаў на візы для грамадзянаў Беларусі і Літвы. Паводле беларускіх крыніц, аднаразовая складзе 5 эўра, паводле літоўскага МЗС — ня болей за 10 эўра.

### 300 тыс. за Мунка

Улады Осла абяцаюць узнагароджаньне $300 тыс. за зьвесткі аб скрадзеных у мінулым жніўні карцінаў Эдварда Мунка — "Крык" і "Мадонна". У заяве паліцыі гаворыцца пра тое, што грошы выплацяць пасьля таго, як палотны будуць знойдзеныя, а экспэрты пацьвердзяць іх сапраўднасьць.

**АГ, БелаПАН, afn.by, "Рэха Масквы".**

# Аварыйная зона

Чуткі пра выбух на ЧАЭС — трывожны сымптом для ўладаў. Яны сьведчаць пра недавер ня толькі да дзяржаўных СМІ, але і да самой дзяржавы.
Піша **Віталь Тарас**.




Касірка ў чыгуначнай касе, памыліўшыся пры падліку грошай, якія трэба заплаціць за білеты, апраўдваецца: «Прабачце, у мяне з раніцы з галавы не ідзе гэты Чарнобыль… Вы ж ведаеце пра выбух на АЭС, на чацьвёртым блёку?» — пытаецца яна ў пасажыркі.

Тая пачынае супакойваць касірку: вы, мабыць, зблыталі з аварыяй на электрападстанцыі ў Маскве. Чацьвёрты блёк даўно не працуе — там жа ж саркафаг! «Не! — стаіць на сваім касірка. — Пра аварыю ў Маскве ўвесь сьвет ведае. А выбух у Чарнобылі здарыўся на некалькі дзён раней, адтуль радыяцыя зноў дайшла да Беларусі. Пра гэта па радыё паведамлялі (мая суседка чула), але цяпер маўчаць».

Усе спробы давесьці, што ўзровень радыяцыі ў Менску ў апошнія дні нікольні не зьмяніўся, што вецер у тыя дні быў паўночна-заходні, таму ў любым выпадку радыяцыйны выкід да Беларусі не дайшоў бы, посьпеху ня маюць. Касірка недаверліва паціскае плячыма — ну, дай божа, каб так было, як вы кажаце…

Падобныя размовы можна было пачуць на мінулым тыдні ці не на кожным кроку. І ніякія разумныя доказы на людзей ня дзейнічалі. Па-першае, многія памятаюць, як было з тым Чарнобылем. Спачатку маўчаньне, потым — хлусьлівыя паведамленьні пра «блізкі да нормы» ўзровень радыяцыі. Спрактыкаваныя савецкія грамадзяне і раней не адчувалі вялікага даверу да афіцыйнай інфармацыі, а ў першыя дні пасьля Чарнобыльскай катастрофы чэрпалі яе выключна з замежных радыёгаласоў ды… пагалосак. Выявілася, што афіцыйным беларускім СМІ, якія хваляцца агромністымі, як на сёньняшні дзень, накладамі й шырынёй ахопу аўдыторыі, давяраюць, прынамсі, ня больш, чым колішнім газэце «Правда» і ЦТ. І нават заявы першай асобы ў дзяржаве аб тым, што чарнобыльская тэма даўно сталася другараднай, беларускіх грамадзян, відавочна, не пераконваюць.

## Усё гатова да катастрофы

Але справа ня толькі ў гэтым. Уразіла гатоўнасьць грамадзтва да катастрофы. Абывацель зь лёгкасьцю верыць у магчымасьць самага страшнага з таго, што толькі можа здарыцца (нічога страшнейшага за Чарнобыль сучаснае пакаленьне беларусаў ня зьведала). І гэтая вера жыве на тле штодзённай прапаганды, якая ўбівае ў галовы людзям, што яны жывуць у самай спакойнай, самай стабільнай, самай лепшай калі ня ў сьвеце, дык у Эўропе краіне. Краіне, дзе няма вайны, няма тэрарызму, дзе няма й ня можа быць ня толькі тэхнагенных катастроф, але й прыродных катаклізмаў, бо кіраўніцтву дзяржавы падуладныя нават колькасьць ападкаў і тэмпэратура паветра.

Чуткі пра выбух на ЧАЭС — трывожны сымптом для ўладаў. Гэтыя чуткі сьведчаць пра недавер ня толькі да дзяржаўных СМІ, але і да самой дзяржавы. Кажучы словамі клясыка, «нядобра нешта ў Дацкім каралеўстве».

Некалі ўся краіна Саветаў жыла выключна чуткамі. Пра тое, што генсек хворы й хутка памрэ, пра эпідэмію яшчуру, пра павышэньне цэн, пра тое, што хутка ня будзе запалак, солі, масла і г.д. Часьцей за ўсё чуткі аказваліся значна бліжэйшымі да праўды, чымся паведамленьні дзяржкамстату або агенцтва ТАСС. І нават калі чуткі ня спраўджваліся, ім на зьмену прыходзілі іншыя — больш трывожныя. І яны ўрэшце станавіліся рэальнасьцю. Бо галоўнае ў пагалосках — ня тое, ці заснаваныя яны на рэальных фактах (часьцей за ўсё, вядома, яны маюць толькі ўскоснае дачыненьне да рэчаіснасьці), а скіраванасьць гэтых пагалосак. Яны амаль ніколі не бываюць аптымістычнымі. Бо, хутчэй за ўсё, за чуткамі ды пагалоскамі хаваюцца трывожныя чаканьні ці здагадкі.



Калі ніводная з рэальных праблем не абмяркоўваецца адкрыта ў СМІ, чуткі пануюць у якасьці галоўнага сродку масавай інфармацыі.

## Сьвет бяз правілаў

Ад пазбаўленых інфармацыі людзей цяжка чакаць нейкіх лягічных высноў ці адэкватных паводзінаў. Яны жывуць у як бы падвойным сьвеце — сьвеце афіцыйнай прапаганды, дзякуючы якой усе ведаюць, штó ўлады хочуць чуць ад грамадзян пра сябе, і сьвеце, аб якім вядома толькі тое, што ў ім усё няпэўна. А больш пра яго невядома нічога. Лёгіка разьвіцьця падзей падаецца незразумелай і адвольнай. Бо ўчора было так, а сёньня загадам начальства ўсё стала іначай. Таму паведамленьне непісьменнай суседкі ўспрымаецца ледзь не як ісьціна ў апошняй інстанцыі. І чым болей неверагоднае гэтае паведамленьне, тым больш вартае даверу. Цікава, што маладое пакаленьне ня менш падуладнае эпідэміі чутак, чым старэйшае. Дастаткова ўспомніць пагалоску пра маньяка, які нібыта ўшпільвае няшчасным людзям нейкую заразу шпрыцам проста на дыскатэках…

Сьвет успрымаецца як чарга ніяк не зьвязаных паміж сабой атракцыёнаў, як гульня бяз правілаў. Учора заражаная радыяцыяй зона лічылася небясьпечнай для жыцьця, сёньня, паводле ўказу, яна абвяшчаецца чыстай, а вада, прадукты харчаваньня, грыбы, ягады, рыба й дзічына — прыдатнымі для ўжытку. Учора дэмакратыя палягала ў праве выбару найбольш годнага кандыдата ў кіраўнікі, сёньня яна азначае права паўтараць, што яму няма замены.

Вядома, чуткі адпавядаюць чалавечай прыродзе. Няма такога грамадзтва або карпарацыі, дзе б не цыркулявалі, напрыклад, пагалоскі пра начальства — хто пойдзе на павышэньне, каго звольняць, хто каму прыйдзе на зьмену. Ці — яшчэ цікавей — хто з кім сьпіць.

Але ж грамадзтва, якое пэрыядычна рыхтуецца да чарговага апакаліпсісу — выбуху, патопу, эпідэміі, вайны ці яшчэ якой трасцы, — трэба прызнаць не зусім нармальным псыхічна. І гаворка тут не ідзе пра рэальныя небясьпекі — СНІД, тэрарызм, тэхнагенныя ці прыродныя катастрофы. Грамадзтва, ведаючы пра пагрозы, імкнецца даведацца аб іх як мага больш і распаўсюдзіць гэтыя веды ў максымальнай ступені. Гэта дапамагае калі ня вырашыць саму праблему, дык зьменшыць патэнцыйную колькасьць ахвяраў. Так элемэнтарныя веды ў галіне асабістай бясьпекі ўратавалі не адно жыцьцё падчас землятрусу ў Паўднёвай Азіі. А ўсялякага роду прадказальнікі, ненармальныя прапаведнікі, варажбіткі і да т.п., якіх хапае паўсюль, у тым ліку й на Захадзе, успрымаюцца разам зь іх прадказаньнямі й казанямі як нешта маргінальнае, нявартае сур'ёзнай увагі.

## Асноўны інстынкт

У сытуацыі, калі ніводная з рэальных праблем — тычыцца яна будучыні нацыі, грамадзкага ды сацыяльна-эканамічнага ладу ці міжнародных стасункаў — не абмяркоўваецца адкрыта ў СМІ, а замест гэтага прапануюцца псэўдадыскусіі на тэму «асобныя недахопы», менавіта чуткі панавалі й будуць панаваць у якасьці галоўнага сродку масавай інфармацыі. Закладнікамі гэтай сытуацыі, як ні парадаксальна, становяцца і ўлады, якія прыдумалі забарону на нэгатыўную інфармцыю, каб абараніць сябе ад крытыкі. Бо штó б улады ні рабілі, у тым ліку нават і пазытыўнага, адказ заўсёды будзе непрадказальны, як у сытуацыі з «чорнай скрыняй». Сытуацыю будуць ацэньваць не на аснове аб'ектыўнай інфармацыі, а на аснове стэрэатыпаў, сфармаваных у масах. Улада разьлічвае, канечне, што гэтыя стэрэатыпы працуюць на яе карысьць. Але ж яна й сама пазбаўленая рознабаковай інфармацыі, а значыць, дзейнічае, фактычна, як абывацель, які рэагуе не на сапраўдны стан рэчаў, а на тое, што кажуць іншыя. Гэта значыць, яна пачынае сама верыць у тыя стэрэатыпы, якія стварыла, і пры гэтым дзейнічаць навобмацак, нібы ў цемры. Грамадзтва ў цэлым, ад нізу да верху, ператвараецца ў нейкую цёмную, косную масу, якая падпарадкоўваецца ня ведам, не цывілізаваным правілам, а інстынктам.

## Няведаньне як хвароба

Здавалася б, у эпоху лічбавай сувязі, нанатэхналёгій і Інтэрнэту такі спосаб праўленьня, які лічыцца дыктатурай, а насамрэч зьяўляецца ахлякратыяй (уладай натоўпу), немагчымы. Аднак апошнія гадоў дзесяць прадэманстравалі, што начальства й натоўп могуць утвараць свайго роду сымбіёз, самадастатковы арганізм, небясьпечны для будучыні нацыі. Ці ёсьць выйсьце з такога становішча? Думаецца, ёсьць. Некалі ў Эўропе ўспыхвалі бунты супраць прышчэпак падчас эпідэміі воспы. Ужо ў нашы дні грамадзтва не хацела нічога ведаць пра СНІД і асабліва пра хворых на яго. Але ж, як і трыста гадоў таму, спатрэбілася цярплівая тлумачальная праца лекараў, а галоўнае — сьвядомая наступальная асьветніцкая палітыка, скіраваная на ліквідацыю няведаньня. Няведаньне ў наш час — таксама свайго роду хвароба, якую трэба лячыць самымі радыкальнымі мэтадамі.

Змагацца, натуральна, трэба ня з чуткамі. Яны — усяго толькі сымптом хваробы. Змагацца трэба з апатыяй і нежаданьнем хворых ведаць аб тым, на што яны хварэюць і як трэба лячыцца.

# Паўзучая нерухомасьць

Працяг са старонкі 1.

Ёсьць, вядома, і кватэры пад 300 тыс. даляраў — скажам, можна хоць цяпер набыць дзьвюхузроўневую кватэру ў двухпавярховым доме за драўляным плотам на Бранявым завулку. Цана — 250 тыс. даляраў.

Найбольш дарагія кватэры ў цэнтры, добра каціруецца Зялёны Луг ды Ўручча. Заходняя частка гораду ў цэлым больш прыцягальная за індустрыялізаваны ўсход. Будаўніцтва кватэр вядзецца шалёнымі тэмпамі — сёлета маюць здаць да мільёна квадратных мэтраў жыльля, — але попыт задаволіць усё роўна не ўдаецца. Ахвярамі будаўнічага буму зробяцца ўласьнікі дамкоў у межах гораду. Неўзабаве пад знос пойдзе прыватны сэктар па вуліцах Багдановіча, Арлоўскай ды ўздоўж праспэкту Дзяржынскага.



**Аднапакаёвая кватэра ў панэльніку ў Малінаўцы па цягне 32 тыс.у.а.**

## Былая жылплошча Радзівілаў

Рост цэн на кватэры мае і нечаканыя вынікі. Гэтак той, хто можа сабе дазволіць набыць кватэру ў Менску, сутыкаецца са спакусай пашукаць жыльлё ў іншай краіне. Цэны на менскія мэтры імкліва набліжаюцца да цэнтральнаэўрапейскіх узораў.

Варшава. Аднапакаёвая кватэра на першым паверсе. Вуліца Заечая, практычна гістарычны цэнтар. Дом стары (1916 г.), але трывалы. 33 $м^2$. Якасны рамонт.



**Кошты на двухпакаёўкі ў паваенных дамках бліз Трактарнага заводу вагаюцца між 32 і 45 тыс. у.а.**

Набываць нерухомасьць у Чэхіі могуць толькі замежныя юрыдычныя асобы, не прыватнікі.

Цана — 61 тыс. даляраў. Прэстыжныя аднапакаёўкі ў Менску каштуюць пад 40 тыс. — і гэта ў новых камфортных дамах. Але калі мы зазірнём у паўднёвую частку польскай сталіцы, убачым іншую карціну. Двухпакаёвая кватэра на апошнім паверсе трохпавярховага блёчнага дому, 36 $м^2$, у адным з пакояў — шклопакеты, дывановае пакрыцьцё на падлозе. За ўсё гэта — 48 тыс. даляраў. За такі ж кошт прадаюцца і двухпакаеўкі ў Менску. Але ж параўнайце магчымасьці зарабляць у Варшаве з нашымі зарплатамі.

Кракаў — другі па велічыні рынак нерухомасьці ў Польшчы. Якасныя апартамэнты ў добрых раёнах тут каштуюць каля 1000 даляраў за $м^2$, а кватэры ў "панэляках" на ўскраінах можна адшукаць і за 300 даляраў за $м^2$.

## У горадзе Скарыны

У Празе два галоўныя тыпы кватэр — новыя на ўскрайках места і старыя ў цэнтры. Новыя кватэры — ня самае лепшае ўкладаньне грошай: навокал Прагі досыць вольнага месца, каб будаваць новыя жылыя шматпавярхоўкі, што можа зьбіць цэны. Але і ў старых раёнах ёсьць свая спэцыфіка. Многія наймальнікі кватэр плацяць арэндную плату ў адпаведнасьці зь дзяржаўнымі тарыфамі, якія не дазваляюць домаўладальнікам заломваць непамерныя цэны. Калі раптам дзяржава вырашыць адмяніць гэтую сыстэму, ёсьць шанец, што ўладальнікі дамоў папросту выселяць жыльцоў, якія плацяць замала, і тады на рынку зьявіцца шмат вольных кватэр у старых раёнах, і цэны пойдуць уніз. Ёсьць яшчэ адна праблема: каб набыць кватэру ў Празе, давядзецца стварыць фірму. Мець нерухомасьць у Чэхіі замежнікі могуць толькі ў выглядзе юрыдычных асоб.

Калі параўноўваць зь Менскам, дык і ў Празе можна адшукаць параўнальна недарагое жытло. Вось, напрыклад, аднапакаёўка ў дванаццаціпавярховым доме на вуліцы Штурава. Другі паверх, жылая плошча 20 $м^2$. Вядома, да цэнтру далекавата, але ж цана — 35 700 даляраў. Кватэра такога кшталту ў Менску будзе каштаваць тысяч 25, а з эўрарамонтам дык і на 30 пацягне.

## У крывіцкай Мэцы

У Вільні можна адшукаць двухпакаёўку за 30—35 тыс. даляраў. Той, каму нецікава жыць у спальным раёне, а хочацца быць бліжэй да цэнтру, можа набыць аднапакаёўку на Клайпэдзкай вуліцы. 30 квадратных мэтраў, камін плюс два бясплатныя месцы ў дворыку для паркоўкі. 52,5 тыс. эўра.

Кіеўскі рынак нерухомасьці віруе. Здавалася б, насуперак усякаму здароваму сэнсу, цэны на кіеўскія "хрушчоўкі" пачалі імкліва расьці. Як выяўляецца, укладаньне грошай у развалюхі — інвэстыцыя ў будучыню. Урад Цімашэнкі абяцае зьнесьці ўсе "хрушчобы", а іх жыхарам даць лепшае ды больш просторнае жытло. Вось і выходзіць, што ёсьць рэальная выгада набываць кватэру ў самых разбураных ды непрыдатных для жыцьця будынках — большыя шанцы на тое, што яго зьнясуць. Сярэдняя цана квадратнага мэтра жытла ў Кіеве — больш за 1000 даляраў. Зрэшты, у спальных раёнах няцяжка адшукаць аднапакаёвую кватэру цаной у 35 тыс. даляраў — не нашмат даражэй за Менск.



**Двухпакаёўка ў пяціпавярховым доме па вул.Харужай, што наКамароўцы, каштуе 42 тыс. у.а.**



**У хрушчоўцы ў Заводзкім раёне яшчэ можна знайсьці 2-пакаёвую кватэру за 27 тыс.у.а.**

## СЬЦІСЛА

### Нацыяналізацыя цэмэнтавага заводу

Доля дзяржавы ў статутным фондзе ААТ "Краснасельскбудматэрыялы" будзе павышаная да 70%. Гэтае прадпрыемства — найбуйнейшы ў краіне вытворца цэмэнту. Але нават рост вытворчасьці ў сярэднім на 10—13% у параўнаньні зь мінулым годам не дазволіў заводу разьлічыцца з даўгамі. Запазычанасьць па плацяжах у бюджэт "Краснасельск-будматэрыялы" пакрые 476 267 633 сваімі акцыямі на агульную суму больш за 13,8 млрд рублёў.

### Крызіс «Гарызонту»

Флягман беларускай прамысловасьці, менскі завод "Гарызонт" за апошнія два месяцы рэзка зьменшыў аб'ёмы продажаў. Тэлевізары, якія сабраныя на галоўнай пляцоўцы на вул. Чырвонай, ужо няма куды ставіць. У Расею, галоўны рынак збыту прадукцыі, з пачатку траўня пайшло толькі некалькі фур. Аванс работнікам "Гарызонту" не выдаецца, а заробак апошнія два месяцы яны атрымліваюць са спазьненьнем.

### Лом на экспарт

Шэраг буйных прадпрыемстваў атрымалі права экспартаваць лом і адкіды чорных і каляровых мэталаў без пасрэдніка. Шчасьліўчыкамі сталі гандлёвы дом канцэрну "Белрэсурсы", МТЗ, МАЗ, БелАЗ і Менскі маторны завод. Грошы, атрыманыя ад продажу адкідаў, давядзецца накіраваць на набыцьцё новага абсталяваньня для мэталаапрацоўкі. Раней увесь экспарт зьдзяйсьняўся праз аднаго пасярэдніка — ТАА "Свкортранзыт", якое ўваходзіць у склад прадпрыемства "Беларускія другасныя рэсурсы".

### Печы на гарызонце

1 чэрвеня "Гарызонт" распачаў зборку мікрахвалевых печаў. Вытворчасьць разьмясьцілася на заводзе "Беліт" у Паставах. Калі прадпрыемства разгорнецца на поўную магутнасьць, у год будуць вырабляць паўмільёна печаў. Пра цану мікрахвалёвак пакуль нічога не вядома — на заводзе кажуць толькі, што яны складуць канкурэнцыю замежным аналягам.

### Кантрольныя налепкі

У хуткім часе ўсе CD ды пакункі з гарбатай павінны будуць мець адмысловую маркіроўку — налепкі, падобныя да тых, якія клеяць на бутэлькі зь півам. Такім чынам урад спрабуе змагацца зь ценявым імпартам ды павысіць прыток адлічэньняў ПДВ з тавараў, што трапляюць у краіну праз мяжу з Расеяй. Увядзеньне абавязковай маркіроўкі піва ды алівы кантрольнымі знакамі ўжо павысіла паступленьні акцызных збораў у 3—4 разы.

### Зноў зьніжэньне стаўкі

Чацьверты раз сёлета Нацбанк зьніжае стаўку рэфінансаваньня. З 1 чэрвеня яна складае 13% гадавых. Кіраўніцтва галоўнага банку краіны тлумачыць гэта запаволеньнем інфляцыі: сёлета за студзень—красавік цэны падняліся ў сярэднім на 3,2%, а летась за такі самы пэрыяд — на 6,3%.

### Беларускі флёт

Айчынны марскі флёт будзе прыпісаны да Клайпеды. Пра гэта гаварылі ў аўторак на прэс-канфэрэнцыі ў Менску намесьніка міністра транспарту і камунікацый Уладзімера Ўласеня. Па словах чыноўніка, Беларусь вяла перамовы з Украінай, Літвой, Польшчай. Выбралі Літву — Клайпедзкі порт бліжэй за іншыя ды не замярзае ўзімку. Цяпер застаецца прыдбаць як мінімум два марскія судны — адно грузазьмяшчальнасьцю 30 тон, другое — 3—6 тон. Кошт судна — $25—30 млн. Каралёў акіяну набудуць за кошт крэдытаў беларускіх банкаў.

**АФН, «Інтэрфакс», АК, «Белорусская деловая газета»**

### КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 2 чэрвеня:**
1 амэрыканскі даляр — 2 150 рублёў
1 эўра — 2 642,03 рубля.
1 латвійскі лат — 3 795,57.
1 літоўскі літ — 765,18.
1 польскі злоты — 636,45.
1 расейскі рубель — 76,00.
1 украінская грыўна — 424,27.

**Паводле Нацбанку**

# Дарагія госьці

У Марыны Багдановіч канфіскавалі маёмасьць — ад фэна да кампутара, які належаў яе дзесяцігадовай дачцэ. Тэлевізар ласкава пакінулі.

Судовы выканаўца шрайбае левай рукой акт канфіскацыі. Зьверху на яго паглядае з іконы Хрыстос, паказваючы на палаючае сэрца ў грудзёх. Горача. За вакном у «ПАЗіку» прэюць амапаўцы. Відаць, баяцца чарговага мітынгу: Марына Багдановіч атрымала штраф 200 базавых велічынь (каля 2,5 тыс. даляраў) за ўдзел у прадпрымальніцкай акцыі пратэсту ў Менску 1 сакавіка.

— Марына Мартаўна, можна шклянку прыбраць? — выгуквае, не падымаючы галавы, выканаўца.

— Вам папіць прынесьці? — пытаецца сп.Багдановіч, прымаючы са стала кубак зь недапітым сокам.

— Не-не, ня трэба! — разам адказваюць выканаўца ды прадстаўнік фірмы ААТ «АСіТ», які сумуе побач на зэдліку. «АСіТ» спэцыялізуецца на вывазе, ацэнцы ды продажы канфіскаванай маёмасьці.

— Мая прысутнасьць абавязковая? — пытаецца гаспадыня кватэры, прапускаючы ў дзьверы грузчыкаў фірмы.

— Вядома, — адказвае выканаўца. — Каб вы потым не сказалі, што мы ў вас усё забралі. У сэнсе, што забралі больш, чым трэба. І ня пстрыкайце за сьпінай! — незадаволена кідае ён праз плячо фотарэпартэрам.

— Дык вас у твар здымаць? — гучыць у адказ.

Грузчыкі пачынаюць вызваляць паліцу ад кнігаў. Марына перадае іх дачцэ Марусі, якая кладзе кнігі ў стосы на падлогу ў іншым пакоі. На адной з паліцаў — некалькі дзясяткаў асобнікаў «Выпадковага прэзыдэнта». Гаспадыня прэзэнтуе іх усім прысутным, але афіцыйныя асобы ад падарункаў адмаўляюцца і нэрвова просяць яе прыбраць кнігу са стала, на якім ляжыць пратакол.

— Ну што тут такая цішыня, як на хаўтурах? — весяліць прысутных Марына. Радаснага, вядома, мала, але ў гаспадыні неяк атрымліваецца стварыць лёгкую атмасфэру, нібыта тое, што адбываецца — не канфіскацыя, а пераезд. Пілікае тэлефон.

— Ды не, госьці прыйшлі, усе сядзяць, і Юлька, і Наташа, і хлопчыкі нашыя ўсе, — кажа ў слухаўку сп.Багдановіч. — Так, яны таксама тут. Не, і яны добрыя людзі. Доўга казаць ня буду, тэлефон таксама канфіскуюць, зараз аддаваць трэба. Шампанскае? Не, ад шампанскага адмовіліся.

— Ці мо ўсё-такі шампанскага? — пытаецца Марына. — Прабачце, хлопцы, францускага няма, толькі савецкае.

Тыя не паддаюцца спакусе, і працягваюць рабіць сваю справу. Марына Багдановіч перадае судоваму выканаўцу мабільны тэлефон.

— Сім-карту я дастану, гэта мая ўласнасьць, а вось батарэйку вяртаю назад. І яшчэ зараднае прыстасаваньне.

— Прыемна з вамі размаўляць, — мякчэе судовы выканаўца. — Ня буду лезьці ў тэлефон, а то потым скажаце, што зламаў! — няўклюдна жартуе ён.

— Не скажу, — сур'ёзна адказвае Марына.

Маруся выцірае анучкай падлогу там, дзе стаяла паліца.

З прадметаў раскошы застаўся, бадай што, толькі тэлевізар — закон дазваляе сям'і пакінуць сабе адну тэлескрыню. Не пазбаўляць жа людзей крыніцы аб'ектыўнай інфармацыі! Такім чынам, у Марыны Багдановіч забралі мабільны тэлефон, электрафэн, чайнік, прас, тостэр, фотаапарат, відэамагнітафон (Марына адмыслова адшукала дрот ад яго ў іншым пакоі), магнітафон, маленькі музычны цэнтар (на ім Марына з дачкой звычайна перад сном уключалі музыку), Марусін кампутар з прынтэрам ды кніжныя паліцы, якія ледзьве вынесьлі ў дзьверы. Усё далёка ня новае. Брыльянтаў ды чамаданаў з грашыма ў небагата абстаўленай кватэры спадарыні Багдановіч ня выявілася.

— Прас — няхай, але самае кепскае тое, што фэн забіраюць — як цяпер валасы сушыць? — разводзіць рукамі Марына Багдановіч.

Візітэры разьвітваюцца з гаспадыняй кватэры не сябрамі і ня ворагамі. Адчуваецца няёмкасьць сытуацыі.

— Я мяркую аб людзях па галоўным — па іх прафэсіяналізьме, — супакойвае пачуцьці канфіскатараў Марына. «Госьці» сыходзяць.

— Ну чаго ты? Нічога страшнага няма, — выцірае Марына Багдановіч сьлязінкі з вачэй дачкі, прытуляючы яе да грудзей.

**Алесь Кудрыцкі**



Юлія Дарашкевіч

### Выкупіце рэчы Марыны

Рэчы Марыны Багдановіч будуць выстаўленыя на продаж у краме канфіскату на вул.Купрыянава, 4. Іх можна выкупіць і вярнуць гаспадыні. Тэлефон сядзібы Аб'яднанай грамадзянскай партыі 283-16-41.

## СЬЦІСЛА

Аршанскі суд 23 траўня прызнаў, што адміністрацыя УП «Лёс» ня выканала абавязкаў па кантракце, але пазоў работнікаў да прадпрыемства не задаволіў. **Рыгор Максіменка**, **Вадзім Дзюдзякоў** і **Міхаіл Воранаў** патрабавалі разарваць кантракт і выплаціць грашовую кампэнсацыю на падставе таго, што адміністрацыя не выконвае абавязкаў: не выплочвае заробкі своечасова. Рабочыя будуць абскарджваць вырак у вышэйшай інстанцыі.

24 траўня ў Магілеве аштрафавалі актывістаў незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» **Андрэя Разумкова** (20 базавых велічыняў, ці 510 тыс. руб.) і **Яўгена Суворава** (25 б.в, 637 500). Іх затрымалі падчас пікету, прысьвечанага шостым угодкам зьнікненьня Юр'я Захаранкі, а потым яшчэ раз за распаўсюд незалежнай газэты «Выбар».

**Мікола Статкевіч** 24 траўня абвясьціў галадоўку. 26 траўня суд адхіліў хадайніцтва **Паўла Севярынца** пра выклік у якасьці сьведкаў былога старшыні КДБ Леаніда Ерына, старшыні Цэнтравыбаркаму Лідзіі Ярмошынай і міністра ўнутраных справаў Уладзімера Навумава. На думку суду, гэтыя людзі нічога ня могуць паказаць па сутнасьці абвінавачаньня.

Раённыя адміністрацыі Горадні забавязалі прадпрыемствы й арганізацыі гораду да 15 чэрвеня здаць справаздачу пра вынікі падпіскі на «СБ — Беларусь сегодня» на другое паўгодзьдзе. Апрача таго, гарадзкія ўлады рэкамэндуюць выданьні «Звязда», «Рэспубліка», «Белорусская нива», «Семь дней», «Знамя юности», «Гродненская правда», «Беларуская думка».

25 траўня **ўдзельнікі галадоўкі ў Жодзіне** накіравалі звароты ўладзе і ўстановам адукацыі з патрабаваньнем адмяніць рашэньні аб выгнаньні навучэнцаў з палітычных прычынаў. 27 траўня да галадоўнікаў далучыліся 16-гадовы **Павал Каранюхін**, навучэнец Плешчаніцкай вучэльні алімпійскага рэзэрву, адлічаны за ўдзел у сёлетняй акцыі 26 красавіка, і маладафронтавец з Баранавічаў **Сяржук Марчык**. 30 траўня да іх далучыліся актывісты незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт» **Ігар Шчакарэвіч**, **Валер Мацкевіч**, **Артур Фінькевіч**, **Зьміцер Дашкевіч** і зубровец **Міхась Кандрашоў**.

Мінюст 25 траўня настойліва запатрабаваў ад **Саюзу палякаў Беларусі** (СПБ) правесьці новы зьезд: чыноўнікі па-ранейшаму не прызнаюць легітымнасьці VI зьезду. Пачынаючы з 25 траўня СПБ цягам некалькіх дзён ня здолеў надрукаваць чарговы нумар штотыднёвіку **«Głos znad Niemna»** з інтэрвію з кіраўнічкай арганізацыі Анжалікай Борыс: кіраўніцтва гарадзенскай друкарні спасылалася на нейкую запазычанасьць, але не магло патлумачыць, адкуль яна ўзялася. Кіраўніцтва арганізацыі 30 траўня зьвярнулася ў КДБ і МУС з просьбай спыніць рэпрэсіі супраць актывістаў СПБ. У лісьце згадваецца, што лідэрку Берасьцейскай абласной філіі аб'яднаньня **Аліну Ярашэвіч** 11 і 24 красавіка дапытвалі супрацоўнікі КДБ, у тым ліку і ўначы.

**ГА «Аслона»** з Ваўкавыску атрымала 26 траўня папярэджаньне ад Гарадзенскай абласной управы Мінюсту. Падстава — абвестка ў недзяржаўнай «Местной газете» пра дзейнасьць грамадзкай прыёмнай: чыноўнікі палічылі, што дзейнасьць не стасуецца зь місіяй арганізацыі.

У Дубровенскім раёне, на беларуска-расейскай мяжы 26 траўня міліцыянты затрымалі наклады газэтаў **«День»**, **«Салідарнасць»**, **«Товарищ»** і **«Белорусской деловой газеты»**, якія везьлі грузавіком з Расеі. Прэтэнзіі міліцыянты выказалі толькі да «Дня», які неўзабаве перад тым зьмяніў юрадрас. Рэдактар газэты **Мікола Маркевіч** 27 траўня падаў скаргу начальніку Дубровенскага РУУС на дзеяньні ягоных падначаленых: міліцыянты не паінфармавалі выдаўца пра свае дзеяньні й іх прычыны, забралі ня ўзор выданьня, а ўвесь наклад, прычым не аформілі дакумэнтаў належным чынам.

У судзе Цэнтральнага раёну Менску 27 траўня пачалі слухаць справу пра маёмасьць **Міхаіла Марыніча**. Сваякі спрабуюць цераз суд вярнуць частку маёмасьці, апісанай судовымі выканаўцамі, бо гэтая частка не належала асуджанаму: судовыя выканаўцы апісалі кватэры ягоных сыноў і былой жонкі. На працэсе быў абвешчаны перапынак да 2 чэрвеня: выявілася, што ў справе няма прадпісаньня, на падставе якога праводзіўся вопіс маёмасьці.

Дзьве раённыя структуры **ПБНФ** у Горадні ліквідаваныя 27 траўня рашэньнем Вярхоўнага суду. Падстава — разьмяшчэньне юрадрасоў у жылым фондзе.

Лепельскія ўлады 27 траўня паінфармавалі лідэра тамтэйшага прадпрымальніцкага руху **Алега Тычыну**, што ліквідуюць ягоны бізнэс: яго жонцы **Зінаідзе**, якая трымала дзьве крамы, адмовілі ў адводзе зямлі.

У пракуратуру Мастоў 27 траўня тэлефанаваньнем выклікалі грамадзкага актывіста й журналіста **Язэпа Палубятку**: памочнік пракурора цікавіўся яго ўдзелам у грамадзянскай ініцыятыве «Воля народу». Палубятка заявіў, што ўспрымае гэта як палітычны перасьлед, адмовіўся адказваць на пытаньні й запатрабаваў афіцыйнага выкліку.

Актывісту БСДП (НГ) **Ігару Маслоўскаму** пракуратура Берасьцейскай вобласьці вынесла 30 траўня афіцыйнае папярэджаньне за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі: у газэце «Народная Воля» ён быў указаны як адзін з каардынатараў «Волі народу».

**Гарадзенская абласная філія БСДГ** атрымала 30 траўня ліст ад управы юстыцыі аблвыканкаму з патрабаваньнем да 1 чэрвеня прайсьці перарэгістрацыю й перавесьці юрадрас з жылога фонду.

Міністар юстыцыі Віктар Галаванаў заявіў, што з чэрвеня рэгіянальныя ўправы юстыцыі здымаюць з уліку структуры **палітычных партыяў** і **грамадзкіх арганізацыяў**, адрасы якіх не зарэгістраваныя ў нежылым фондзе. Вынікі перарэгістрацыі будуць падведзеныя да 6 чэрвеня.

30 траўня **студэнты факультэту журналістыкі БДУ** пачалі збор подпісаў з патрабаваньнем да дэкана спыніць практыку адлічэньня й перасьледу за грамадзкую актыўнасьць і прафэсійную дзейнасьць. Яны таксама патрабуюць аднавіць студэнтку-завочніцу III курсу **Вольгу Класкоўскую**, адлічаную на пачатку траўня з афіцыйнай фармулёўкай за «акадэмічную непасьпяховасьць». У заяве гаворыцца, што праўдзівай падставай адлічэньня была праца Класкоўскай у «Народнай Волі» ды згадка ейнага імя ў адкрытым лісьце арганізацыі Article XIX да А.Лукашэнкі зь пералікам парушэньняў правоў журналістаў.

На праспэкце Машэрава ў Менску 30 траўня быў затрыманы з партрэтам Машэрава праваабаронца **Валер Шчукін**: яго зьвінавацілі ў парушэньні грамадзкага парадку. Суд над ім з 31 траўня перанесены на 3 чэрвеня, бо Шчукін запатрабаваў адваката.

**АШ**

# Швэды абяцаюць вярнуцца на дракарах

25—27 траўня ў Полацкім унівэрсытэце прайшоў міжнародны сэмінар «Панарама Дзьвіна/Даўгава» з удзелам прадстаўнікоў Швэцыі, Латвіі, Польшчы і Францыі.

Адзін з ініцыятараў правядзеньня форуму, прэзыдэнт швэдзкага Інстытуту культурнага турызму Арнэ Элефорс, наступным чынам растлумачыў яго мэту: рэгіён беларуска-латыскага Падзьвіньня — пэрспэктыўная зона міжнароднага супрацоўніцтва ў сфэры эканомікі, навукі, культуры, экалёгіі і турызму. Таму ўдзельнікі сэмінару павінны выпрацаваць канкрэтныя пляны і стратэгію паўставаньня Дзьвінскага эўрарэгіёну. Імкненьне падмацавалі дамовай аб намерах. Свае подпісы пад дакумэнтам паставілі намесьнік старшыні Віцебскага аблвыканкаму Ўладзімер Навацкі, губэрнатар швэдзкага Готлянду Марыяна Самуэльсан і выканаўчы дырэктар Даўгаўпілскае рэгіянальнае рады Віталійс Айзбальтс.

## Вітаем вас у калысцы беларускай дзяржаўнасьці

На адкрыцьці сэмінару ў прамовах мясцовыя ўлады казалі пра даўнія традыцыі швэдзка-беларускіх стасункаў, пачынаючы ад часоў Полацкага княства. Прадстаўнік аблвыканкаму У.Навацкі сказаў, што «Полацкае княства вядома сваёй незалежнасьцю і самабытнасьцю». Калі гэтыя словы перакласьці з чыноўнічай мовы на больш простую, дык выйдзе наступнае: Полацкае княства было першай беларускай дзяржавай, якая істотна адрозьнівалася ад тагачасных іншых суседніх краін, у тым ліку і ўсходнеславянскіх. Прынамсі, у гэтым пытаньні пазыцыя прадстаўнікоў сёньняшняй улады і апазыцыі цалкам супадаюць.

## У Полацак на дракары

На востраве Готлянд у Балтыйскім моры дасьледчыкі знайшлі найбольш, у параўнаньні зь іншымі рэгіёнамі Швэцыі, археалягічных помнікаў і артэфактаў часоў вікінгаў. Кіраўніцтва выспы выкарыстала гэта напоўніцу — выспа ператварылася ў турыстычную Мэку. 2005 год тут названы годам вікінгаў. Для турыстаў інтэнсіўна адбудоўваюцца паселішчы, растуць гатэлі. Турыстычныя маршруты пракладаюцца ва ўсе кірункі сьвету — куды толькі трапілі вараскія дракары, нават на канадзкі Ньюфаўндлэнд. Для цікаўных ладзяцца турыстычныя туры па месцах археалягічных раскопак.

Губэрнатар востраву Марыяна Самуэльсан, выступаючы на сэмінары, сказала, што як толькі пачула, што плянуецца візыт у Полацак, дык адразу ў яе нарадзіўся плян вандроўкі ў старажытную сталіцу крывічоў на вараскім караблі. Пані Самуэльсан упэўнена, што яе мара спраўдзіцца.

## Карлсан нам дапаможа

Беларускія выступоўцы апавядалі пра гісторыю стасункаў Полацкага княства са Скандынавіяй, зазначаючы, што стасункі былі інтэнсіўнымі і працяглымі, а таксама што кантакты са скандынавамі плённа адбіліся на жыцьці Падзьвінскага краю.

Госьці дзяліліся вопытам у галіне культурнага турызму. Арнэ Элефорс тлумачыў: спачатку кліента трэба ўразіць, а затым выклікаць цікавасьць. Як прыклад ён прапанаваў наступны варыянт выкліканьня ў швэда цікавасьці да радзімы Марка Шагала. Аказваецца, мастачка, што ілюстравала ў Швэцыі казкі пра Карлсана, натхнялася карцінамі Шагала. Таму ў яе ілюстрацыях багата запазычаньняў і матываў ад сусьветна вядомага майстра. Чаму б ня зьезьдзіць у Віцебск і на свае вочы не паглядзець шагалаўскія краявіды? Бо самі карціны Шагала трэба глядзець у Парыжы.

**Алесь Аркуш, Полацак**

СЬЦІСЛА

## Георгій стаў Францыскам

Перайменаваньне праспэктаў ды вуліцаў у Менску адгукнулася ў Воршы. Мясцовыя ўлады нарэшце вырашылі адну з тапанімічных праблем. У 1967 г. 2-я Лягерная вуліца (некалі тут месьціліся летнія вайсковыя лягеры) была перайменаваная ў вуліцу імя Георгія Скарыны. На пачатку 1990-х частку яе перайменавалі ў Ільлінскую вуліцу, бо вядзе да аднайменнай царквы. Таму на дамах гэтай вуліцы вісяць шыльды зь дзьвюма назвамі, у тым ліку на асобных дамах іх па дзьве. Але ж да гэтага часу беларускі першадрукар усё заставаўся Георгіем. Зараз жа ён стане Францыскам. Праўда, вуліца гэтая зусім не цэнтральная.




ІГАР ЮРКЕВІЧ

# Мілавідзкая бітва

У нядзелю 22 траўня ў вёсцы Мілавіды Баранавіцкага раёну адзначылі ўгодкі бітвы 1863 году. Прадстаўнікі палітычных партый, грамадзкіх аб'яднаньняў і проста патрыёты з Баранавіч нанялі аўтобус ды паехалі на месца бою.

142 гады таму на полі пад Мілавідамі адбыўся бой паўстанцаў Каліноўскага з расейскімі карнікамі. Паўстанцы стрымалі ўсе атакі.

У 70-х ХХ стагодзьдзя Мілавідзкая бітва азвалася. Пілуючы ў крывошынскім лесе дуб, сяляне знайшлі ў дупле чалавечыя парэшткі са стрэльбаю.

У 1913 г. расейскія улады паставілі наўзбоч дарогі, што падзяляе поле бітвы, праваслаўны мураваны крыж загінулым царскім жаўнерам. У 1930-х гадах польскі ўрад збудаваў насупраць крыжа каталіцкую каплічку. Беларусы ўсталявалі памятны камень непадалёк ад іх у 90-х гадах. У 2003-м 140-я ўгодкі бітвы згадаў у сваёй дырэктыве нават Берасьцейскі аблвыканкам. Сёлета ўсё адбывалася на грамадзкіх пачатках. Кіроўцы машын зьдзіўлена ўглядаліся на 50 чалавек пад нацыянальнымі сьцягамі, што ўскладалі кветкі да тых помнікаў. Потым ля каталіцкай капліцы ўніяцкі сьвятар адправіў набажэнства па загінулых.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## Новая газэта

У горадзе Барань (Аршаншчына) пачала выходзіць «Баранская газэта». Новае грамадзка-культурнае выданьне асьвятляе жыцьцё гораду-спадарожніка Воршы. Яно выдаецца пры падтрымцы віцебскага аддзяленьня ГА «Фонд імя Лява Сапегі» накладам 299 асобнікаў і распаўсюджваецца бясплатна. У адным зь першых нумароў згадваецца пра 100-гадовы юбілей масавых хваляваньняў рабочых мясцовага драцяна-цьвіковага заводу падчас Першай расейскай рэвалюцыі. Апошняя маніфэстацыя працоўных горадаўтваральнага прадпрыемства «Лёс», спадкаемцы таго заводу, за свае правы адбылася ў 2003 годзе. У наступныя гады дазволу на іх правядзеньне не было. Дарэчы, сярэдняя зарплата на прадпрыемстве складае 256 тыс.руб., рабочыя атрымліваюць ад 162 да 260 тыс. руб.

## Кедры замест елак

Праз абязводжваньне глебаў ды шкодніцкую дзейнасьць жукакараеда на Аршаншчыне масава высыхаюць ельнікі. На вялікіх плошчах хворыя дрэвы даводзіцца высякаць. На іх месцы штогод высаджваецца да мільёна маладых расьлін. Але каб яны сталі сапраўдным лесам, трэба чакаць 80—100 гадоў.

Пацяпленьне клімату прымушае мясцовых спэцыялістаў лесагадоўлі зьвяртаць увагу на дрэвы, якія растуць у Заходняй Эўропе, на Каўказе ды ў Крыме. Так, яшчэ ў 1978 г. у Копыскім лясьніцтве на шасьці гектарах быў закладзены дэндрарый, у якім сабраны дрэвы ды кустарнікі больш як 200 відаў. Так што ў хуткім часе замест звычайных сасьнякоў ды ельнікаў на Аршаншчыне паўстануць кедравыя ды туевыя гаі.

## Пра подзьвіг самаахвярнасьці

У аршанскім касьцёле Сьвятога Язэпа прайшла прэзэнтацыя кнігі полацкай пісьменьніцы Ірыны Жарнасек «Будзь воля Твая…». Выдадзены летась у менскім выдавецтве «Pro Christo» раман прысьвечаны росіцкай трагедыі (у лютым 1943 г. вёска Росіца, што на Дрысеншчыне, была спалена з жыхарамі). Разам зь вернікамі самаахвярную сьмерць прынялі й айцы марыяне Антоні Ляшчэвіч ды Юры Кашыра. Кніга выдадзена дзякуючы падтрымцы Ордэну марыянаў, рэзыдэнцыяй якіх цяпер ёсьць касьцёл Сьв.Язэпа ў Воршы. У найбліжэйшы час прэзэнтацыі адбудуцца ў іншых гарадах і мястэчках Віцебшчыны.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Завал з конкурсамі

Падрыхтоўка да сьвяткаваньня Дня Перамогі стала цягам навучальнага году выпрабаваньнем на вынослівасьць для пэдагогаў школ і пазашкольных установ. Зь лёгкай рукі арганізатараў выхаваньня школьнай моладзі абласнога маштабу па лініі цэнтраў пазашкольнай працы на школы нескончаным патокам плылі-спускаліся ўмовы шматлікіх конкурсаў ваеннапатрыятычнага напрамку, пералічыць якія на старонках газэты было б завялікай раскошай. Чытач можа ўявіць сабе стосы і горы розных альбомаў, расшывак, падшывак, файлаў, стэндаў — рэфэратаў, пісьмаў, праектаў, дасьледаваньняў, выбарак, картачак, перадруковак, справаздач, сачыненьняў і г.д, і да т.п., якіх нават нашы спрактыкаваныя штабісты розных экспэдыцый пры Верхнядзьвінскім раённым цэнтры пазашкольнай працы не пасьпяваюць разграбаць, сыстэматызаваць, ацэньваць, адбіраць найлепшае ды адсылаць у штабы вышэйшыя. Папяровая навала набыла маштабы, што сёлета празь няўпраўку ўпершыню за шмат гадоў былі адменены традыцыйныя жывыя мерапрыемствы — спаборніцтвы па арыентацыі як сяроду навучэнцаў, так і настаўніцкія. За безьлічу абавязковых мерапрыемстваў жывое жыцьцё ўсё часьцей адыходзіць на задні плян, будучы падменена нейкім віртуальным.

Здавалася б, кожны мае права выбіраць свае формы і мэтады калектыўнага выхаваньня дзяцей, вырашаць, у якім з конкурсаў прыняць ці не прыняць удзел. Але ж цяпер такі час, што спушчаная «зьверху» паперына адразу сама сабой набывае статус абавязковай. Паспрабуй якаянебудзь школа не падаць конкурсната матэрыялу — і ў адпаведнай графе ўліковай «прасьціны» «плюсік» замяніцца на «мінус», а адсюль — аўтаматычна мінус і ў прэміях і дабаўках, у рэйтынгах, ацэнках дзейнасьці і г.д.

Уявіце, што робіцца ў малых вясковых школках, дзе на кожнага вучня даводзіцца тузін конкурсаў толькі «ваеннага напрамку», ня кажучы ўжо пра экалёгію, «надзвычайку», рэгулёўшчыкаў і… і… і!..

Апэтыты ж тых, хто «спускае зьверху», растуць, рукапісныя матэрыялы ўжо грэбліва адпіхваюцца без разгляду: падавай на высокі суд толькі выкананае ў кампутарным варыянце — на дыскетах або лазэрных дысках!

Каб хаця неяк утрымацца ў шэрагах тых, хто ідзе ў нагу, школы ўсё часьцей міжволі шлюць насьпех зробленае, адчапное, падчас нявычытанае, бездапаможнае, а то і прымітыўнае, паказваючы наглядна, як добрая ідэя можа з-за перакосу-перабору прывесьці да вынікаў, адваротных чаканым.

— Божа! Калі ўжо гэтая вайна скончыцца! — гэты стогн гучыць ужо шматгалосым хорам з вуснаў пэдагогаў-арганізатараў, якім лёс наканаваў стаяць на перадавой бюракратычна-ідэалягічнага фронту ў змаганьні са здаровым сэнсам.

**Штабіст, Верхнядзьвінск**

# Падпольная прэм’ера

Чуткі пра падпольную прэм’еру Купалаўскага тэатру разьляцеліся імгненна. Усе ведалі, што рэжысэр Уладзімер Шчэрбань (у рэпэртуары тэатру ягоныя п’есы «Налу», «Падступства і каханьне») падрыхтаваў нешта нечаканае. П’еса не падпала пад фармат ніводнага менскага тэатру. Толькі за дзень да прэм’еры ўдалося знайсьці пляцоўку — у кавярні «Графіці». Ля барнай стойкі, у цыгарэтным дыме — прэм’ера.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Не зважаючы на «падпольнасьць» імпрэзы, у невялічкую залю набілася багата народу. На самых выгадных месцах разьмясьціўся тэатральны бамонд — Барыс Луцэнка, Андрэй Курэйчык, кінарэжысэр Уладзімер Арлоў. Астатнія стаялі — хто з куфлем піва, хто са шклянкай соку, хто зь відэакамэрай.

Шчэрбань выходзіць на імправізаваную сцэну і рыхтуе гледачоў да дзеі. Ён ужо мае вопыт «паўлегальных» пастановак — летась на «канспіратыўнай» сцэне адбылася прэм’ера п’есы «Скандальныя паляроідныя здымкі». Цяпер рэжысэр Купалаўскага тэатру прэзэнтуе п’есу пад назвай «Псыхоз 4.48» паводле твору Сары Кэйн. У гэты ж час узад-уперад па ўсім «пэрымэтры» сцэны ходзяць акторкі Купалаўскага тэатру Яня Русакевіч і Вольга Шанцына. Нехта побач камэнтуе іх зьяўленьне з абазнаным выглядам: «Выбралі самых прыгожых «купалаўскіх» дзяўчат». Потым распачынаецца 80-хвілінная дзея.

У самім творы Кэйн аповед вядзецца ад адной асобы — звар’-яцелы самазабойца развавае ўслых перад тым, як зрабіць сабе сьмерць. Шчэрбань расклаў маналёг на дзьве асобы, у выніку чаго дзея атрымался больш дынамічнай. Акторкі крычаць несваімі галасамі, рыкаюць, хрыпяць, коўзаюцца па падлозе, брыдкасловяць (часам, праўда, няўпэўнена). Маналёг адной пра тое, што гэта яна «душыла габрэяў у газавых камэрах, забівала курдаў і бамбіла арабаў, гвалціла маленькіх дзяцей», падхопліває другая: «Хрыстос мёртвы, а манахі ў экстазе…» Пасьля адна проста разяўляе рот, а другая прамаўляе. Блізіцца 4.48 — дакладны час самазабойства. Па камандзе рэжысэра сьвятло гасьне: «Я паміраю замест таго, каму ўсё роўна, за таго, хто ня ведае…» Акторкі здымаюць зь сябе адзеньне і сыходзяць…

Тэатральныя крытыкі ў захапленьні. У кулюарах вядуцца размовы пра тое, што гульня Яні й Вольгі — звышвыдатная. Барысу Луцэнку не спадабаліся, праўда, частыя зрывы на крык. Але ўсе спэцыялісты прызналі п’есу падзеяй у тэатральным жыцьці. Рэжысэру пакуль давядзецца задаволіцца толькі маральнымі дывідэндамі і марыць пра той час, калі ў беларускім мастацтве зьявіцца прастора для сьмелых экспэрымэнтаў. Больш шырокая, чым пляцоўка клюбу-кавярні.

**Сяргей Будкін**

# Копія Сілівановіча

18 траўня ў Вялейцы **Эдуард Мацюшонак** прэзэнтаваў копію карціны «Салдат і хлопчык» **Мікадзіма Сілівановіча.**

Ураджэнец Глыбокага Эдуард Мацюшонак жыве ў павятовым цэнтры з 1984 году. 20 год, праведзеныя ў Вялейцы, і паспрыялі напісаньню копіі. «За такі час больш пачынаеш разумець, што для цябе значаць карані, на якіх трымаецца культура. Я вельмі ганаруся, што жыву на зямлі, па якой хадзіў Сілівановіч», — кажа мастак.

Мацюшонак плянаваў прэзэнтаваць свайго «Салдата і хлопчыка» да 170-годзьдзя земляка, якое адзначалася ў сьнежні, аднак з розных прычын праца зацягнулася на паўгады. Мастак прызнае, што арыгінал, які захоўваецца ў Нацыянальным мастацкім музэі ў Менску, больш дасканалы па ўзроўні майстэрства. Але зрабіўшы копію, сп.Мацюшонак тым самым даў магчымасьць велейчукам бліжэй пазнаёміцца з творчасьцю выдатнага земляка. Палатно Мацюшонак падарыў мясцоваму краязнаўчаму музэю.

Сп.Эдуард спадзяецца таксама зрабіць копію славутага «Аўтапартрэту» Сілівановіча. Але карціна знаходзіцца ў Вільні, куды выехаць ня так проста. Перад вачыма вельмі важна мець арыгінал, і гэтага не заменіць ні адна рэпрадукцыя.

Эдуард Мацюшонак — адзін з тых творцаў, якіх цікавіць гісторыя. Ягоная сэрыя «Бацькаўшчына» малюе архітэктурныя помнікі, якіх больш ня ўбачыш. Яны зьнішчаныя альбо вайной, альбо саветамі.

Пры канцы сакавіка Э.Мацюшонак адкрываў пэрсанальную выставу «Дарога да Дому» ў родным Глыбокім. На малой радзіме карціны прэзэнтаваліся ўпершыню. Там сп.Мацюшонак пазнаёміўся з рэдактарам недзяржаўнай газэты «Вольнае Глыбокае» Ўладзімерам Скрабатуном. Сп.Скрабатун зьяўляецца аўтарам кнігі «Глыбокае ў паштоўках», па якой мастак змог на палотнах аднавіць некаторыя мясьціны гораду. І цяпер яны плянуюць распачаць працу над рэканструкцыяй на палатне пляцу ў Глыбокім з усімі старадаўнімі пабудовамі.



Эдуард Мацюшонак.

Сёньня мастак працуе над сэрыяй карцін, прысьвечаных падскарбію ВКЛ Антонію Тызенгаўзу. Сэрыя ўключыць як партрэты самога падскарбія, так і копіі карцінаў зь ягонай спадчыны. Карцінная галерэя Тызенгаўза налічвала пад 600 работ, сярод якіх палотны Рафаэля, Леанарда.

Жадаем мастаку ўсе задумы ўвасобіць у жыцьцё.

**Сяргей Макарэвіч, Вялейка**

# Афіша чэрвеня

Што варта пабачыць у Беларусі на пачатку лета? Канцэрты, выставы, прэм'еры чэрвеня.

## Рок-канцэрты

3 чэрвеня ў менскім клюбе «Стэп» выступаюць «Сініца», «Ірыс», «Белыя твары». 4 чэрвеня ў Гомелі — «Ляпіс Трубяцкой». У той жа дзень наша этна-трыё «Троіца» бярэ ўдзел у фэстывалі «Этнастыль» у Санкт-Пецярбургу. Дарэчы, Кірчук з камандай выступяць і ў Падмаскоўі на фэстывалі «Пустыя ўзгоркі-2005».

Альтэрнатывы на «20 см» у сталіцы дададуць берасьцейцы з «Дай дарогу». Іх выступ у «Рэактары» — 3 чэрвеня. А ўжо 9-га — фэстываль «Продвижение». Працяг леташняй міжнароднай «Трэцяй пяткі» таксама пераехаў у «Рэактар» разам з «Куклами», «Нестандартным варыянтам», «IQ-48», «Нагуалем» і шмат кім яшчэ. Пачатак а 17-й.

Пасьля адмены канцэрту «Крамбамбулі» кіраўнік «БМА-груп» Віталь Супрановіч лічыць за лепшае не загадваць наперад. На чэрвень плянуецца пакуль хіба выхад новага альбому «Партызонаў» і падрыхтоўка да «Басовішча».

## Поп: Навуменка і Беркут

Асноўныя менскія залі на першую палову чэрвеня пазаймаюць гастралёры з Расеі. 7-га ў Палацы Рэспублікі сьпявае Сукачоў. 8 і 9 там жа, але ў малой залі, тэатар «Ля Мікіцкай брамы» з Масквы. Першы дзень пяюць «Песьні нашага двара», у другі — граюць Міхоэлса.

Адзіныя, хто зможа пацясьніць заезджых, — Якаў Навуменка і вечарына «Бывай, школа» — 27 чэрвеня. У выпускным, што мае адбыцца 16-га там жа, бяруць удзел Вольга Плотнікава, Саша Нэма ды «Чук і Гек».

## Зь вечнасьцю — Быкаў. Эксклюзівы чэрвеня

У Менску завяршаецца рэтраспэкцыя фільмаў з удзелам італьянца Віторыё Гасмана «Анталёгія роляў. 1966—1986». У шэрагу абсалютных эксклюзіваў маеце магчымасьць прагледзець 2 чэрвеня апошнюю стужку форуму — «Мы так кахалі адно аднаго» (1974) рэжысэра Эторэ Скола. Пачатак у 18.30 у «Перамозе».

Яшчэ адна абсалютна эксклюзіўная рэч — выставы-прысьвячэньні Васілю Быкаву ў менскім Палацы мастацтваў на Казлова і ў Дольнай залі Чырвонага касьцёлу. Паказваюць графіку, жывапіс, скульптуру, прысьвечаную «залучанаму зь вечнасьцю».

У Менску «Вялікія бубны Токіё». 30 чэрвеня на «Дынама». Кошт — ад 6 да 16 тысяч.

## Тэатры: парад прэм'ераў

Менавіта такая выснова прыйшла па вывучэньні рэпэртуараў менскіх тэатраў. Ці наўмысна, ці незалежна адзін ад аднаго ў чэрвені практычна ўсе паказваюць свае прэм'еры сэзону. У Купалаўскім месяц пачынаецца і заканчваецца «Чычыкавым». Густоўны, вытрыманы і цалкам клясычны спэктакль. Ня менш уражвае і п'еса паводле Тома Стопарда «Ўваходзіць свабодны чалавек». Глядзіцца як гімн марнасьці. Таксама гледзьма ў Купалаўцаў «Эрыка XIV» і «Івону, прынцэсу Бургундзкую» паводле В.Гамбровіча. Прэм'еры каштуюць да 8 тыс.

Рэспубліканскі тэатар беларускай драматургіі дае «Парадоксы жарсьці» К.Фрэшэта (3-га, 13-га), «Валянціну» А.Вампілава (7-га), «Містэра Розыгрышу» С.Кандрашова (9-га, 20-га), Купрэйчыкавага «П'емонцкага зьвера» (21-га), макаёнкаўскі «Трыбунал» (22-га) і «Кабалу сьвятош» Мальера ў апрацоўцы М.Булгакава (23-га).


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У Опэры заканчваецца 72-гі сэзон. У якасьці прэзэнтаванай прэм'еры — «Кармэн» Бізэ. Спэктакль доўжыцца 3,5 гадзіны. Для густоўных аматараў. У Музтэатры — «Казка пра заснулую прыгажуню», 14 чэрвеня.

У Тэатры-студыі кінаактора пакуль ня вызначыліся з датай, але дакладна, што ў чэрвені глядач убачыць «Вельмі простую гісторыю» М.Ладо. У тэатры імя Горкага чакаюцца «Дзядзечкаў сон» паводле Дастаеўскага і «Выпадковы вальс». Таксама варта ацаніць «Опэру жабракоў» Бэртольда Брэхта і Курта Вайля. І Шадзько, і Чэкерэс — абодва выдатна рэжуць ролю Мэкі-Нажа. Цэны горкаўскага тэатру — 4—8 тыс. рублёў.

## Маманты і цырульнікі

3—4 чэрвеня ў Менску маюць адбыцца адразу дзьве падобныя падзеі. Адкрыты чэмпіянат Беларусі па цырульніцкім майстэрстве (Палац дзяцей і моладзі, Старавіленскі тракт). Больш адвязны — «Мамант-2005». Там можна ўбачыць і бодзі-арт, і татуіроўкі, і цырульніцтва.

## Беласточчына ў чэрвені

3 чэрвеня на польскім баку Белавежы адбудзецца акцыя школьных і моладзевых экалягічных арганізацый «Ратуйма Белавескую пушчу!» Імпрэзу ладзяць у межах «Году зубра», што праводзіцца сёлета ў Польшчы.

Ад 9 красавіка для польскіх і замежных турыстаў, што жадаюць пазнаёміцца з наскаю Белавежаю, зрабілі спрошчаны рэжым пераходу мяжы. Па-партызанску праз пушчу з замежным пашпартам і беларускай візай група ад 4 чалавек і болей патрапіць у беларускія Камянюкі. Цэны на жытло для гасьцей — ад 17 эўра з чалавека да 215 — за пражываньне групы ў Палацы графа Тышкевіча. Беларусы ж могуць павандраваць па польскай Амазонцы — Дворку над Лукамі. Кошты для нашых — ад 40 эўра за аднамесны нумар да 100 за «люкс» на чалавека.

3—5 чэрвеня ў Чаромсе — дзясятыя «Фальклёрныя сустрэчы». А 19-га ў Беластоку — чарговае, дваццатае па ліку, «Сьвята беларускай культуры». Арганізатар — Беларускае грамадзка-культурнае таварыства. А пачынаючы з 20 чэрвеня, ледзь не па ўсёй Беласточчыне будуць сьвяткаваць Купальле. У сталіцы Падляскага ваяводзтва пачнецца дзейства «Кірмашом на Яна», якое праз чатыры дні — 24—26 чэрвеня — пяройдзе ў традыцыйныя Дні Беластоку.

**Сяргей Дэнскі**

## ЭЎРАПЕЙСКАЯ АФІША

### Аўстрыя

**Сьвята Дунайскай выспы, 24—26 чэрвеня, Вена**
Выспа тая — між двума венскімі мастамі. Ехаць на сьвята трэба ў спартыўным абутку: танцаваць сучасныя танцы і традыцыйны вальс трэба будзе тры дні і дзьве ночы.
http://www.donauinselfest.at/

### Бэльгія

**Музычныя фэстывалі ў Брусэлі**
**5 чэрвеня** штогод 10 000 чалавек зьбіраюцца на сьвята Брусэльскага порту. Жывая музыка, купаньне, міні-круізы, далікатэсы нацыянальнай кухні. **17—20 чэрвеня** — штогадовае сьвята музыкі ў цэнтры Брусэлю. Поп, джаз, хіп-хоп і любімы бэльгійцамі францускі шансон.
http://www.conseildelamusique.be/
http://www.brucity.be/

### Вялікабрытанія

**Фэстываль жывой гісторыі, 12—13 чэрвеня, Оксбург-хол (Норфалк)**
Дакладнае ўзнаўленьне побыту, сытуацый, характараў, вопраткі эпохі Цюдораў.
http://www.nationaltrust.org.uk/scripts
nthandbook.dll?ACTION=PROPERTY&PropertyId=54

**Фэстываль ракі Мэрсі, 18—21 чэрвеня, Лівэрпуль**
Парады караблёў, лодачныя гонкі, кірмашы, матроскія песьні, паказальныя выступы марскіх пэхацінцаў ды бітва на галеонах і музычны фаервэрк.
http://www.liverpool08.com/root/Events/Sea_Liverpool

### Германія

**Фэстываль на Эльбе, чэрвень, Саксонія**
Тэма фэстывалю — творчасьць Фрыдрыха Шылера, сёлета спаўняецца 200 гадоў з дня ягонай сьмерці. http://www.elbhangfest.de/

**Кільскі тыдзень, 18—26 чэрвеня, Кіль**
Сьвята складаецца зь дзьвюх частак — спаборніцтваў яхтсмэнаў і вулічных гуляньняў. Кільская рэгата — неафіцыйны сусьветны чэмпіянат сярод аматараў і прафэсіяналаў парусната спорту. Завяршаецца тыдзень самым прыгожым у Эўропе фаервэркам.
http://www.kieler-woche.de/

### Гішпанія

**Сан-Хуан-фіеста, 23—24 чэрвеня, Мадрыд, Алікантэ, Сарагоса**
Гішпанскае Купальле. Усю ноч гараць вогнішчы на плошчах і вуліцах гарадоў, цераз агонь скачуць людзі, грыміць музыка, завяршаецца ноч фаервэркам. У Алікантэ 20 ліпеня адбудзецца парад волатаў, зробленых з пап'е-машэ, якія будуць спалены ў ноч з 23 на 24 чэрвеня.
http://www.alicanteturismo.com/

**«Маўры і хрысьціяне», 9—12 чэрвеня, Алікантэ**
На вуліцах гораду разыгрываецца відовішчная бітва 1276 году, у якой маўры былі разгромлены гішпанцамі. Паводле легенды, атрымаць перамогу дапамог сьвяты Юры, які зьявіўся воінам і натхніў іх на перамогу словамі «З намі Бог, з намі перамога!».Назіраць лепш за ўсё з бальконаў, арандаваць якія неабходна загадзя.
http://www.alicanteturismo.com/

### Грэцыя

**Фэстываль антычнай драмы, 24 чэрвеня — 27 жніўня, Эпідаўр**
Дзесяць спэктакляў, якія пачынаюцца на зьмярканьні і завяршаюцца бліжэй да поўначы, у тым ліку «Цар Эдып» і «Антыгона» Сафокла, «Вакханкі» Эўрыпіда ў выкананьні Нацыянальнага тэатру Грэцыі.
http://www.greekfestival.gr/

### Данія

**Фэстываль вікінгаў, 17 чэрвеня—3 ліпеня, Фрэдэрыксунд**
**Фэстываль і кірмаш вікінгаў, 21 чэрвеня — 3 ліпеня, Ольбарг**
http://www.aalborg-tourist.dk/ref.aspx?id=995

### Італія

**Фэстываль сьвятога Іаана, 24 чэрвеня, Флярэнцыя, Турын і інш. гарады**
Кожны год 24 чэрвеня Флярэнцыя надзявае карнавальныя касьцюмы. А яшчэ ў гэты дзень абавязкова будуць гуляць у «Calcio» на цэнтральнай плошчы. «Calcio» «(ад іт. calciare — біць нагой) лічыцца папярэднікам сучаснага футболу.
http://www.enit.it/

**Опэрны фэстываль, 17 чэрвеня — 31 жніўня, Вэрона**
Праводзіцца ў старадаўнім амфітэатры «Арэна дзі Вэрона» (пабудаваны ў І стагодзьдзі н.э.) на 16 000 гледачоў. Сёлета даюць «Багему» і «Турандот», «Набуку» і «Аіду». Адкрыецца фэстываль опэрай «Джаконда» Амількара Панк'елі.
http://www.arena.it/eng/arenaeng.

### Нідэрлянды

**Фэстываль паветраных зьмеяў, 11—12 чэрвеня, Гаага**
Каманды з 20 краін сьвету, некалькі соцень зьмеяў.
http://www.scheveningen.nl/

**Галяндзкі фэст, 1—26 чэрвеня, Амстэрдам**
Галяндзкі фэст вызначае новыя тэндэнцыі ў сучасным драматычным мастацтве, опэры, музыцы, танцы. Культывуюцца мяшаныя жанры і экспэрымэнты. Білеты на фэст — ад 50 да 70 эўра.
http://www.hollandfestival.nl/holnd_fstvl/

### Польшча

**Фэстываль Моцарта, 15 чэрвеня — 26 ліпеня, Варшава**
http://www.wok.pol.pl
oda_eng_program.htm

### Фінляндыя

**Карнавал самбы, 10—12 чэрвеня, Хэльсынкі**
http://www.samba.fi/

**Сьвята Юханус (Іванаў дзень), 24 чэрвеня, востраў Сэўрасаары**
Фінскае купальле. На востраве Сэўрасаары, у музэі драўлянага дойлідства пад адкрытым небам, распальваюць гіганцкае вогнішча, вакол якога будуць разгортвацца асноўныя падзеі. Кірмаш нацыянальных рамёстваў, фальклёрныя калектывы і пышныя цырымоніі вянчаньня. Лічыцца, што любая дзяўчына марыць выйсьці замуж менавіта ў гэты дзень і менавіта на востраве Сэўрасаары.
http://www.nba.fi
enseurasaari_openairmuseum

### Францыя

**Парыж: джазавы фэстываль, 4 чэрвеня — 24 ліпеня**
**Сьвята музыкі, 21 чэрвеня**
**Фаервэрк у дзень летняга сонцастаяньня, 24 чэрвеня**
http://www.ratp.fr/index_eng.htm

### Чэхія

**Фэстываль «Танець Прага», 2—30 чэрвеня, Прага**
Прэзэнтацыя сучаснага прафэсійнага танцу. Адкрываецца фэстываль выступленьнем Тэатру танцу з Тайваню.
http://www.tanecpha.cz/

### Швайцарыя

**Фэстываль швайцарскага піва, 2—5 чэрвеня, Лязана**
Дэгустацыі падтрымліваюцца разнастайнымі музычнымі праграмамі, выстаўкамі і кірмашамі.
http://www.fetedelabiere.ch/photos.html

### Швэцыя

**Нацыянальны дзень Швэцыі, 6 чэрвеня**
У Нацыянальны дзень швэды надзяваюць нацыянальныя касьцюмы, гатуюць нацыянальныя стравы і ўдзельнічаюць у агульных вулічных забавах. Галоўнае ж сьвята праходзіць у найстарэйшым горадзе Швэцыі — Сыгтуна, які называюць яшчэ «горадам у табакерцы» і які лічыцца першай сталіцай швэдзкай дзяржавы (заснаваны ў 980 годзе). Там адбудзецца невялікі парад, фальклёрнае сьвята, будуць працаваць кніжны рынак і кірмаш вырабаў ручной работы.

# Іслам Карымаў —

Іслам Карымаў — прадстаўнік адыходзячага пакаленьня савецкіх васалаў, якія неспадзявана для сябе, нярэдка нават насуперак уласнай волі, атрымалі свабоду. Хоць Карымаў — адзін з самых даўніх постсавецкіх правадыроў, ён паранейшаму застаецца самым таямнічым зь іх. Даўным-даўно, калі Ўзбэкістан толькі зрабіўся незалежнай дзяржавай, у тамтэйшым парлямэнце яшчэ знаходзіліся дэпутаты, якія асьмельваліся кідаць прэзыдэнту Карымаву ў твар абвінавачаньні ў тыраніі. «Я не адчуваю сябе дыктатарам, але калі дысцыпліна і парадак для вас — дыктатура, дык можаце называць мяне так, — сказаў падчас адной з такіх дыскусій прэзыдэнт. — Дэмакратыя — гэта ня мітынгі, а калі людзі ведаюць, што ім можна, а чаго не. Я без ваганьняў ахвярую жыцьцямі ста, калі гэта забясьпечыць мір і бясьпеку мільёнам». Тры тыдні таму салдаты Карымава расстралялі апазыцыйны мітынг у Андыжане, забіўшы амаль тысячу дэманстрантаў. Піша **Войцех Ягельскі**.



## З заводу на савецкі Алімп

Хоць 67-гадовы Іслам Карымаў любіць хваліцца, што не скончаў савецкіх партшкол, ён клясычны прадстаўнік палітычнай эліты, што вырасла на руінах СССР. Выхаваная ў традыцыях фэадальнай залежнасьці, гэтая эліта скажона разумела сутнасьць свабоды і ўлады. Уладу яна звычайна трактавала як матэрыяльныя даброты, а свабоду — як магчымасьць неабмежавана імі карыстацца.

Перш чым стаць прэзыдэнтам незалежнай дзяржавы, Карымаў старанна прайшоў праз усе прыступкі па лесьвіцы імпэрскай улады. Праца на заводзе, вячэрняя адукацыя, павышэньне да інжынэра, кар'ера чыноўніка, пазьней — правінцыйнага партыйнага дзеяча, павышэньне да міністра фінансаў рэспублікі, старшыні дзяржпляну і ўрэшце першага сакратара кампартыі.

На палітычны Алімп яго вынесла гарбачоўская перабудова.

Ва Ўзбэкістане, ператорваным камісарамі і сакратарамі ў адну вялікую плянтацыю бавоўны, праўленьне Гарбачова да сёньня згадваюць зь нянавісьцю. Імпэрскія намесьнікі з Ташкенту заўсёды ашуквалі сваіх прынцыпалаў з Масквы, якія патрабавалі ўсё больш і больш бавоўны. Такім чынам яны ратавалі сялян ад катаржнай працы на плянтацыях, а пры нагодзе, складаючы справаздачы, набівалі кішэню крамлёўскімі рублямі. Гарбачоў, які не пераносіў Азіі, бачачы ў ёй асяродак кансэрватыму, пастанавіў узорна пакараць узбэкаў і напужаць усіх астатніх, каму недаспадобы былі яго прагрэсіўныя рэформы.

Насланыя Гарбачовым рэвізоры ўчынілі ў Ташкенце сапраўдны пагром. Два мясцовыя кіраўнікі былі расстраляныя, шмат хто трапіў у турму, рэшту разагналі на ўсе чатыры бакі. Шукаючы новага загадчыка ўзбэцкай бавоўнавай плянтацыі, Гарбачоў выбраў Карымава — маладога правінцыяла і аўтсайдэра, ня ўцягнутага ў клянавыя звады. Да таго ж эканаміста. Карымаў, аднак, ніколі не адчуваў сябе абавязаным Гарбачову. І здрадзіў яму пры першай зручнай нагодзе.

Паступова ён вяртаў ва ўладу чыноўнікаў, звольненых Гарбачовым за карупцыю і крадзяжы. Так ён заваяваў іх удзячнасьць і палітычную падтрымку, а непакорлівасьць Крамлю дадавала яму сымпатый з боку насельніцтва. Калі ў жніўні 1991 г. путчысты ў Крамлі зрабілі спробу зрынуць Гарбачова, Карымаў ня выступіў у яго абарону. Ён асьцярожна ўстрымаўся ад яўнай падтрымкі путчу, але не адмовіў сабе ў парадўнаньні Гарбачова і яго рэформаў з будаўніком, які пачынае ўзводзіць дом не з падмурку, а з даху.

Путч ня ўдаўся, і, ратуючыся ад гневу Гарбачова, Карымаў абвясьціў незалежнасьць Узбэкістану. Іншыя правінцыі імпэрыі ўжо даўно паабвяшчалі сябе незалежнымі дзяржавамі, а яшчэ праз некалькі месяцаў прэзыдэнты Расеі, Украіны і Беларусі афіцыйна распусьцілі Савецкі Саюз.

## З камуністаў у дэмакраты

Як прэзыдэнт незалежнай дзяржавы, Карымаў загадаў камуністычнай партыі перайменавацца ў народна-дэмакратычную, а сам распачаў бязьлітасную вайну супраць усіх, хто яму пагражаў, і нават тых, хто зь ім пагаджаўся.

У студзені 1992 году ён упершыню загадаў страляць у студэнтаў, якія выйшлі на вуліцы Ташкенту, патрабуючы яго адстаўкі. Бязьлітасна разагнаў толькі-толькі ўзьніклыя дэмакратычныя партыі, а іх лідэраў пасадзіў ці выгнаў з краіны. Правёў таксама жорсткую чыстку ў сваім апараце, выдаліўшы адтуль усіх канкурэнтаў за ўладу.

«У моманты гістарычных пераломаў часам неабходны моцны лідэр і суровая ўлада. Часам аўтарытарнае праўленьне неабходнае», — казаў некалькі гадоў таму Карымаў, гаворачы пра Тамэрлана, зь якім ён любіць сябе параўноўваць. Тамэрлана і легенду аб ім Карымаў выбраў сымбалем незалежнай узбэцкай дзяржавы, а таксама сваім палітычным настаўнікам. Карымаў гаварыў, што падзяляе яго палітычны дэвіз: «Моцная ўлада — гэта моцная дзяржава». Прыгадваў, што толькі дзякуючы жорсткаму праўленьню Тамэрлана магла паўстаць вялікая дзяржава, якая пад кіраўніцтвам яго наступнікаў ператварылася ў слынны асяродак навукі і мастацтва.

Яго падданыя ахвотна яму верылі, тым больш што пад бокам былі Аўганістан і Таджыкістан, якія загразалі ў хаосе грамадзянскіх войнаў. Карымаў абяцаў, што ва Ўзбэкістане такога не дапусьціць. Пры ўмове, аднак, што ніхто ня будзе мяшацца ў яго палітыку.

«Мантэск'ё памыляўся, гаворачы, што ўлада дзяліцца натрае, — пераконваў старшыня Олій Мажлісу Эркін Халілаў. — Улада заўсёды толькі адна. Таму што можа быць толькі адзін правадыр».

# Французы пахавалі ЗШЭ

Французы аддалі перавагу "Эўропе Айчын" перад "Злучанымі Штатамі Эўропы". Гэта прыпыніць паглыбленьне эўраінтэграцыі. Але павысіць шанцы Беларусі далучыцца да эўрасупольнасьці без абмежаваньня сувэрэнітэту. Камэнтуе **Сяржук Вінаградаў**.

У гэтай краіне нешта ёсьць. Мілагучная мова, даўнія дэмакратычныя традыцыі, культура, прасякнутая любоўю да жыцьця… А яшчэ гэтая прывабная схільнасьць французаў да палітычнае шчырасьці і радыкальных закалотаў, здольных на дзесяцігодзьдзі вызначыць будучыню сьвету. Тое, што французскае "non" на рэфэрэндуме па новай эўраканстытуцыі азначае паварот у эўрапейскай палітыцы, сумневаў не выклікае. Ідэя стварэньня эўрафэдэрацыі пахаваная адной з краін-заснавальніц і лідэраў Эўразьвязу. Правал рэфэрэндуму ў любой іншай краіне ня быў бы такім бясспрэчным і лёсавызначальным. Але тое, што новы віток эўраінтэграцыі быў спынены менавіта ў Францыі, ставіць пад сумнеў ідэю стварэньня эўрафэдэрацыі. Нягледзячы на ўсе ўгаворваньні і застрашэньні з боку мясцовых і замежных палітыкаў, французы адхілілі ідэю эўразвышдзяржавы. За гэтую прынцыповасьць — дзякуй, Францыя.

## Эўропа — так, інтэграцыя — не

На французскім рэфэрэндуме перамагла Эўропа. Таму што паглыбленьне эўраінтэграцыі супярэчыць інтарэсам эўрапейцаў. З колішняе ідэі вольнага рынку тавараў і паслуг вырас бюракратычны монстар, галоўная мэта якога — апраўданьне ўласнага існаваньня.

Зірнем на стратэгічнае бачаньне Эўропы эўраінтэгратарамі. Адзін з галоўных іх праектаў — гарманізацыя падатковага заканадаўства, чытай — уніфікацыя падатковых ставак, што для Ўсходу азначае непазьбежнае павышэньне падаткаў, а для ўсяе Эўропы — яшчэ менш канкурэнцыі і вольнага рынку. За гэтым праектам хаваецца пратэкцыянісцкі плян старое Эўропы абмежаваць перавагу эканамічных мадэляў новых сяброў Эўразьвязу. Яшчэ адзін плян — стварэньне асобнага войска Эўразьвязу, якое азначала б для асобных краін альбо выхад з NATO, альбо паралельнае існаваньне дзьвюх незалежных вайсковых структур. Затое ў пляны эўраінтэгратараў не ўваходзіць скасаваньне агульнае сельскагаспадарчае палітыкі, якая штогод зьядае амаль палову эўрабюджэту (каля 40 млрд эўра!) ды змушае спажыўцоў ад Партугаліі да Эстоніі плаціць падвойныя цэны ў супэрмаркетах.

## Адказы на пытаньні

Але ж шкода глыбейшае эўраінтэграцыі палягае таксама ў адсоўваньні на другі плян надзённых праблем кантынэнту. Такіх, напрыклад, як павольнае, але няўхільнае каналеньне нямецкае эканомікі — колішняга лякаматыву Эўропы. Або безнадзейная адарванасьць французкае палітычнае эліты ад свайго народу. Або няздольнасьць Польшчы справіцца з карупцыяй. Або нежаданьне італьянцаў мець дзяцей. Сур'ёзныя праблемы, якія вымагаюць глыбокага аналізу, высілкаў сацыяльных эліт канкрэтных краін, рашучага палітычнага лідэрства, а галоўнае — задзейнічаньня дэмакратычных мэханізмаў рэпрэзэнтатыўнае ўлады. Ці дапаможа далейшая эўраінтэграцыя вырашыць гэтыя праблемы? Наўрад ці. Хутчэй, яна яшчэ далей схавае палітычную адказнасьць за няўцямнымі структурамі і бюракратычнымі лябірынтамі. Вынік — адчужэньне ўлады, апатыя выбаршчыкаў і занапад дэмакратыі. Такім чынам, паглыбленьне эўраінтэграцыі азначае адмову ад падставовых прынцыпаў дэмакратыі і вольнага рынку — таго падмурку, на якім паўстала сучасная Эўропа. Становячыся на шлях стварэньня супэрдзяржавы, Эўропа здраджвае сабе.

## Будучыня — за вольнай асацыяцыяй

Але што ж зьяўляецца альтэрнатывай эўрафэдэрацыі? Ці магчыма прывесьці інтарэсы двух тузінаў малых і вялікіх краін да агульнага назоўніка? І ці магчыма знайсьці залатую сярэдзіну паміж прыватным і агульным?

# сатрап нашых часоў

## Рэгіянальны лідэр

Пад кіраўніцтвам Карымава 22-мільённы Ўзбэкістан, самая населеная краіна Цэнтральнай Азіі, зрабіўся рэгіянальным лідэрам і жандарам. У 1992 г. Карымаў паслаў свае войска ў Таджыкістан, каб падтрымаць тамтэйшых камуністаў у вайне супраць таджыцкіх маджахедаў. Камуністы выйгралі, а Карымаў з таго часу пачаў лічыць таджыцкага прэзыдэнта Эмамалі Рахмонава сваім васалам, называючы яго «старшынём калгасу». Ён шантажаваў яго ўзбэцкай меншасьцю ў таджыцкай частцы Фэрганскай даліны і інсьпіраваў мяцяжы, як толькі таджыцкі лідэр рабіўся занадта незалежным.

Карымаў пасварыўся з усімі суседзямі. Засьцерагаючыся ад ваеннага хаосу з Аўганістану, ён доўгія гады падтрымліваў тамтэйшага правадыра генэрала Дустума, узбэка па нацыянальнасьці. Выкарыстоўваў яго ўдзельнае княства як буфэрную зону так імпэтна, што ледзьве не прывёў да распаду Аўганістану.

З Туркмэніяй сварыўся наконт пакладаў прыроднага газу і золата, да кіргізаў меў прэтэнзіі за тое, што давалі прытулак узбэцкім дысыдэнтам. Казаскага прэзыдэнта Нурсултана Назарбаева не выносіў, у сваю чаргу, таму, што той не саступаў яму ў барацьбе за статус лідэра рэгіёну, ды з зайздрасьцю глядзеў на найбагацейшыя паклады казахстанскай нафты — багацьця, якім прырода абдзяліла ўзбэкаў. Карымаў таксама лічыў ляяльных Маскве казахаў інструмэнтам Расеі для змаганьня за ўплыў у рэгіёне, які ён пасьпеў запісаць ва ўласную вотчыну.

Бачачы ў Расеі канкурэнта, ён ахвотна заключыў саюз з амэрыканцамі, калі тыя пасьля 11 верасьня 2001 г. пастанавілі атакаваць Аўганістан у адказ на тэрарыстычныя акты ў Нью-Ёрку і Вашынгтоне. Карымаў палічыў, што ўзамен за палітычную падтрымку і ваенныя базы амэрыканцы абароняць яго ад Расеі і перастануць прыпамінаць яму дыктатарскае праўленьне.

Брутальную дыктатуру, якую ўсталяваў ва Ўзбэкістане Карымаў, ён абгрунтоўваў неабходнасьцю барацьбы з ісламскімі фанатыкамі, якія марылі ператварыць узбэцкую дзяржаву ў халіфат, што жыў бы па законах шарыяту.

У сапраўднасьці расправа з дэмакратамі і канкурэнтамі ва ўласным апараце, а таксама забарона на апазыцыйную дзейнасьць прывялі да таго, што адзінымі актыўнымі праціўнікамі Карымава сталі ісламскія тэрарысты, якія з 1999 г. амаль штогод ажыцьцяўляюць узрывы бомбаў і ўзброеныя набегі. Да 2001 году ўзбэцкія маджахеды ўкрываліся ў аўганскіх талібаў. Цяпер Карымаў падазрае, што яны знаходзяць прытулак у варожых яму таджыкаў, кіргізаў і казахаў.

Рэпрэсіі супраць ісламскіх паўстанцаў павялічваюць колькасьць непрыхільнікаў Карымава. Гэта, у сваю чаргу, падштурхоўвае яго да яшчэ большага гвалту. Перасьлед апазыцыі, зьнявольваньне палітычных праціўнікаў у турмах і катаваньне іх пазбаўляюць Карымава прыхільнасьці Захаду.

Крытыка з боку Захаду, зь якой сутыкнуўся Карымаў (яшчэ нават перад расправай у Андыжане), прывяла да таго, што ён зноў павярнуўся ў бок Расеі. Так, ён выйшаў з рэгіянальнага блёку ГУУАМ, утворанага недаверлівымі да Расеі, а таму празаходнімі Грузіяй, Украінай, Малдовай і Азэрбайджанам, адправіў у адстаўку праамэрыканскага міністра замежных спраў Садыка Сафаева, пра якога пачалі ўжо казаць, што ён мог бы выдатна падысьці на ролю правадыра «бабаўнянай рэвалюцыі» ў Ташкенце.

«Карымаў хацеў быць найлепшым сябрам Амэрыкі, — іранізуе расейскі палітоляг Канстанцін Затулін. — Але ўрэшце ён пераканаўся, што такое сяброўства не гарантуе ні ўлады, ні бясьпекі».

## Майстар маніпуляцыі

Карымаў ня зьменіцца і ні перад чым ня спыніцца, каб утрымаць уладу. Кантроль за ўсімі і ўсім уяўляецца яму адзіным спосабам прадоўжыць спакойна кіраваць. Менавіта таму ён ператварыў краіну ў паліцэйскую дзяржаву. Таму таксама пазьбягаў, як мог, рынкавых рэформаў у эканоміцы, якія пазбаўлялі яго кантролю над гаспадаркай.

Будучы сам пазбаўлены кланавага палітычнага апірышча, Карымаў па-майстэрску маніпуляваў прагнымі да ўлады кланамі з Фэрганы, Ташкенту ці Самарканду. Сама меней год, аднак, па Ўзбэкістане ходзяць чуткі, што здароўе Карымава пахіснулася, а яго паплечнікі распачалі зацятую барацьбу за постпрэзыдэнцкую спадчыну. У якасьці галоўных канкурэнтаў часьцей за ўсё называюць міністра ўнутраных спраў Закіра Алматава і шэфа спэцслужбаў Рустама Іныятава.

Іх ведамствы з самага пачатку служылі асновай рэжыму Карымава. Алматаў праклаў Карымаву дарогу да ўлады, а на пачатку 1990-х гадоў вынішчыў усялякую апазыцыю. Ён і яго міністэрства набылі такую вагу, што Карымаў выращыў стварыць яму процівагу, узмацніўшы спэцслужбы.

## Чытаючы Кіплінга

Ён не расказвае пра сябе, пра яго, па сутнасьці, нічога не вядома, ён не жартуе, нават не ўсьміхаецца. Увогуле выказваецца рэдка. Ён гадаваўся ў інтэрнаце — бацькі памерлі, калі быў дзіцем. Можа, якраз там ён выхаваў у сабе інстынкт выжываньня, якому да сёньня так зайздросьцяць яго калегі па цэху.

Да ўсяго ён дайшоў сам, сваёй галавой, але перш за ўсё — цяжкай працай, а таксама бязьлітаснасьцю ў дачыненьні як да іншых, так і да сябе.

Шмат хто з узбэкаў лічыць, што жыцьцё пад уладай дэспатычнага ўладара — у цэлым, не занадта высокая цана за пачуцьцё бясьпекі і мір. Яны вераць, а можа, далі сябе пераканаць, што менш жорсткі кіраўнік адразу будзе зрынуты канкурэнтамі, а краіна загразьне ў хаосе.

Карымаў заўсёды любіў павучаць заходніх лібэралаў, чытаючы ім Кіплінга: «Усход ёсьць Усход, а Захад ёсьць Захад, і двум гэтым сьветам ніколі не сысьціся». Яшчэ ён часта кажа, што як за часамі камунізму ўзбэкі не да канца адпавядалі камуністычным ідэалам, так сёньня, у эпоху дэмакратыі, яны не заўсёды прымаюць дэмакратычныя ўзоры.

P.S. Збэшчаны на Захадзе за крывавае падаўленьне мяцяжу ў Андыжане, Іслам Карымаў выправіўся праз некалькі дзён у падарожжа ў Кітай — першую афіцыйную паездку пасьля разьні. Кітайцы ня будуць тлуміць яму галаву правамі чалавека. «Апошнія падзеі ва Ўзбэкістане зьяўляюцца ўнутранай справай гэтай дзяржавы, якая можа разьлічваць на нашу падтрымку ў барацьбе з экстрэмізмам, тэрарызмам і сэпаратызмам», — заявіў у аўторак прэс-сакратар кітайскага МЗС. Разьню ў Андыжане параўноўваюць з крывавым падаўленьнем студэнцкіх дэманстрацый па плошчы Цяньаньмэнь у Пэкіне ў чэрвені 1989 г., калі загінула пад тысячу чалавек.

**Паводле gazeta.pl**




МУШТАРДА

# Цьвёрдае францускае «Non!»

Працяг са старонкі 2.

Старыя багатыя сябры ЭЗ падазраюць, што іх аб'ядаюць новыя бедныя сваякі. Тыя, наадварот, лічаць, што іх эксплюатуюць. Хіба можа і адно, і другое быць праўдай? А можа, і адных, і другіх доіць магутная каста эўрачыноўнікаў, адмыслоўцаў пераразьмеркаваньня?
Што такое "Эўропа"? Транснацыянальная карпарацыя або супольнасьць нацый, зьвязаных супольнай гісторыяй і культурай? Агульнай рэлігіяй, між іншым? Пытаньне, на якое давядзецца даваць канкрэтны адказ ня толькі грамадзянам краін ЭЗ, але і тым беларусам, якія прагнуць "вяртаньня ў Эўропу", але надзвычай цьмяна ўяўляюць, якая канкрэтна Эўропа маецца на ўвазе.
Вядома, ня варта крычаць "Vive la France!". Пры любым выніку рэфэрэндуму гэтая краіна засталася б надзвычай далёкай ад Беларусі. Аднак варта стрымана падзякаваць французам за халодны душ, які выліўся ня толькі на галовы брусэльскіх чыноўнікаў. Цяпер і нашым нацыяналістам-летуценьнікам давядзецца рэвізаваць свае ілюзіі наконт "аб'ектыўна-заканамернага" працэсу зьліцьця ўсіх эўрапейскіх народаў у адну звышдзяржаву, месца ў якой нібыта гарантаванае Беларусі самой хадой гісторыі. Французы галасавалі супраць нас, супраць палякаў і ўкраінцаў. Яны нам не давяраюць і маюць на гэта поўнае права.
У нас больш няма падстаў падманваць сябе, быццам заходняя палiткарэктная ветлівасьць тоесная прызнаньню паўнавартаснасьці нашай культуры. Сваю роднасьць з Эўропай мы зможам давесьці, толькі цяжка працуючы над сабой.

Францускі рэфэрэндум змушае да пошукаў больш эфэктыўных мадэляў эўрапейскага супрацоўніцтва. Адной з такіх мадэляў бачыцца канцэпцыя вольнае асацыяцыі краін, кожная зь якіх захоўвае свой суверэнітэт, але бярэ на сябе абавязацельствы прытрымлівацца агульных палітычных і эканамічных прынцыпаў. Гэткая ідэя грунтуецца на прынцыпе "Эўропы Айчын", дзе ўзьнікненьне новае эўрапейскае ідэнтычнасьці не супярэчыць захаваньню ідэнтычнасьцяў нацыянальных. Такая структура прадугледжвала б больш гнуткія мэханізмы прыняцьця рашэньняў на падставе добраахвотнасьці (мадэль Эўразоны), а таксама розныя альтэрнатыўныя мадэлі сяброўства для новых краін. Вось у гэткай эўраасацыяцыі і знойдзе будучыню вольная Беларусь.

## Беларусь у Эўропе Айчын

Пытаньне, ці трэба Беларусі інтэгравацца ў Эўропу, насамрэч не вымагае дыскусіі, бо мае станоўчы адказ. Іншая рэч — шляхі беларуска-эўрапейскае інтэграцыі і магчымасьці яе паскарэньня. У гэтым сэнсе францускі рэфэрэндум дорыць беларусам надзею на адносна хуткае вяртаньне ў эўрапейскі дом. Так ці інакш, пры спрыяльным зьбегу палітычных акалічнасьцяў уваходжаньне Беларусі ў эўраструктуры адбудзецца не раней як праз восем-дзесяць год. Цалкам магчыма, што Беларусь як новая эўрапейская дэмакратыя будзе стаяць поруч з Украінай. Такім тандэмам лягчэй весьці перамовы з эўраструктурамі і заяўляць пра свае інтарэсы. Відавочна, што шанцы Беларусі і Украіны ўвайсьці ў эўрафэдэрацыю ўсялякага тыпу былі б мінімальныя. Старая Эўропа асьцерагалася б значных геапалітычных зрухаў праз вялікія памеры Украіны. З другога боку, больш вольная эўраасацыяцыя дае Беларусі шанц на ўваходжаньне ў супольны рынак, бязьвізавы рэжым з усімі краінамі Эўропы і ўраўнаваньне правоў беларусаў з правамі грамадзян іншых эўрапейскіх краін — якраз тое, што зьяўляецца найпільнейшай неабходнасьцю для будучага разьвіцьця Беларусі. Яшчэ болей павысіць шанцы на ўваходжаньне Беларусі ў эўраструктуры можа рэалізацыя мадэлі так званага "прывілеяванага партнэрства" (privilegierte Partnerschaft), якая прапанецца нямецкімі кансэрватарамі для Турцыі. Такая мадэль палегчыла б згоду Эўразьвязу на беларускую прысутнасьць, а таксама вызваліла б Беларусь ад неабходнасьці рэзкага абмежаваньня ўласнага сувэрэнітэту. Што ж да поўнае інтэграцыі Беларусі ў Эўразьвяз, то гэта не зьяўляецца бясспрэчна рэальнай і мэтазгоднай мадэльлю і адносіцца, хутчэй, да гіпатэтычных сцэнароў. Такім чынам, распрацоўка рэальнае мадэлі эўрапейска-беларускага супрацоўніцтва — адна з галоўных задач беларускае сацыяльна-палітычнае думкі на бліжэйшае дзесяцігодзьдзе.

# Два гады хіміятэрапіі

Судзьдзя пагадзіўся з патрабаваньнем пракурора: Паўла Севярынца (на фота) і Міколу Статкевіча асудзілі на тры гады абмежаваньня волі. Паводле амністыі да 60–годзьдзя Перамогі тэрмін скасаваны на год. З "хіміі" яны выйдуць у 2007–м, адразу пасьля прэзыдэнцкіх выбараў. З суду дакладае **Аркадзь Шанскі**.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Севярынец казаў, што калі прыехаў паступаць у Менск, то вагаўся: ісьці вучыцца на хімічны факультэт ці на геаграфічны. Паступіў на геаграфію, але хімія (нават у такім пачварна-карыкатурным выглядзе) яго ўсё ж наздагнала…

Апошні дзень вясны стаў апошнім днём суду над Севярынцам і Статкевічам. У залю суду трапілі ня ўсе, бракавала месцаў. Павал перад пачаткам пасяджэньня спрабаваў хоць неяк рассадзіць журналістаў і дзяўчат. Потым — амэрыканскіх дыпляматаў. Праваабаронца Людміла Гразнова сумна жартавала: "Павал арганізуе працэс над сабой!" Мікола Статкевіч, якога перад пачаткам пасяджэньня прывезьлі са спэцпрыёмніку, вітаўся са знаёмымі. Не зважаючы на галадоўку, палітык ня страціў аптымістычнага бляску ў вачах. Статкевіч папрасіў цыгарэту і зазначыў, што галадаць будзе да часу свайго выхаду на волю (са спэцпрыёмніку яго выпусьцяць раніцай 3 чэрвеня).

На пачатку пасяджэньня судзьдзя Ясяновіч традыцыйна пытаецца ў Статкевіча, ці не зьмяніў той свайго стаўленьня да суду. "А што, за выходныя суд у нашай краіне стаў больш незалежным?" — парыруе палітык. Пасьля чаго гучыць загад выдаліць Статкевіча да 14 гадзін — да вынясеньня прысуду.

Апошняе слова Паўла Севярынца заняло каля 20 хвілін. Ён не прызнаў сябе ні ў якай ступені вінаватым. "Ніякага крыміналу ў дзеяньнях людзей 18—19 кастрычніка не было. Што, на Кастрычніцкай плошчы сабраліся тысячы хуліганаў? На затрыманых ёсьць характарыстыкі ад участковых, зь месцаў працы. І гэта выдатныя характарысткі. 18 кастрычніка ў Менску сабралася эліта беларускай нацыі. Мне ня сорамна, што я быў сярод гэтых людзей і разам зь імі". Асноўнымі ж віноўнікамі падзей Павал назваў тых, хто прыдумаў і арганізаваў "рэфэрэндум", хто назваў "выніковыя лічбы".

Паводле слоў Севярынца, асноўнымі парушальнікамі закону выступілі акурат прадстаўнікі ўлады: "Што рабілі рэгуліроўшчыкі ДАІ? Як было агучана сьведкамі, яны перамаўляліся па рацыях, заміж таго каб рэгуляваць рух. Аўтобус з АМАПам спыніўся на самым пешаходным пераходзе, і людзі вымушаныя былі пераходзіць вуліцу побач. А потым гэта таксама кваліфікавалі як парушэньне".

Дзеяньні ўладаў (затрыманьні ўдзельнікаў акцыі, зьбіцьцё Анатоля Лябедзькі, прысутнасьць правакатараў зь півам, якіх удзельнікі акцыі самастойна выдалялі, ды інш.) Севярынец назваў правакацыйнымі. "Мяне 18 кастрычніка затрымалі, а потым выпусьцілі, сказалі: ёсьць загад не затрымліваць. Чаму? Калі парушаеш закон, то затрымаць абавязаныя. Ці не таму мяне адпусьцілі, што ў гэты дзень у Менску былі міжнародныя назіральнікі, прадстаўнікі міжнародных арганізацый? А 19-га гэты "дзень дэмакратыі" скончыўся, бо міжнародныя назіральнікі зьехалі. Гэта называецца двайнымі стандартамі".

У сваім заключным слове Павал ўказаў на хібы абвінавачаньня, выяўленыя падчас апытаньня сьведкаў: супрацоўнікі гарадзкога аўтатранспарту сьведчылі, што затрымак руху ў той дзень не было. "У сухой рэшце застаецца толькі пераход вуліцы". Калі Павал скончыў прамову, у зале раздаліся аплядысмэнты. "Прысутныя, напэўна, забылі, што яны не на мітынгу, а ў зале суду, — выказаў незадавальненьне судзьдзя. — Калі такое паўторыцца, я выдалю ўсіх прысутных".

Зрэшты, судзьдзю довады Севярынца не пераканалі. Ясяновіч абмежаваўся толькі заключнай часткай і "ўклаўся" ў пяць хвілін. Хадаркоўскаму прысуд зачытваўся 11 дзён.

Суровы вырак у зале сустрэлі выгукамі "Ганьба!". Статкевіч паабяцаў, што гэты працэс абавязкова ўвойдзе ў гісторыю. Статкевіч і Севярынец маюць 10 дзён на абскарджваньне прысуду. Пакуль іх не паставяць на ўлік у спэцкамэндатуры па месцы адбываньня пакараньня, яны зьвязаныя падпіскай аб нявыезьдзе.

## Маці Паўла Севярынца: Павал вытрымае

Як паставіліся да судовага выраку сваякі Статкевіча і Севярынца?

**Валянціна Статкевіч:** "Як вы хочаце, каб жонка паставілася? Пачварна — за выступ на мітынгу так караць. Вядома, што гэта палітычная справа. Учынкі нашага прэзыдэнта мяне шакуюць. Я была на судзе, я бачыла, як судзьдзя сядзеў і маляваў пальцам кружочкі на нейкай там кнізе, а пасьля яму нешта не спадабалася ці спадабаўся выступ Паўла Севярынца, ён усьміхнуўся так скептычна, маўляў, вы тут гаварыце, гаварыце, а мы пасьля ўстанем і скажам, які прысуд, — так і адбылося. Мікола вытрымае, ён мужны чалавек. Вядома, што нам будзе цяжка. Мне будзе цяжка безь яго і яму безь мяне таксама. Але ён вытрымае. Палітыка для яго справа найважнейшая, справа жыцьця".

**Маці Паўла Севярынца Тацяна** працуе настаўніцай у школе: "Гэта беззаконны акт — вось маё стаўленьне да суду, да ўсяго, што было. А сам прысуд у гэтай сыстэме, у якой мы жывём, і што мы чакалі, дык я памалілася, таму што я вельмі баялася, што, можа, у якую калёнію адправяць, гэта цяжкавата было б, ну а «хімія» — перажывём, што ж рабіць, можа, што і зьменіцца за гэты час. Павал вытрымае… Ён моцны чалавек, ён духоўна багаты, ён ведаў, на што ішоў, і ведаў, што яно так і будзе. Карацей, я малюся, што здарылася так. Два гады — мнагавата, я думала, што скасьцяць болей, бо амністыя. Але год дык год. Ну два гады, я ўжо падлічыла, хлопцу майму будзе 30 у той час, калі ён будзе свабодным, пасталее. Галоўнае, каб здароўе было, будзем падтрымліваць яго, гэта безумоўна".

**Паводле svaboda.org**

# Павал Севярынец: «Якім судом судзіце,

Заключнае слова **Паўла Севярынца** ў судзе 31 траўня

Шаноўны судзьдзя, спадар пракурор! Шаноўныя абаронцы, шаноўныя прысяжныя!

На пачатку я хацеў бы яшчэ раз пацьвердзіць сваю прынцыповую пазыцыю: у гэтым пасяджэньні я ўдзельнічаю выключна дзеля таго, каб гэтая справа магла быць перагледжаная пры новым, дэмакратычным ладзе, калі ў нас зьявіцца сапраўды незалежны і справядлівы суд. Дзеля гэтага я лічу патрэбным дакумэнтаваць усе акалічнасьці гэтага працэсу.

Што да сутнасьці справы, дык судовы разбор чарговы раз пераканаў мяне: ніякага крыміналу ў дзеяньнях людзей, якія 18—19 кастрычніка сабраліся ў цэнтры Менску, каб выказаць пратэст супраць т.зв. "выбараў" і рэфэрэндуму, НЕ БЫЛО. Такім чынам, мы маем справу зь відавочнай палітычнай замовай, выкліканай набліжэньнем прэзыдэнцкіх выбараў 2006 г. і боязьзю ўлады перад падзеямі накшталт украінскай, сэрбскай або грузінскай аксамітных рэвалюцый.

Калі ў судзе разглядаюць любую справу, дык у першую чаргу стараюцца высьветліць адказ на пытаньне, чаму так здарылася. Матывы. Прычыны. Чаму тысячы абураных людзей 18—19 кастрычніка выйшлі на Кастрычніцкую плошчу? Дзіўна, але суд пазьбягаў адказу на гэтае ключавое пытаньне, як агню. Пракурор адразу заяўляў пратэсты, а судзьдзя адхіляў пытаньні, якія б удакладнялі прычыны выхаду людзей на вуліцу і іхніх далейшых дзеяньняў. Бо разумелі, што адказы на гэтыя пытаньні выкрылі б злачыннасьць улады.

Хачу яшчэ раз заявіць: 18—19 кастрычніка на плошчу выйшлі грамадзяне Беларусі, абураныя масавымі парушэньнямі закону і фальсыфікацыямі, зафіксаванымі ў час т.зв. выбарчай кампаніі і рэфэрэндуму. Менавіта як сьведка і ўдзельнік гэтае кампаніі на вуліцы быў і я сам. Ва ўсім сьвеце вядома, зь якім найгрубейшым ламаньнем права адбывалася ў Беларусі галасаваньне 17 кастрычніка. Гэта засьведчыла рэзалюцыя АБСЭ. Паводле сацыялягічных апытаньняў, большасьць беларусаў дагэтуль ня вераць у афіцыйна абвешчаныя вынікі. Людзі не прымаюць хлусьні. Людзі хацелі і хочуць ведаць праўду!

Артыкул, паводле якога нас зь Міколаем Статкевічам судзяць, гучыць так: "арганізацыя групавых дзеяньняў, якія парушаюць грамадзкі парадак, або актыўны ўдзел у іх". Дык што, 18—19 кастрычніка 2004 г. на плошчы сабралася некалькі тысяч хуліганаў, дэбашыраў і іншых антысацыяльных элемэнтаў? Давайце праверым: у матэрыялах крымінальнай справы фігуруюць характарыстыкі, дадзеныя дзясяткам затрыманых удзельнікаў (затрыманых — значыць, па ідэі, асабліва актыўных). Характарыстыкі складаліся ўчастковымі, намесьнікам старшыні райадзьдзелу па месцы жыхарства. Міліцыяй! Чытаем — цудоўныя характарыстыкі. Прыстойныя, інтэлігентныя, добрыя, зычлівыя людзі, у добрых адносінах з суседзямі, несудзімыя, непітушчыя, не заўважаныя ні ў скандалах, ні ў дэбошах… Я бачыў, як выхавана, стрымана і прыстойна гэтыя людзі паводзілі сябе на вуліцы, нягледзячы на свае абурэньні і правакацыі ўладаў. І я сьцвярджаю: 18—19 кастрычніка на Кастрычніцкай плошчы была эліта беларускай нацыі. Гэтыя людзі не пабаяліся разьвітацца з хатнім камфортам, не пабаяліся рэпрэсій, таму што ня могуць трываць таго, чаго трываць не павінен і справядлівы суд. Людзей вяло тое, што вядзе справядлівы суд, — жаданьне ведаць праўду. Мне ня сорамна за тое, што я быў сярод гэтых людзей і што рабіў у гэты дзень. Спадар пракурор у сваім выступе казаў пра маё "частковае прызнаньне віны". Гэта не адпавядае рэчаіснасьці. Заяўляю яшчэ раз: я не прызнаю абвінавачваньня, прад'яўленага мне, у поўным аб'ёме. Хто парушыў закон 18—19 кастрычніка, дык гэта ўлады.

Пачнём з паводзінаў міліцыі.

Замест таго каб дапамагчы людзям вырашыць іх праблемы, забясьпечыць ахову, скантактаваць сабраных на плошчы з прадстаўнікамі ўлады, вызначыць лідэраў і ўступіць зь імі ў перамовы аб парадку далейшых дзеяньняў, супрацоўнікі міліцыі або бязьдзейнічалі, або правакавалі людзей.

Так, 18 кастрычніка на самой плошчы ніводзін прадстаўнік улады не падышоў пацікавіцца, што адбываецца, не прапанаваў дапамагчы, не забясьпечыў праходу людзей. Тысячы абураных людзей у самы ажыўлены час, у самым шматлюдным месцы сталіцы Беларусі — а міліцыя стаіць па дварох К.Маркса, у аўтобусах, з адной мэтай — каб, калі што, адстаяць прэзыдэнцкую рэзыдэнцыю. Улада фактычна сказала людзям: ваша думка нікога не цікавіць! Але беларусы — ня быдла. Яны патрабуюць адказу, патрабуюць праўды — і натуральна, што яны пайшлі цераз праспэкт да рэзыдэнцыі. І я пайшоў разам зь імі, каб задаць пытаньне таму, хто трымае ў сваіх руках усю ўладу ў краіне і нясе адказнасьць за ўсё, што творыцца ў Беларусі.

Што ў гэты момант робяць супрацоўнікі ДАІ? Згодна з паказаньнямі сьведкаў, перамаўляюцца па рацыі, замест таго каб рэгуляваць рух транспарту. Затым, у той самы момант, калі людзі падышлі да тэатру Я.Купалы, міліцэйскае начальства выстройвае адзіны ланцужок зь некалькіх супрацоўнікаў патрульна-паставое службы перад шматтысячным рухам людзей. Не зьвяртаюцца да грамадзян, да лідэраў, каб прапанаваць сваю дапамогу ў перадачы пэтыцыі ў адміністрацыю, не ўступаюць у перамовы, а падстаўляюць ланцужок насустрач вялікаму руху людзей. Навошта? Каб справакаваць сутыкненьне? Было дастаткова аднаго закліку: "Даві", "Ламі", "Прарывай", — і міліцыянты былі б проста затаптаныя. Але, яшчэ раз паўтаруся, да гонару тых тысяч людзей, што ішлі да рэзыдэнцыі, ніводзін такога закліку ня кінуў. Бо нам не патрэбна кіргіская рэвалюцыя, нам патрэбен украінскі варыянт, без крыві, бяз гвалту. І людзі гэта разумеюць. Людзей білі, затрымлівалі, кідалі на асфальт — але яны проста разьвярнуліся і пайшлі ў іншы бок.

У гэты момант затрымалі і мяне зь некалькімі ўдзельнікамі, каб праз дзесяць хвілін выпусьціць. Чаму? Бо быў загад "сёньня не затрымліваць". Удумайцеся! Калі парушаны закон, затрымлівайце — і ў суд. Калі не — адпускайце і ніякіх судоў. Не! 18 кастрычніка ў Менску шмат міжнародных прадстаўнікоў і журналістаў. 18-га — дзень дэмакратыі. 18-га стараемся захоўваць закон. А ўжо 19-га, калі міжнародныя прадстаўнікі зьехалі, мы зноў жывём у той краіне, дзе жылі апошнія 10 гадоў. Двайныя стандарты — здаецца, так гэта называюць на БТ?

У тыя 10—15 хвілін, якія я быў затрыманы, людзі выходзяць на праезную частку праспэкту. Але ў абвінаваўчым заключэньні гучыць ізноў: "Севярынец павёў за сабою народ на прас-

# Літаратурай па пракуратуры

Гэта кніга, безь якой добры настаўнік не абыдзецца на занятках па ідэалёгіі. Севярынец тут больш літаратар, чым філёзаф, больш ідэоляг, чым аналітык. Бездань пазытыву, бездань аптымізму, веры, любові, натхненьня. Прыгожая кніга.

Фэнамэналёгія — пошук фэномэнаў. Вывучэньне здольнага захапляць. Севярынцава кніга пра Беларусь напісана з захапленьнем. Гэта кніга-гутарка. Кніга-казань пра тое, за што варта любіць Беларусь. Зямля, гісторыя, гаспадарка, культура, спорт, асобы, духоўнасьць — гэта толькі назвы разьдзелаў. Але не шукайце ў артыкулах мэтадычнасьці Абдзіраловіча — у казані паўторы толькі ўзмацняюць эфэкт, а дробныя недакладнасьці ня маюць вагі. Людзей уражлівых яна ўзрушыць да сьлёзаў.

Гэта эмацыйны выклад сыстэмы каштоўнасьцяў цэлага пакаленьня. Сьветапогляд пасынкаў і падчарак Лукашэнкі, якія былі ўжо дастаткова дарослымі, калі імпазантны айчым зьявіўся ў іхным доме. Хоць многія зь іх і ня прымуць Севярынцавай канцэпцыі беларускага мэсіянства: нібыта гістарычная супэрзадача Беларусі — ўратаваць Расею. Не ўцячы ад Расеі і спакойна ўздыхнуць, як зрабілі браты-палякі ды браты-літоўцы, уступіўшы ў NATO, але пайсьці насустрач Расеі і “перамагчы імпэрыю, дэспатызм і азіятчыну высокай культурай і духовасьцю”.

Беларушчыну пакаленьне “Маладога фронту” і Менскай Вясны чэрпала з адраджэнскіх гістарычных кніжак. Адсюль і шчырае Севярынцава захапленьне гісторыяй — аж да яе кананізацыі праз параўнаньне зь біблейскай. Севярынцавы беларусы — гэта народ асобаў, народ пасіянарыяў, расьпяты “на геапалітычным крыжы між Скандынавіяй і Чарнамор’ем, Расеяй і Захадам”. Народ, якому абавязаныя сваёй сёньняшняй веліччу Расея, Польшча і Ізраіль. Апошні — яшчэ адна нітачка да Бібліі. Заканамерная нітачка, гаворыць Севярынец: без хрысьціянства не было б Беларусі. Як, зрэшты, і ўсёй заходнеэўрапейскай цывілізацыі: “Табе здаецца, я многа кажу пра Бога? Ведаеш, нашыя продкі Залатога Веку былі яшчэ больш пабожнымі”. У свой час раптоўнае навяртаньне ў пратэстантызм лідэра “Маладога фронту” — амаль баявой арганізацыі — шакавала. Трэба быў час, каб паверыць у Паўлаву шчырасьць. Сумневы ўзьнікалі яшчэ й таму, што гэты выбар быў геніяльны як палітычнае рашэньне: на сілу супраціву ўлада дагэтуль знаходзіць яшчэ большую сілу. А вось што супрацьпаставіш Богу?

У кнізе аўтар глядзіць вышэй надзённага браньня ў рожкі з рэжымам. Лукашэнка для яго — такі ж факт рэчаіснасьці, як тэлевізары “Гарызонт”. Ён зьяўляецца, напрыклад, у артыкуле пра хакей і сваёй прысутнасьцю робіць гэты від спорту яшчэ больш нацыятворчым. Увогуле, так інтэлектуальна і літаратурна, як Севярынец, пра спорт па-беларуску яшчэ ніхто не пісаў. У Паўлавай сыстэме нацыянальных каштоўнасьцяў ён ураўнаваны ў правах з культурай і гісторыяй. І кожны спартовы артыкул — матэрыял для асобнай кнігі. Бяры хоць Севярынцаву сотню найлепшых беларускіх спартоўцаў, распрацоўвай — і выйдзе бэстсэлер.

Павал не стыдаецца ўжываць савецкія некалі-ідэалягічныя штампы, цытаваць памятныя з саўдэпаўскага дзяцінства тэксты, якія калёным жалезам выпальвалі адраджэнцы пакаленьня “Тутэйшых”. Яму ня сорамна сказаць, што першая асацыяцыя да “Пагоні” — песьня зь фільму “Няўлоўныя мсьціўцы”, што Быкаў камандаваў батарэяй “легендарных саракапятак”, ня сорамна сказаць “Вялікая Расейская Культура”. І таму кнігу Севярынца ўспрыме шырэйшая аўдыторыя, чым, скажам, роднасны паводле канцэпцыі “Слоўнік Свабоды”. Апошні ахоплівае шырэйшае кола паняткаў, але болей у ім і адстароненасьці, адмаўленьня. Севярынцава ж кніга збудаваная на блізкасьці й прыманьні. Адмаўляе ён хіба асабіста непрыемныя яму рэчы: паганства і чарку. Нават знаходзіць калямбурна-аднакарэннае ў паганскім чарадзействе і чарцы. Гэтаксама проста і паэтычна атаясамліваюцца “верш” і “вершнік”. Кніга сочыцца мэтафарамі, аказіяналізмамі.




**Павал Севярынец. Нацыянальная ідэя. Фэнамэналёгія Беларусі.** — Рыга: Лайма, 2005.

360-старонкавы том ня дужа добра склеены — чытайце асьцярожна. Зрэшты, так прасьцей разьбіраць яго аркушы на ўлёткі. Бо многія артыкулы вартыя наклейваньня на рэклямныя шчыты ў транспарце. Гэтаксама, як і цытаваньня на ўроках дзяржаўнае ідэалёгіі. Разумныя настаўнікі скарыстаюцца.

**Андрэй Скурко**

# Хрысьціяне ў адной чарзе, палітыкі — у другой

Павал Севярынец пасьпеў прэзэнтаваць “Нацыянальную ідэю” да прысуду па “справе беспарадкаў”.

Увечары 20 траўня, па сканчэньні чарговага судовага паседжаньня, Павал Севярынец прэзэнтаваў у сядзібе БНФ сваю трэцюю кнігу “Нацыянальная ідэя. Фэнамэналёгія Беларусі”.

Задума напісаньня кнігі ўзьнікла некалькі гадоў раней, калі Павал задаўся пытаньнем: “Чым ёсьць Беларусь?” Падчас выступу ў Севярынцавых руках часьцей была Біблія — і прамоўніцкі стыль Лютэра і Рэйгана гучаў для сёньняшняй Беларусі не зусім звыкла. “Нацыянальная ідэя” — пералік дзьвюсот найбольш вядомых у сьвеце фэномэнаў беларускай гісторыі, культуры, геаграфіі, спорту, асобаў і духоўнасьці.

“Ідэя кнігі ў тым, — кажа Павал, — што Беларусь і беларускасьць унікальна хрысьціянскія ў сваёй сутнасьці. І, прааналізаваўшы 200 элемэнтаў — ад “Песьняроў” да БелАЗу, ад бел-чырвона-белага сьцяга да асобы Скарыны, я знайшоў пацьвярджэньне сваёй асноўнай тэзы — адраджэньне Беларусі можа быць зьвязанае толькі з духоўным адраджэньнем”.

Эмацыйна глядзеўся выступ акадэміка Радзіма Гарэцкага, які назваў Севярынца найлепшым сваім студэнтам, пажадаў яму плённай працы і выказаў надзею ўбачыць надалей у беларускім сьпісе болей навукоўцаў і асобным, стрыжнявым разьдзелам “Нацыянальнай ідэі” — беларускую літаратуру. Да Гарэцкага далучыўся гісторык Анатоль Грыцкевіч — і зусім натуральнымі гучалі пажаданьні большай колькасьці гістарычных постацяў у пантэоне славы.

Так што адразу гутарка перайшла на другую, дапоўненую рэдакцыю.

“Гэты стос для хрысьціян, гэты для палітыкаў, гэты для журналістаў”, — мовіў Павал і пачаў раздаваць кнігі. Вялікага натоўпу хрысьціян і палітыкаў не назіралася, а што да астатняга, то кніга разыходзілася, як гарачыя піражкі.

Прыехалі Ўладзімер Арлоў і Зьміцер Бартосік, якіх затрымалі чытачы ў Заслаўі. “У другім выданьні лепей зрабіць іншую назву, не “Фэнамэналёгія…”, а больш чытацкую”, — параіў абазнаны ў літаратурных справах Арлоў.

У маладога палітыка цікавіліся й судовым працэсам. “І судзьдзям падару сваю кнігу”, — адказаў Павал Севярынец.

**Андрэй Расінскі**

# такім і вас судзіць будуць»

пэкт”. Фальсыфікацыя! Не ўзялі нават клопату ўзгадніць зь відэаздымкай.

Далей. Мітынг на Кастрычніцкай плошчы. Чаму б сп.Навумаву, спн.Ярмошынай, сп.Лукашэнку ня выйсьці ды не растлумачыць сваю пазыцыю пяці тысячам грамадзян? Паўсюль журналісты, міжнародныя прадстаўнікі. Улада баіцца, бо праўда ёй не патрэбна, а міліцыя зноўку адсутнічае — трэба ж паказаць міжнароднай супольнасьці, што ў нас не паліцэйская дзяржава.

Нарэшце, людзі ідуць да КДБ. І вось цуд — дзень дэмакратыі працягваецца — да маніфэстантаў выходзіць кіраўнік КДБ Л.Ерын! Слухайце, можа, я што-небудзь блытаю? Да групы хуліганаў, якая груба парушае грамадзкі парадак, выходзіць шэф КДБ і запрашае асабліва буйных да сябе ў кабінэт папіць гарбаты і адказаць на пытаньні?!.

Ужо а дзясятай вечара, калі купка моладзі засталася стаяць на Кастрычніцкай плошчы, я сам падыходзіў да 30—50 супрацоўнікаў у цывільным, якія казалі, што загаду браць не было. Дзень дэмакратыі, бачыце, яшчэ ня скончыўся. Закон, не закон, а загаду браць не было!

Але вось ужо назаўтра, 19 кастрычніка, міліцыя загад атрымала. З самага пачатку збору людзей на Кастрычніцкай плошчы гучыць папярэджаньне разыходзіцца, час на разыходжаньне — 10 хвілін, інакш будзе прыменена фізычная сіла. Гэта хіба законныя патрабаваньні міліцыі? Не, незаконныя, бо паводле Канстытуцыі грамадзяне Беларусі маюць права на свабоду сходаў, выказваньня сваёй думкі.

Людзі ідуць па ходніках. Перад прыступкамі падземнага пераходу гучыць папярэджаньне: акуратней, акуратней… Ад міліцыі? Не. Ад тых людзей, каго цяпер судзяць за парушэньне грамадзкага парадку. Пры зборы людзей гучыць прамова: ніводнай шыбы не павінна разьбіцца, ні кроплі крыві не пральецца, нашы перамены будуць аксамітнымі. Хто гэта кажа? Прадстаўнікі ўлады? Міліцыі? КДБ? Не, тыя людзі, каму спадар пракурор патрабуе даць тры гады “хіміі” па крымінальным артыкуле за хуліганства! Паўтараю, мне самому даводзілася ў пэўныя моманты браць на сябе абавязкі міліцыі.

19 кастрычніка людзі зьбіраюцца перайсьці з аднаго ходніка на няцотным баку праспэкту на другі бок. Прыпыняюцца, чакаючы зялёнага сьвятла на пераходзе. І што робяць два аўтобусы з АМАПам, якія рухаюцца ўздоўж калёны? Прыпаркоўваюцца на самай “зебры”, перакрываючы пешаходны пераход. Тыповая правакацыя. Вось чаму, як сказаў пракурор, людзі пераходзілі часткова па пераходзе, часткова па-за ім. Дарэчы, як паказала яшчэ адна сьведка, спн.Панкевіч, 18 кастрычніка той жа аўтобус з АМАПам 10 хвілін не даваў ёй праехаць па вуліцы К.Маркса. А вось на відэастужцы і каратка стрыжаныя, з тыповай выпраўкай, у скураных куртках, з бутэлькамі піва ў руках лезуць у тэлекамэры. Правакатары, якіх дэманстранты спрабавалі прыбраць зь пярэдніх шэрагаў і якія потым спакойна адыдуць за кардон міліцыянтаў.

І вось — затрыманьне. Мірныя людзі, якія скандавалі палітычныя патрабаваньні, спыняюцца за 15 мэтраў ад амапаўскіх шэрагаў. Дзень дэмакратыі скончыўся, гучыць загад — і вось ірвуць падлеткаў, жанчын, цягнуць па асфальце, закідваюць у аўтобус… А потым — даганяюць аднаго зь лідэраў апазыцыі, А.Лябедзьку, і жорстка зьбіваюць яго на вачах у ягоных сяброў, трымаючы шкляныя дзьверы рэстарану. Зноў тыповая правакацыя.

А потым затрыманыя ўдзельнікі атрымліваюць па 10—15 сутак, якія адбываюць у прыніжальных умовах у спэцпрыёмніку-разьмеркавальніку для бамжоў і алькаголікаў на Акрэсьціна. Спадарства, а куды вы дзенеце 10 сутак Статкевіча?! Мае 15 сутак? Гэта што, разьмінка перад некалькімі гадамі “хіміі”? Двойчы за адно і тое ж? Гэта закон?

А што, законна было адмяняць прыпынак “Кастрычніцкая плошча” 18—19-га? Колькі тысяч людзей пацярпелі праз тое, што нейкі баец нябачнага фронту, баючыся вялікага збору людзей, адмяніў для ўсяго транспарту гэты прыпынак?

А што, законна штодня для праезду прэзыдэнцкага картэжу перакрываць праспэкты Машэрава або Скарыны? Хто-небудзь калі-небудзь быў прыцягнуты да адказнасьці за аўтамабільныя заторы?

А што, законна кожны вечар па БТ хлусіць пра адмарозкаў, студэнтаў-недавучак, п’яных дэманстрантаў?

Законна сядзяць Марыніч, Леванеўскі, Васільеў, Клімаў, Статкевіч?

Законна выключаць з унівэрсытэтаў і нават школ удзельнікаў такіх акцыяў — так, што 11 маладых людзей галадаюць па ўсёй Беларусі?

Законна, што людзі да гэтага часу не атрымалі адказу на сваё пытаньне: што ж адбылося 17 кастрычніка 2004 г.?

Такім чынам, яшчэ раз прааналізуем:

— грубае парушэньне грамадскага парадку? — НЯМА!

— непадпарадкаваньне законным патрабаваньням міліцыі? — мяне асабіста не папярэджвалі; законных патрабаваньняў не было;

— перашкода працы транспарту? — сьведка Суліма, начальнік аналітычнага аддзелу службы арганізацыі руху КУП “Мінсктранс”, паказала, цытую: “18, 19, 20 кастрычніка 2004 г. затрымак руху ў пэрыяд з 18.00 да 19.30, якія зрываюць рух па маршруце і прыводзяць да страты транспартнай працы, **не было**”;

— перашкода працы крамаў? — пракурор адмовіўся ад гэтай часткі абвінавачваньня;

— несанкцыянаванае шэсьце? — 15 сутак за гэта ўжо было;

— што ж тады? Пераход разам з усімі праспэкту Скарыны? — 120-ты артыкул АК, 0,5 мінімалкі.

Тады чаму пракурор патрабуе тры гады “хіміі” (два паводле амністыі)? Бо ў 2006 годзе выбары і трэба пазбавіць мяне і Статкевіча магчымасьці ўдзельнічаць у іх.

Справа палітычная, і гэтую справу будуць вывучаць, як у свой час вывучалі справы Дзімітрава, Дрэйфуса або Прытыцкага, і будуць сьмяяцца зь юрыста І клясы Пазьняка і казаць: “Хоць бы прозьвішча ня ганьбіў!”

Ужо некалькі разоў я казаў, што ня мог прымаць удзелу ў арганізацыі збору людзей, паколькі да 18 кастрычніка быў у Віцебску. Але зараз з усёй адказнасьцю магу заявіць, што ведаю, хто арганізаваў 18—19 кастрычніка. Іх арганізаваў той, хто вынайшаў гэты рэфэрэндум 17 кастрычніка. Іх арганізаваў той, хто ажыцьцяўляў фальсыфікацыі. Іх арганізаваў той, хто даў лічбы, пасьля абвяшчэньня якіх уся краіна скаланулася ад хлусьні.

Але хлусьня ня вечная. Праўда пераможа, бо ёсьць на сьвеце Бог і Ён усё бачыць. Справядлівасьць і закон у Беларусі будуць адноўленыя. Без крыві. Без хлусьні. Бяз гвалту.

А сёньня я магу толькі згадаць словы з Эвангельля: “Якім судом судзіце, такім і вас судзіць будуць” (Мацьвея 7:2).

# Самая вялікая страта

Добра памятаю той дзень, дакладней, ноч. Як кандыдат у дэпутаты Менгарвыканкаму ад БНФ, я меў магчымасьць назіраць на сваім выбарчым участку за ўсімі дэталямі рэфэрэндуму. Піша **Сяргей Харэўскі**.

Два гады, як я жыву ў новым доме. На адным з паверхаў хтосьці з жыхароў прыклеіў да аконнага адкосу выцятую зь нейкае газэты «Пагоню», а нехта намаляваў абапал губной памадаю бел-чырвона-белыя сьцяжкі. За два гады ніхто й не парупіўся, каб гэткі «аўтарык» сьцерці, хоць і вокны мыюцца, і вазоны на пад’езных падваконьнях даглядаюцца. Падазраю, што мой дом не ўнікальны для Беларусі. Сям-там не прыбралі дзяржаўных «Пагоняў» нават з афіцыйных установаў. Штотыдзень праяжджаю праз адно мястэчка (называць лепш ня буду), дзе да сёньня красуецца наш герб, прымацаваны на высачэзнай трубе заводу. Безьліч бел-чырвона-белых сьцягоў і выяваў гербу было ўратавана й ашчадна перахоўваецца. Напрыклад, былы пасол у Вільні сп.Вайтовіч загадаў праз паўгоду па рэфэрэндуме эмалевыя таблічы з «Пагонямі», што ў свой час на агульны манер замаўлялі ажно ў Швайцарыі, перагарнуць у праалеенаю паперу й ахайна перахаваць.

Добра памятаю той дзень, дакладней, ноч. Як кандыдат у дэпутаты Менгарвыканкаму ад БНФ, я меў магчымасьць назіраць на сваім выбарчым участку за ўсімі дэталямі рэфэрэндуму. Таму мая прысутнасьць на выбарчым участку й за ягонымі кулісамі была цалкам законнаю. Са мною была цэлая кампанія бээнэфаўцаў, якія раўніва й пільна сачылі за кожным крокам выбарчае камісіі. Мы сабраліся зусім рана, ці не а 6-й, ды паблажліва назіралі за самымі актыўнымі выбаршчыкамі — пэнсіянэрамі, якія першымі прыйшлі выявіць сваю волю. Адным з маіх супернікаў на дэпутацкае месца быў старшыня кампартыі Новікаў. Таму значная колькасьць назіральнікаў была зь ягонага лягеру. Празь сілу пацiснуўшы адзін аднаму рукі, мы больш ні пра што не гаварылі зь імі. Тады гэта здавалася марным.

Я быў сьведкам, што аніякага прымусу не было. Рэфэрэндум, які прайшоў у Беларусі 14 траўня 1995 году, быў насамрэч першым усенародным апытаньнем у гісторыі краіны. Больш за тое, у школе №54, дзе праходзіла галасаваньне па выбарах разам з рэфэрэндумам, было шыкоўна аздобленае транспарантамі фае. На іх ляцелі й ляцелі вершнікі на конях у спавівах бел-чырвона-белых стужак. Нават на шкле дзьвярэй тады былі выявы Пагоні. Вялікі каляровы герб вісеў і ў вэстыбюлі. Па сьценах — навюткія наглядныя пляншэты з цытатамі беларускіх клясыкаў. Словы пра любоў да Бацькаўшчыны й мовы мусілі выхоўваць новую генэрацыю беларусаў. Нехк не прыходзіла нават у галаву, што людзі, пастаяўшы, паглядзеўшы на гэтыя школьныя аздобы, будуць галасаваць супраць сваёй роднай мовы й нацыянальнае сымболікі.Усё было так, як і мусіла быць. Хораша, чыста, усё па-свойму.

Дырэктар школы, абаяльны разумны чалавек, толькі паціскаў плячыма. Маўляў, сьцяг і герб ён яшчэ не зразумеў, а вось жа мову чапаць, бадай, ня варта. Тое самае сказала журналістам і Лукашэнкава жонка Галіна. На ўваходзе віселі агіткі да рэфэрэндуму. Нягеглыя, няякаснай паліграфіі. Дарэчы, узор «новага» гербу быў без чырвонай зоркі. І на сьцягу не было зоркі ў навершы. Але тыя, хто шоў прагаласаваць супраць беларушчыны, нават не ўглядаліся ў тыя эскізы, ня ўчытваліся ў пытаньні. Яны інтуітыўна ведалі, што выкрасьліць. Людзей было безьліч. Ад пільнага ўзіраньня ў

# Як гэта пачыналася

Да дзясятай гадавіны акцыі «Дзеці хлусьні вяртаюцца». Першы мэмуарны вопыт **Лёліка Ушкіна**.

Калі б у пачатку вясны 1995-га нехта сказаў, што на двары апошняя вясна беларускай дэмакратыі, я б вырашыў, што мой візаві атруціўся палёнкай «Раялю». Гэты сьпіртавы сурагат прадаваўся ў той час у кожным камку сталіцы.

Якая дыктатура? У Менску працавалі ажно шэсьць рок-клюбаў, мы, born in USSR, адкрывалі для сябе сьвет (у красавіку я аўтастопам схадзіў у Парыж), апазыцыйная «Свабода» брала плянку паўсотні тысяч асобнікаў, «рэваншысты» Адамовіча ладзілі шэсьці з паходнямі… Нарэшце, у краіне адбываліся сапраўды вольныя выбары ў Вярхоўны Савет.

## Дух часу

Тое, што яны былі супэрвольныя, сьведчыла передвыбарная кампанія, у якую аўтар быў ангажаваны. Нашым кандыдатам быў студэнт філфаку Ігар Б. Ігар быў культавай асобай таму, што празь передоз алькаголю ўвесь час трапляў у нейкія камічныя сытуацыі. Памятаю, аднойчы ў рамках пэдпрактыкі ён з бадуну прымусіў вучняў спрагаць дзеяслоў «выпадкова».

Мы, група студэнтаў філфаку і гістфаку, вырашылі зрабіць рэмэйк перадвыбарнай кампаніі «Памяркоўнай партыі прагрэсу ў рамках закону» (ПППРЗ) Ярaслава Гашака. Той самай ПППРЗ, якая абяцала ў выпадку перамогі забясьпечыць кожнага чэха кішэнным акварыюмам. Разьвялі на грошы адну трацкісцкую тэндэнцыю з Аргентыны, і кампанія Ігара стартавала. Карыстаючыся тым, што наш кандыдат быў самым маладым кандыдатам у дэпутаты ВС у краіне, мы лёгка выклікалі зацікаўленасьць СМІ і сьцябаліся, як дзеці: наш кандыдат выступаў за беларускую акупацыю Антарктыды і генацыд усіх тамтэйшых пінгвінаў, перафарбоўку будынку БДУ ў аранжавы колер; 1 красавіка мы пікетавалі стаматалягічны кабінэт у дворыку БДУ ў знак пратэсту супраць павышэньня цэн на прыгарадныя цягнікі… Кульмінацыяй кампаніі стала піўная дуэль з адным зь лідэраў «Партыі аматараў піва» (ПАП) Рамашэўскім. Борман — пад такой мянушкай Рамашэўскага ведаў увесь айчынны андэрграўнд — быў канкурэнтам па нашай акрузе.

Праз сваю знаёмую я ціскануў на старонках «Знамени юности» адкрыты ліст да кандыдата ПАП. Тупы эпістальярны наезд, у якім даводзілася, што сябры ПАП — ня знаўцы піва, а прымітыўныя грызуны, якія нічога не разумеюць у ячменных злаках. Узьніклыя электаральныя супярэчнасьці прапаноўвалася вырашыць у фармаце піўной дуэлі па прынцыпе: «Хто меней вып’е, той здымае кандыдатуру». Борман, у якога вадзіліся грошы, павёўся. Гістарычная дуэль за кошт партыйнай касы ПАП адбылася ў сучасным «Старым рэчышчы» (тады гэта быў клясычны піўняк).

Натуральна, мы прадулі, затое на халяву выпілі 20 куфляў піва. Шчыра кажучы, мы б у любым выпадку прайгралі. Падчас збору подпісаў нас зацягнула дрыгва таннай папулярнасьці. Зьбіраючы подпісы па інтэрнатах, наш team рэгулярна натыкаўся на студэнцкія фэсты. Калі іх арганізатары чулі, што перад імі кандыдат і яго даверaныя асобы, нас адразу клікалі за стол. На гэтым збор подпісаў заканчваўся. У выніку замест неабходных трохсот мы ледзь-ледзь накалупалі 150. Аднак тонус у нас быў проста цудоўны.

## Эпізод зь Лімонавым

Ніякага нацыянальнага імпэту ў мяне тады не было, і на той час уся мая палітычная актыўнасьць будавалася згодна з формулай «Se faire plaisir». Калі ў сьнежні 1994-га нацыяналісты атакавалі палац культуры «Сукно», дзе Лімонаў і Дугін павінны былі нешта прагрэжаць пра эўразійскую мэнтальнасьць, я знаходзіўся ў пакойчыку з нацболамі. Нашу інтэлектуальную палеміку наконт апошніх трактовак Эволы абламаў акрываўлены С., адзін зь лідэраў беларускай НБП.

«Бээнэфаўцы, — адрапартаваў ён, — прарвалі апошні кардон — шкляныя дзьверы — і, калі мы ня звалім, арганізуюць над намі паказальны суд Лінча». «Лёлік, давай з намі», — сказаў С., скачучы праз акно. Раней туды ўжо сіганулі Дугін і Лімонаў. «На фіга», — сказаў я і сьмела выйшаў насустрач нацыяналістычнаму натоўпу. Пагромшчыкаў узначальваў Славамір Адамовіч. «Лёлік, — спытаў ён, — ты Лімонава ня бачыў?» «Не», — адказаў я і пайшоў вонкі, прыхапіўшы з сабой трафэй — нацболаўскі магнітафон.





Сям-там не прыбралі дзяржаўных «Пагоняў» нават з афіцыйных установаў. Штотыдзень праяжджаю праз адно мястэчка, дзе да сёньня красуецца наш герб, прымацаваны на высачэзнай трубе заводу.

іхныя твары мне станавілася млосна. Падчас галасаваньня агітацыя забаронена, а як хацелася пераканаць людзей яшчэ раз, апошні раз…
Мы ўсё супакойвалі сябе, што нават рэфэрэндум нічога ня значыць, што ёсьць Канстытуцыя, Вярхоўны Савет. Па абедзе наш аптымізм пачаў згасаць. Нарэшце, як зусім сьцямнела, пачаўся падлік. Міліцыя выправадзіла пакрысе проста цікаўных. Дзьверы замкнулі. На даўжэзны кумач, што ўхінаў пастаўленыя ўстык школьныя сталы, пасыпаліся бюлетэні. Напруга была неймаверная. «За» — сюды, «супраць» — сюды. Усьлед іх пачалі яшчэ раз раскладаць, удакладняць. Скончылі. Нібы скончыўся суд і абвесьцілі вырак.
Палагаднелыя камуністы прапанавалі выпіць. У іх інтанацыях зьявілася нават спачуваньне.
Але адразу па рэфэрэндуме думалася пра іншае. Для тых, хто некалі парынаў ад радасьці за вяртаньне нацыянальнае сымболікі ў 1991, гэта была сапраўдная драма. Бяз вартае пашаны нацыянальны сьцяг, на якім прысягалі й якому кляліся ўжо тысячы беларусаў, быў зьняты і разарваны на кавалкі. Але ні яны, ні я ўжо нічога не маглі зьмяніць. Дагодлівыя паслугачы Лукашэнкі паставілі на «сувэніры» свае аўтографы. Думалася, што разам з разадраным рукамі Ціцянкова сьцягам разьдзіраюць само сэрца беларушчыны. Паводле афіцыйных вынікаў, 14 траўня 1995 году за прапанаваныя прэзыдэнтам Лукашэнкам варыянты гербу і сьцяга прагаласавала 48 працэнтаў выбаршчыкаў ад агульнае іх колькасьці. Як ні круці гэтыя лічбы, іншымі яны ня стануць. Дзесяць гадоў таму Лукашэнку, які не набрыняў пачуцьцём самаўладзьдзя, не хапіла нахабства прыпісаць 3%. А сёньня яму няма патрэбы нават у рэфэрэндумах: хоча — сталічныя праспэкты перайменуе, хоча — падручнікі сам выпраўляе.
За ўсе гэтыя дзесяць год у нас, аднак, не было найбольшае страты. У дэмакратыі беларусы не пасьпелі рассмакавацца за тыя чатыры гады да прыходу Лукашэнкі. Лад, што існаваў да яго, назваць дэмакратычным не выпадае: улада захоўвалася ў руках былое камуністычнае намэнклятуры, бальшыня зь якое засталася ў сваіх жа савецкіх кабінэтах. Не былі дэмантаваныя камуністычныя манумэнты, сымболіка, тапонімы, назвы вуліц. Галоснасьць — яшчэ не дэмакратыя, што высьпявае як жыцьцёвая патрэба ў новых пакаленьнях. А вось жа мова й нацыянальныя сымбалі незалежнае Беларусі сталі галоўнымі знакамі эпохі да дыктатуры. Ня ведаючы да сёньня, што такое дэмакратыя, беларусы, аднак, ужо ведаюць, што такое зьняважаная нацыянальная годнасьць.

### Вяртаньне анархістаў у рэальнасьць

У разгар усёй гэтай весялухі, недзе ў красавіку, звонку пачалі надыходзіць дзіўныя і незразумелыя навіны — спачатку ініцыяваньне рэфэрэндуму, потым зьбіцьцё дэпутатаў ад апазыцыі, потым фільм «Дзеці хлусьні», нарэшце сам плебісцыт. Канчатковае вяртаньне ў рэальнасьць адбылося на другі-трэці дзень пасьля рэфэрэндуму, калі я прыйшоў на сваю альма матэр — гістарычны факультэт.

Трэба адзначыць, што тады гэта быў супэрфакультэт. І рэч ня ў тым, што ў буфэце там прадавалася «Старажытнае». На пачатку 1990-х дыплём гісторыка ужо не гарантаваў кар'еры па лініі КПСС, таму сюды ішлі або поўныя даўны, якія не маглі атрымаць статус індывідуальнага прадпрымальніка і вазіць шырспажыў у Польшчу, або сапраўдны фанаты гісторыі.

### Трэба нешта рабіць

Будынак гістфаку пасьля рэфэрэндуму нагадваў філіял Навінак, дзе косяць ад войска, сымулюючы muttering delirium (ціхія крэйзі). Выкладчыкі і студэнты рухаліся, быццам фантомы. Час ад часу нехта казаў, што яшчэ ня ўсё страчана, ёсьць Канстытуцыйны суд і г.д. Пасьля зноў панавала маўчаньне.

Я не зразумеў агульнага смутку, пакуль праз пару дзён мне ня трапіла ў рукі «Народная газета» з артыкулам аб тым, як Ціцянкоў разадраў бел-чырвона-белы сьцяг. Тут у мяне ўнутры нешта заварушылася.

Пры ўсім маім цынізьме выхадка Ціцянкова — гэта было ўжо занадта. Я зьбег на першы паверх, дзе знаходзіўся інтэрнатаўскі штаб «сьвядомых». Заўсёды ў інтэрнаце ёсьць людзі, якія шануюць беларушчыну і трымаюцца разам. У «капейцы» такімі людзьмі былі Юра, Максім і Вадзік. Акрамя таго, у той час у іх пакоі знаходзілася Вераніка, дачка вядомага беларускага мастака. «Слухайце, — сказаў я, — чаму вы маўчыце? Трэба нешта рабіць!» Пачалі думаць, што рабіць. Вырашылі хадзіць, быццам вязьні, вакол прэзыдэнцкага палацу, дэманструючы таталітарную сутнасьць новага рэжыму. Зрабілі тузін улётак, якія разьвесілі на гістфаку і над шапікам ТБМ (быў такі тады на праспэкце ля Нацбанку).

ККД нашага піяру аказаўся нулявы. У прызначаны час каля рэзыдэнцыі тусаваліся пад дзясятак перцаў. Тупа пастаяўшы, вырашылі рабіць новую акцыю праз пару дзён. Па дапамогу пайшлі ў ЗБС — якое тады было полюсам усёй палітычнай актыўнасьці ва ўнівэры.

У ЗБС была каморка на Бабруйскай. Памятаю, увечары мы сядзелі і ў аўтарскіх пакутах раджалі тэкст «праклямацыі». Ідэю даў Ігар Т., прыгадаўшы нашумелы азаронкаўскі блёкбастэр «Дзеці хлусьні». Адразу нарадзілася назва: «Дзеці хлусьні вяртаюцца». Улётку запусьцілі ў друк.

24 траўня а палове на першую, калі я выйшаў з «нацыяналкі», каля гістфаку стаяў нефіговы натоўп — пад 100—150 чалавек. Усе чакалі загаду, аднак буйных не назіралася. Я шчыра стрымаўся: зранку мяне адфільтравау намдэкана і нагадаў, што ў мяне ўжо ёсьць адна адміністратыўка за восеньскі марш «Хлеб і малако».

### Ты не баран

Сытуацыю выратаваў Борман і яго кампанія. Яны проста шукалі прыгод. ПАПаўцы рушылі наперад, стварыўшы першыя зьвёны ланцуга. За імі пачалі станавіцца іншыя. Узначальваў «дзяцей хлусьні» Сева К., які нёс бээсэсэраўскі штандар на фасон савецкіх жаўнераў падчас Параду Перамогі — нахіліўшы флягштокам уніз. На першым павароце я агледзеўся і афігеў. Гэта была сапраўды эфэктная супэракцыя! Праз некалькі год «Хартыя'97» зробіць яе рэмэйк, але гэта будзе ўжо калька.

Мянты бегалі вакол і ня ведалі, што рабіць. Табун журналістаў. У душы нейкае дзіўнае адчуваньне таго, што ты не баран. Нас шмат.

Здаецца, мы зрабілі два колы, і тут Рамашэўскі распачаў свой, не прадугледжаны сцэнаром, пэрформанс. Каля драмтэатру адбываўся рамонт кляззэту. Тут жа стаяла выпадкова пакінутая будаўнікамі лесьвіца. Борман узьлез па ёй і ўзьняў чырвона-зялены сьцяг над дахам эМЖэ. Студэнцтва сынхронна зацягнула «Мы — беларусы…» і г.д.

Пасьля палотнішча зьнялі і перад камэрамі разарвалі на шматкі. Нехта дастаў запальнічкі і пачаў паліць тканіну. Відовішча было ня вельмі эстэтычнае, але для рэпартэрскіх камэр вельмі прывабнае. Назаўтра «Известия» разьмясьцілі фотку з акцыі на першай старонцы.

Пакуль «дзеці хлусьні» дралі палотнішча на сувэніры, мы з Ігарам пайшлі на «панікоўку». Міма ў напрамку ўнівэрсаму зь відавочнай мэтай прабег герой дня Борман.

Не пасьпеў ён зьнікнуць, як з боку тэатру намалявалася пару аўтобусаў. Адтуль паваліліся амапаўцы. Пачалася першая зачыстка ў сучаснай гісторыі Беларусі: студэнтаў ганялі па парку, зьбівалі і цягнулі ў бусы. Памятаю, як павялі Ігара Т., потым Сашу С. Асабліва эфэктна бралі Андрыеўскага. Ён заступіўся за сваю жонку, нават зьбіў амапаўца. Апошні афігеў. Андрыеўскага цягнулі аж цэлыя два дзецюкі.

Мы зь Ігарам нарэшце апрытомнелі і пачалі фляніраваць у бок Дому афіцэраў, быццам нейкія «левыя». Акурат калі аўтобусы зьехалі, зьявіўся ўласнай пэрсонай Борман. Даведаўшыся, што адбылося ў парку, ён разьвесяліўся і пабег у пастарунак атрымліваць сваю порцыю адрэналіну.

На месцы вінта стаялі нацыяналістычныя бабкі і распавядалі адна адной жахі пра амапаўскі гвалт. Мы паперліся да журналістаў у «сямёрку», дзе толькі і размоў было пра акцыю зь сьцягам. Упершыню пачалі рабіць дзіўныя рэчы — высьвятляць, каго зь сяброў узялі, хто ў якім пастарунку, што рабіць…

Праз год, у 1996-м, гэта стане абсалютнай нармальнай часткай штодзённага жыцьця. Але тады мы яшчэ ня ведалі, што 24 мая 1995 г. было першым днём супраціву дыктатуры. Калі б ведалі, мы б яўна набылі пляшку «Раялю», а так закінуліся мярзотным «Імпэрыялам» і да паловы на адзінаццатую — дэдлайн знаходжаньня ў інтэрнаце — сьпявалі пад гітару.

# Ці сапраўды лібэральныя беларускія «лібэралы»?

Працяг са старонкі 2.

Возьмем, напрыклад, дыскрымінацыю моўную. Паводле азначэньня Амэрыканскага саюзу грамадзянскіх правоў , лібэральнае праваабарончае арганізацыі, моўная дыскрымінацыя азначае, што зь некім абыходзяцца паіншаму толькі таму, што ён ці яна размаўляюць на іншай роднай мове. На жаль, сытуацыі такога кшталту для Беларусі зьяўляюцца, хутчэй, правілам, чым выключэньнем.

Моўная сытуацыя ў Беларусі дэманструе ўсе прыметы моўнае дыскрымінацыі. Беларускамоўныя сутыкаюцца з пашыранай нецярпімасьцю да беларушчыны ў сацыяльнай і дзелавой практыцы. Акрамя таго, жаданьне звузіць сфэру ўжываньня беларускае мовы і сацыяльна абмежаваць яе носьбітаў — клясычны прыклад моўнае сэгрэгацыі. Такая сытуацыя непасрэдна парушае прынцыпы роўнасьці і годнасьці, на якіх грунтуецца лібэралізм. Таму ўціск беларушчыны непрымальны для ўсялякага прыхільніка лібэральнае думкі.

Яшчэ адно значэньне слова «лібэральны» — «здольны разумець праблемы іншых» (слоўнік ангельскае мовы Лонгмана). Пытаньне, ці сапраўды пазыцыя сп.Злотнікава і ягоных аднадумцаў адносна беларушчыны праяўляе дастаткова салідарнасьці зь беларускамоўнымі суграмадзянамі і нецярпімасьці да моўнае дыскрымінацыі, на жаль, мае адмоўны адказ. Назваца лібэралам — мабыць, вялікая спакуса шмат для якіх палітыкаў і грамадзкіх дзеячаў у Беларусі: такое нішто сабе слоўца, мадэрновае, Захадам павявае. Толькі вось дастаткова падстаў для гэтага азначэньня пакуль што праяўляюць вельмі нямногія.

**Сяржук Вінаградаў, Лёндан**

# Беларускі рынак Герхарда Шродэра

Парушэньні правоў чалавека? Нацыяналізацыя прыватнага бізнэсу? Ліквідацыя парлямэнтарызму? Мы на ўсё гэта заплюшчым вочы, толькі пусьціце нас на ваш рынак. Гэта была стратэгія Шродэра ці то на беларускім, ці то на кітайскім напрамку. Пра канцлера, які сыходзіць, піша **Раман Якаўлеўскі**.

Цяпер лідэры двух эўрагігантаў — Нямеччыны і Францыі — перажываюць самы драматычны пэрыяд у сваіх палітычных кар'ерах. Пасьля рэфэрэндуму паводле канстытуцыі ЭС уплыў прэзыдэнта Шырака пойдзе на спад. А пасьля пройгрышу сацыял-дэмакратаў на мясцовых выбарах у зямлі Паўночны Рэйн-Вэстфалія ў Нямеччыне ў верасьні месяць адбудуцца датэрміновыя парлямэнцкія выбары. Паводле разнастайных прагнозаў, пасьля гэтых выбараў улада ў Бэрліне памяняецца. І канцлер Шродэр сыдзе. Так што самы час успомніць пра ягоную ўсходнюю палітыку. У прыватнасьці, у дачыненьні да Беларусі. Да таго, як зрабіцца канцлерам Нямеччыны, Герхард Шродэр доўгі час (1990—1998) узначальваў урад зямлі Ніжняя Саксонія, дзе рэгулярна праводзіцца Гановэрскі кірмаш. У ім заўсёды даволі прадстаўніча ўдзельнічае і Беларусь. І быў момант, калі яго наведаў асабіста Аляксандар Лукашэнка, будучы ўжо ў замежнапалітычнай ізаляцыі. Яго суправаджаў міністар замежных спраў Іван Антановіч. Зьяўляючыся дасьведчаным царадворцам, менавіта ён арганізаваў сустрэчу, літаральна завабіўшы кандыдата ў канцлеры (ужо ішла перадвыбарная кампанія) Шродэра да Лукашэнкі. Атрымаўся вялікі розгалас. Апазыцыя, дый многія Шродэравы аднапартыйцы, рэзка раскрытыкавалі яго. Бурна нэгатыўнай рэакцыі дачакаўся будучы канцлер і з боку процьмы няўрадавых арганізацый, грамадзянскіх ініцыятыў і СМІ. Варта адзначыць, што дзякуючы падтрымцы няўрадавых арганізацый Шродэр перамог тады на выбарах і стаў канцлерам Германіі. Для гэтых арганізацый Лукашэнка быў і застаецца праціўнікам дэмакратыі. Адчуўшы небясьпеку страты галасоў немалой колькасьці выбаршчыкаў, Шродэр быў вымушаны публічна апраўдвацца, называючы гэтую сустрэчу з Лукашэнкам неафіцыйнай і нават выпадковай. Але што было, то было. Лідэра сацыял-дэмакратаў пранесла, і ён зрабіўся



AP

канцлерам. Прагназавалася, што ўплыў няўрадавых арганізацый будзе заўсёды трымаць «у тонусе» новага канцлера, не дазваляючы яму абсалютызаваць у сваёй палітыцы славуты палітычны прагматызм. Маўляў, эканоміка асобна, а палітыка асобна. Як адзначае амэрыканскі палітоляг Чарлз Хэрман, Шродэр зрабіў спробу, якая яму не ўдалася, найбуйнейшага за ўсю пасьляваенную гісторыю ФРГ зьмяненьня палітычнай лініі Германіі. У некрытычным збліжэньні з Масквой грамадзянская супольнасьць Германіі, СМІ і палітычная апазыцыя ўбачылі здраду пэўным каштоўнасьцям. Парушэньні правоў чалавека? Нацыяналізацыя прыватнага бізнэсу? Ліквідацыя парлямэнтарызму? Мы на ўсё гэта заплюшчым вочы, толькі пусьціце нас на ваш рынак. Гэтым жа ратаваньнем свайго рынку Шродэр займаўся на кітайскім напрамку. У поўнай меры гэтую характарыстыку палітоляга можна дастасаваць і да Беларусі. На беларускім рынку прысутнасьць немцаў адчувальная. А па выніках замежнаэканамічнай дзейнасьці беларускае пасольства ў Бэрліне лідзіруе сярод астатніх замежных устаноў. Агульнавядома, якую няпростую гульню за выжываньне вядзе Лукашэнка з расейскім «Газпромам». Усе выдатна разумеюць значэньне беларускага транзыту. Апошнія месяцы адзначыліся прарывам «Газпрому» на ключавым у Эўропе германскім газавым рынку. Робіцца рэальнасьцю стратэгічны германа-расейскі энэргетычны альянс, у якім зацікаўлены як дзелавыя колы, так і вышэйшае палітычнае кіраўніцтва абедзьвюх краін. Гэта прадэманстраваў міжнародны прамысловы Гановэрскі кірмаш, што прайшоў з 11 да 15 красавіка, у якім удзельнічала пад 150 расейскіх прадпрыемстваў і які ўшанавалі сваёй прысутнасьцю Пуцін і Шродэр. Адназначна прарасейскую арыентацыю нямецкіх палітычных і дзелавых колаў ухваляюць ня ўсе. Але ў пераважнай большасьці нямецкія бізнэс-колы выступаюць за энэргетычны і наагул эканамічны альянс з Расеяй. Прычым лепш з кампаніямі, зьвязанамі з Крамлём, як гэта было ў савецкія часы. У Беларусі не зьвязаных з уладай прадпрыемстваў проста няма. Цяпер, фактычна ў перадвыбарнай кампаніі, якая ўжо пачалася ў Нямеччыне, апазыцыя цьвёрда заявіла пра свой намер аднавіць ранейшую палітычную лінію ФРН, апірышчам якой была трансатлянтычная салідарнасьць. Эўропа можа колькі хоча скардзіцца на Амэрыку. Але ў канчатковым выніку ўсім сваім цяперашнім дабрабытам эўрапейцы шмат у чым абавязаны Амэрыцы.

## Гульні розуму

Нядаўна заўважыў цікавую рэч: у гульнях, асабліва дзе трэба нешта выбіраць, беларусам супрацьстаіць вялікі розум.

Ток-шоў «Выбар». Пытаньне «Ці хочаце Вы служыць у войску?» «Цьфу, плёвае пытаньне, — думае вялікі розум. — Маладыя беларусы павінны хацець... Канечне, адкажам так». На экране пачынаюць скакаць лічбачкі — велізарная маса людзей хоча ісьці ў войска.

«Каго б гэта пасласць на «Эўрабачаньне?», — думае вялікі розум. — Мне даспадобы «Аляксандра і Канстанцін». Прагаласую». Скачуць на экране лічбачкі — Натальля Падольская на «Эўрабачаньне» ня едзе.

Праз год зноў «Эўрабачаньне». «За каго прагаласаваць? Гімн нейкай аранжавай рэвалюцыі? Ня наша песьня. Ёй ні бала не даваць!»

Гуляе вялікі розум, доўга, аддана. Ён шчыра верыць, што гульні створаны для перамог і для пераможцаў, што жыцьцё — гэта гульня. І сапраўды, гульня зь вялікім розумам — гульня з сыстэмай — падмяняе сабой рэчаіснасьць, фармуючы сьветаўспрыманьне гульцоў і прымушаючы іх думаць, што па-за ёй нічога не існуе.

Але незалежна ад тыпу гульні слабы ўдзельнік не заўжды застаецца пераможаным. Шматлікія паразы выклікаюць крыўду, і яна ўсё запасіцца. Што робяць баксэры, якіх увесь час перамагаюць? Некаторыя пачынаюць зацята трэніравацца, каб стаць больш загартаванымі, больш моцнымі, для таго каб наступным разам «сабрацца» і павесьці на рынгу Вялікую Гульню па сваіх правілах. Часта перамога — непрадказальна, але чакана — прыходзіць да такіх спартоўцаў. Галоўнае — стаць больш моцным, упартым, хітрым і паверыць у сябе, пераставшы баяцца суперніка.

**Алесь Аўчарэнка**

## Адзіны кандыдат — сьцяг беларускае рэвалюцыі

Адзіны кандыдат мусіць стаць *сьцягам* беларускай рэвалюцыі. Праўда, на вялікі жаль, большасьць дэмакратаў мяркуе, што гэты самы кандыдат возьмецца ды сам зробіць рэвалюцыю. Але рэвалюцыю мусім рабіць мы ўсе РАЗАМ з тым самым адзіным!

Сотні тысяч людзей месяц правялі на ўкранскім Майдане. А ў іх, напэўна, таксама былі дзясяткі прычын, каб застацца дома і вырашаць асабістыя праблемы. Але яны пайшлі на галоўную плошчу Кіева дзеля дасягненьня аднае, але самае галоўнае мэты — скінуць дыктатуру. Украінцы не чакалі, што за іх усё зробіць Юшчанка. Яны зрабілі будучага прэзыдэнта сваім сьцягам і ня кінулі гэты сьцяг у цяжкі момант. За што і атрымалі ганаровую перамогу.

Таму калі мы, беларусы, усё ж хочам людзьмі звацца, таксама мусім усьвядоміць, што ня варта чакаць, што гэта за нас зробяць іншыя.

А сьцяг беларускай рэвалюцыі ў выглядзе адзінага кандыдата абавязкова будзе. Хто стане адзіным? На гэтае пытаньне дасьць адказ Кангрэс дэмакратычных сілаў. Але перш, чым вылучыць адзінага кандыдата, Кангрэс абавязкова павінен улічыць вынікі галасаваньня рэгіянальных сходаў. На гэтым місія Сходу скончыцца. Далей справа будзе за ўсімі намі.

Яшчэ ёсьць час на тое, каб распляноўваць сваю дзейнасьць з улікам прэзыдэнцкай кампаніі і асабіста *сваёй ролі* ў ёй! Неабходна зразумець кожнаму сваю асабістую важнасьць у гэтым працэсе і тое, у якой краіне мы хочам жыць. Ад гэтага залежыць яшчэ тое, што мы будзем расказваць нашым нашчадкам і што кожны з нас зробіць асабіста дзеля іхняй будучыні і свабоды!

**Сяржук Бахун, Берасьце**

## Тэст як форма кантролю, або дайце кнігу скаргаў

Шкада, што ўступныя пытаньні цяпер праходзяць без апэляцый. Апэляцыя нічога не мяняла, але хоць давала магчымасьць даведацца, наколькі няправільна цябе ацанілі.

На тэставаньні такога ня будзе. Праўда, нас супакойваюць, што мы зможам пагледзець, у якіх заданьнях дапусьцілі памылкі. Паглядзець мы і сапраўды зможам, але ці многа знойдзецца людзей, якія, убачыўшы нумар заданьня, успомняць яго зьмест? Усе помняць, што заданьняў у тэсьце па беларускай мове было 40, і таму, знайшоўшы свае вынікі ў сеціве, зьдзіўляюцца: адкуль узялося сорак першае заданьне, што ўсе выканалі няправільна?

«Нічога страшнага, што няма апэляцыі, затое тэсты — найбольш справядлівая форма кантролю!», — крычаць прыхільнікі тэставаньня. Людзі, якія хоць зрэдку здымаюць ружовыя акуляры, кажуць, што тэсты не выключаюць, але зьніжаюць узровень карупцыі. Скептыкі мяркуюць, што карупцыя была і будзе. Тэсты зь неба ня падаюць. Іх складаюць людзі. Стоячы ў натоўпе пад дзьвярыма ўнівэрсытэта, можна пачуць: «Мама майго аднаклясьніка складае тэсты». Можна нават убачыць, як гэтыя самыя тэсты заносяць у памяшканьне.

Тэсты, маўляў, выключаюць элемэнт выпадковасьці. Спрэчна. Можна выпадкова тыкнуць пальцам у правільны адказ. Можна выпадкова сесьці з разумным чалавекам. А некаторыя разумныя людзі бываюць настолькі добрымі, што бяруць чужы тэст і пачынаюць яго выконваць. Такое было на рэпэтыцыйным тэставаньні.

Што можна сказаць у абарону тэстаў? Гэта абсалютна бясстрэсавая форма іспытаў. Няма нэрвознасьці, напружанасьці, абітурыенты адчуваюць сябе спакойна і расслаблена. Але тэсты моцна стамляюць, калі ты ставісься да гэтага сур'ёзна, або нават шакуюць (прыклад — тэставаньне па хіміі).

Такім чынам, тэсты не ліквідуюць ні выпадковасьці, ні карупцыі, ні стрэсаў. З апэляцыяй ні да кога ня зьвернесься. Застаецца толькі запытаць кнігу заўваг і прапаноў.

**Алена Карп, Карэлічы**

## І Лазара запрасілі

На чарговым пасяджэньні структур т.зв. эўрарэгіёну (памежныя раёны Беларусі, Латвіі і Літвы) было дамоўлена заняцца арганізацыяй і ажыцьцяўленьнем «эўрамаршруту». Цікавая ідэя мае на мэце распрацоўку зьмястоўнага падарожжа па краінах Эўропы, удзельнікі якога маглі б уласнымі нагамі (чытай — на роварах) прамерыць «паў-Эўропы», каб пазнаёміцца з прыродай і гісторыяй розных краін, сучасным жыцьцём насельнікаў ды ўмацаваць здароўе ды хораша адпачыць.

Да ўдзелу ў праекце запрошана і Верхнядзьвіншчына. Ад нас былі запатрабаваны адпаведныя паперы са зьвесткамі пра турысцкія магчымасьці раёну. Што і казаць, Верхнядзьвіншчына мае найцікавейшую гісторыю, у нас захаваліся цалкам або фрагмэнтамі выдатныя помнікі архітэктуры, а імя слыннага земляка Івана Чэрскага вядомае ўсёй плянэце. Што ўжо казаць пра прыроду! Па чысьціні сваіх рэк, азёраў ды лясоў Верхнядзьвінскі край не саступае запаведным мясьцінам. Застаецца толькі... А вось застаецца тое, што ў адказ на спакусьлівую прапанову выклікае толькі ўздых.

Рэч у тым, што турысцкі маршрут па-эўрапейску патрабуе і эўрапейскіх умоў для падарожнікаў. У пагадненьні растлумачана, што гэта азначае: па ўсім маршруце мусіць быць у наяўнасьці спэцыяльная дарожка для руху на роварах; да паслуг вандроўнікаў павінны быць гатэлі, кемпінгі і іншыя абсталяваныя мясьціны для нармальнага адпачынку, а таксама пункты харчаваньня і гігіены, назіральныя вышкі, інфармацыйныя шчыты, пункты сувязі...

Пакуль што ў нас адпачыць можна хіба што ў рэдкіх альтанках, а гігіенічныя працэдуры справіць пад прыдарожным кустом. У гатэлі райцэнтру прывыклыя да сучаснага камфорту эўрапейцы пачуваюцца, нібы мы ў вігваме індзейцаў. Пераскочыць на новую прыступку цывілізаванай турысцкай інфраструктуры Дрыса і да яе падобныя маглі б, толькі разбагацеўшы на добрыя грошы. Ды дзе іх узяць?

А дзе возьмуць нашы суседзі — латышы ды літоўцы?

Іх гэтае пытаньне ўжо не пужае. Як чальцы Эўразьвязу былыя «савецкія сёстры» атрымаюць неабходную матэрыяльную падтрымку ў багатай эўрапейскай касе. Нам застаецца спадзявацца на спонсараў. Ды дзе яны? Быў некалі Сорас, былі іншыя шчодрыя «буржуі», ды ім паказалі на дзьверы, каб не разбэсьцілі беларусаў сваёй варожай спажывецкай ідэалёгіяй. Цяпер выходзім на эўрапейскую сцэну гордыя, хаця і без штаноў.

**А.Буры, Верхнядзьвінск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# школы замест турмаў

Аўтары прыпыняюць рубрыку «Наша справа» ў знак салідарнасьці з студэнтамі–галадоўнікамі.

Галадуюць: Зьміцер Чарткоў, Аляксандар Вінаградаў, Яўген Ваўкавец, Сяржук Мурашка, Павал Каранюхін (Жодзіна), Сяржук Марчык (Баранавічы), Міхась Кандрашоў (Барысаў), Зьміцер Дашкевіч, Артур Фінькевіч (Менск), Валер Мацкевіч (Бабруйск), Ігар Шчыкарэвіч (Кіеў).

Яны патрабуюць аднаўленьня студэнтаў, выгнаных з навучальных установаў па палітычных матывах.

# Гісторыя

Прыгожае тое, што радавала б нас, калі б было нашым, але застаецца прыгожым нават тады, калі належыць іншаму. Так піша пра прыгажосьць у сваёй найноўшай кнізе **Ўмбэрта Эка**.

## 1. Прыгажосьць правакацыі ці прыгажосьць спажываньня?

Уявім сабе спэцыяліста па гісторыі мастацтва з будучыні ці дасьледчыка, які прыбывае з касьмічнай прасторы. Яны задаюць сабе пытаньне: якая ідэя прыгажосьці дамінавала ў XX ст.? Апошнім часам мы ня робім нічога іншага ў сваёй вандроўцы па гісторыі прыгажосьці, апроч задаваньня падобных пытаньняў у дачыненьні да Старажытнай Грэцыі, Рэнэсансу, пачатку і канца XIX ст. У межах аднаго пэрыяду заўжды маглі суіснаваць, напрыклад, нэаклясычны стыль і эстэтыка ўзьнёсласьці, аднак, гледзячы «здалёк», заўсёды здаецца, што ў прыгажосьці, уласьцівай кожнаму веку, можна выявіць пэўныя супольныя рысачкі і пэўныя прынцыповыя супярэчнасьці.

Можа таксама стацца, што — зноў жа, калі глядзець «здалёк» — інтэрпрэтатары будучыні вылучаць нешта самае характэрнае для XX ст. і прызнаюць, напрыклад, рацыю Марынэцьці, які казаў, што сапраўднай Нікай Самафракійскай мінулага стагодзьдзя быў прыгожы гоначны аўтамабіль, а Пікаса ці Мандрыяна, магчыма, праігнаруюць. Мы ня можам глядзець з такога далёка; можам толькі задаволіцца заўвагай, што першая палова XX ст., сама пазьней да 60-х гадоў (потым сказаць так будзе цяжэй), была тэатрам драматычнай барацьбы паміж прыгажосьцю правакацыі і прыгажосьцю спажываньня.



УМБЭРТА ЭКА — сусьветна вядомы пісьменьнік, філёзаф і навуковец-сэміётык. Нарадзіўся ў Александрыі — той, што ў Эгіпце, а не на Капыльшчыне. У 1975 атрымаў доктарскую ступень у Мілянскім унівэрсытэце. Выкладаў, працаваў на тэлебачаньні. Зьяўляецца віцэ-прэзыдэнтам Міжнароднай асацыяцыі сэміятычных дасьледаваньняў. Яго раманы «Імя Ружы», «Ківач Фуко», «Баўдаліна» папулярныя ва ўсім сьвеце.





**СТЭРЭА ЛІЗА — шэдэўр Леанарда, адаптаваны Эндзі Ўоргалам. Уоргалаву Мэрылін Манро называюць Монай Лізай XX ст.**

## 2. Авангардызм, ці прыгажосьць правакацыі

Прыгажосьць правакацыі прапаноўвалі розныя авангардысцкія рухі і экспэрымэнтатарскія мастацкія плыні — ад футурызму да кубізму, ад экспрэсіянізму да сюррэалізму, ад Пікаса да вялікіх майстроў абстрактнага мастацтва і ня толькі.

Авангарднае мастацтва ня ставіць праблемы прыгожага. Яно моўчкі прымае за аксіёму, што новыя творы па-мастацку «прыгожыя» і павінны прыносіць такое самае здавальненьне, зь якім сучаснікі глядзелі на карціны Джота ці Рафаэля, але робіцца так менавіта таму, што авангардысцкая правакацыя ламае ўсялякія эстэтычныя каноны. Мастацтва ўжо ня ставіць сабе на мэце наданьне твору натуральнай прыгажосьці і зусім не зьбіраецца выклікаць супакоеную асалоду ад сузіраньня гармонічных формаў. Наадварот, яно хоча навучыць глядзець на сьвет іншымі вачамі, радавацца звароту да архаічных ці экзатычных мадэляў — сьвету сну ці фантазій разумова хворых асоб, відзежаў, выкліканых наркотыкамі, пераасэнсаваньняў матэрыі, зьмяшчэньня бытавых прадметаў у новыя, шакуючыя кантэксты (дадаізм, рэды-мэйд), імпульсаў несьвядомага.

Толькі абстракцыянісцкае мастацтва адрадзіла ідэю геамэтрычнай гармоніі, што нагадвае эстэтыку прапорцый. Бунтуючы супраць залежнасьці, ці супраць прыроды, ці супраць штодзённага жыцьця, яно прапанавала чыстыя формы — ад геамэтрыі Мандрыяна да вялікіх монахраматычных палотнаў Кляйна, Ротка і Манзоні. Кожнаму, хто наведваў выставу ці музэй у згаданы пэрыяд, напэўна, даводзілася чуць, як глядачы, стоячы перад абстракцыянісцкай карцінай, пыталіся: «Што на ёй, уласна, намалявана?» або «Хіба гэта ўвогуле мастацтва?». А затым нават гэтае «нэапіфагарыйскае» вяртаньне да эстэтыкі прапорцый і лічбаў пайшло насуперак сучаснаму ўспрыманьню, насуперак уяўленьню, якое звычайны чалавек мае аб прыгожым.

Існуе, урэшце, безьліч плыняў сучаснага мастацтва (хэпэнінгі, у якіх мастак надразае ці калечыць уласнае цела, паказ перад публікай сьвятлавых ці гукавых зьяў), дзе пад знакам мастацтва адбываюцца, хутчэй, цырымоніі з рытуальным адценьнем, што не адрозьніваюцца ад старажытных містычных абрадаў, мэтай якіх было не сузіраньне чагосьці прыгожага, а, хутчэй, рэлігійны досьвед, няхай нават гаворка ідзе пра рэлігійнасьць прымітыўную і цялесную, у якой багі не прысутнічаюць.

З другога боку, падобную прыроду маюць музычныя ўражаньні, якія велізарныя натоўпы перажываюць на дыскатэках ці рок-канцэртах, дзе сярод бліскаваньня сьвятламузыкі і аглушальных гукаў увасабляецца на практыцы пэўны спосаб «быцьця разам» (чаму нярэдка спадарожнічае прыняцьце ўзбуджальных рэчываў). Гэта можна нават здавацца прыгожым пабочнаму назіральніку, але ня ўдзельніку. Апошні таксама можа гаварыць пра «прыгожае перажываньне», але ў тым сэнсе, у якім гаворыць пра прыгожае плаваньне, прыгожую язду на машыне ці поўны асалоды палавы акт.

Больш няма аднае моды і аднаго варыянту характава. Адбываецца оргія талерантнасьці. Стылі зьмяшаліся канчаткова.



**КЛЯСЫЧНАЯ АНГЛАСАКСОНСКАЯ ПРЫГАЖОСЬЦЬ** Кейт Мос.

## 3. Прыгажосьць спажываньня

Наш госьць з будучыні не пазьбегне яшчэ аднаго цікавага адкрыцьця. У тых, хто наведвае выставы авангарднага мастацтва, хто купляе «незразумелыя» скульптуры ці ўдзельнічае ў хэпэнінгах, адзеньне і прычоскі цалкам адпавядаюць агульнапрынятым канонам моды, яны носяць джынсы ці фірмовыя транты, карыстаюцца макіяжам паводле ўзораў, што прапагандуюцца глянцавымі часопісамі, кіно, тэлебачаньнем ці прэсай. Яны арыентуюцца на ідэалы прыгажосьці, што прапануюцца сьветам камэрцыі і спажываньня, супраць якога больш як паўстагодзьдзя змагалася мастацтва авангарду. Як інтэрпрэтаваць гэтую супярэчнасьць? Не спрабуючы яе вытлумачыць, можам канстатаваць, што яна тыповая для XX ст.

Госьцю з будучыні давядзецца цяпер прыгледзецца, якую мадэль прыгожага прапануюць

# прыгажосьці

ЭВАЛЮЦЫЯ МІКІ МАЎСА.



1928. Шкіпэр-рамантык.



1950. Сьвецкі леў.

1980. Танцор дыска.








ПРЫГАЖОСЬЦЬ ЗА ЛЮБЫЯ ГРОШЫ. Той, хто ня можа набыць прыгажосьці аўтамабіля «Мазэрацьці» (справа), задаволіцца прыгажосьцю «Міні Морыса».

мас-мэдыя, і ён адкрые для сябе, што праз усё стагодзьдзе праходзіць падзел свайго роду двайной цэзурай.

Першая датычыць кантрасту паміж мадэлямі на працягу аднаго і таго ж дзесяцігодзьдзя. Напрыклад, кіно прапанавала ў адзін і той жа час вобраз «фатальнай жанчыны», увасоблены Грэтай Гарба і Рытай Гэйварт, і тыпаж «суседзкай дзяўчыны», які рэалізавалі Клёдэта Кальбэр і Дорыс Дэй.

Прапанавала — у якасьці героя вэстэрнаў — масіўнага, мужнага Джона Ўэйна і лагоднага, трохі сьпешчанага Дастына Гофмана.

У адзін і той жа час узводзіліся на п'едэстал Гары Купэр і Фрэд Астэр, прычым стройны Фрэд танчыў на экране з каржакаватым Джынам Келі.

Мода прапанавала ўсеагульнай увазе пышныя жаночыя строі (як у фільме «Рабэрта») — і адначасова андрагінічныя мадэлі Како Шанэль.

Мас-мэдыя, у духу поўнай дэмакратыі, прапануюць узоры прыгажосьці як для тых, каго прырода надзяліла арыстакратычнай прывабнасьцю, так і для грубых формаў жанчыны-рабочай: шчуплая Одры Гэпбэрн уяўляе сабой прыклад для тых, хто ня можа дасягнуць «гіпэртрафаванай фізычнасьці» Аніты Экбэрг; для тых, хто не валодае рафінаванай мужчынскай прыгажосьцю Рычарда Гіра, ёсьць пачуццёвае абаяньне Аль Пачына і сымпатычная пралетарскасьць Рабэрта Дэ Ніра. І нарэшце, той, хто ня можа набыць прыгажосьці аўтамабіля «Мазэрацьці», задаволіцца прыгажосьцю «Міні Морыса».

Другая цэзура расшчапляе ўсё стагодзьдзе. Калі сьцісла: ідэалы прыгажосьці, прэзэнтаваныя мас-мэдыя 1960-х, перагукающца з прапанованымі «старэйшых» мастацкіх твораў. Такія прыгажуні, як Францэска Бэрціні ці Рына Дэ Лігуора, былі блізкімі сваячкамі томных кабет Д'Анунцыё, а жаночыя постаці, якія зьяўляюцца ў рэкляме 1920—1930-х, нагадваюць чахлых прыгажунь мадэрнізму, ар-нуво ці ар-дэко. У рэкламе розных тавараў можна заўважыць матывы футурызму, кубізму і сюррэалізму.

У мультфільме «Ў пошуках Нэма» відаць уплыў стылю арнуво, у той час як урбаністыка іншых сьветаў у мультфільме «Флэш Гардон» нагадвае ўтопіі мадэрнісцкіх архітэктараў, такіх, як Антоніё Сант-Элія, і нават экстрапалюе формы ракет будучыні. Мультфільмы з Дыкам Трэйсі выражаюць паступовае прывыканьне да авангарднага мастацтва. Дастаткова паглядзець мульцікі пра Мікі Маўса з 1930-х да 1950-х, каб убачыць, як карцінка зьмяняецца ў адпаведнасьці з разьвіцьцём пануючай эстэтыкі ўспрыманьня. Але калі, з аднаго боку, поп-арт уваходзіць ва ўжытак на ўзроўні наватарскага мастацтва і правакацыі, вобразаў сьвету гандлю, прамысловасьці і мас-мэдыя, а з другога, «Бітлз» надзвычай умела абнаўляюць традыцыйныя музычныя формы, бездань паміж мастацтвам правакацыі і мастацтвам спажываньня меншае. Больш за тое, калі здаецца, што існуе яшчэ якаснае адрозьненьне паміж мастацтвам «высокім» і мастацтвам «папулярным», то ў фазе, што акрэсьліваецца як постмадэрнісцкая, высокае мастацтва прапануе новыя творы, якія парушаюць старыя фармальныя рамкі, і адначасова такія, якія, наадварот, наўмысна трымаюцца старых фармальных рамак і ўзнаўляюць традыцыі. У сваю чаргу сродкі масавай інфармацыі не навязваюць ужо ніякага стандарту, адзінага ідэалу прыгажага. Яны могуць зьвярнуцца, нават у рэкламным роліку, які пражыве тыдзень, да любых набыткаў авангардызму і адначасова вярнуць ва ўжытак мадэлі 1920-х, 1930-х, 1940-х, 1950-х, аж да паўторнага адкрыцьця нямодных дызайнаў аўтамабіляў сярэдзіны мінулага стагодзьдзя. Зноў прапануецца іканаграфія XIX ст., казачны рэалізм, вартыя Юноны формы Мэй Уэст і анарэктычная прывабнасьць сёньняшніх мадэляў.

Чорная прыгажосьць Наомі Кэмпбэл і англасаксонская прыгажосьць Кэйт Мос; прывабнасьць традыцыйнай чачоткі, як у фільме «Кардэбалет», і футурыстычнай, зімнай архітэктуры «Лаўца андроідаў»; фатальныя жанчыны зь безьлічы тэлеперадач і рэклямных ролікаў ды дзяўчаты вады і мыла а-ля Джулія Робэртс і Кемэран Дыяз; Рэмба і Плятынэта; каротка стрыжаны Джордж Клуні і новыя кібаргі, што размалёўваюць твары ў мэталічныя колеры і ператвараюць валасы ў лес каляровых іголак ці голяць сабе галовы. Наш дасьледчык з будучыні ўжо ня зможа вылучыць эстэтычнага ідэалу, распаўсюджванага СМІ ў XX ст. і пазьней. Яму давядзецца капітуляваць перад гэтай оргіяй талерантнасьці і поўнага сынкрэтызму, абсалютнага і нястрымнага політэізму прыгажосьці.



АФРЫКАНСКАЕ ХАРАСТВО Наомі Кэмпбэл.






РОЗНАЯ ПРЫГАЖОСЬЦЬ . Дастына Гофмана (зьлева) і Джона Ўэйна— дзьве мадэлі прыгожага.

гумарэска

# Сэрца танка

**ПАВАЛ КАСЬЦЮКЕВІЧ**

Пяцьдзясят сем год таму па гэтых пагорках за-хопнікі рваліся да сэрца нашай Радзімы — Ерусаліму. Цяпер тут, ля вунь таго манастыра маўчальнікаў, знаходзіцца танкавы музэй…

Густа нафарбаваная гід праводзіла экскурсію для новых рэпатрыянтаў з краін СНД. У аўтобусе былі выхадцы з Украіны, Расеі, Прыбалтыкі і Юра Зайцман.

— Ну, за сэрца наша, за Ерусалім, — сказаў Юру сусед з Харкава. З кплівага тону экс-харкаўчаніна стала зразумела, што найпазьней праз год ён будзе стыкаць чарку за новае сэрца сваёй Радзімы — хутчэй за ўсё, за Манрэаль. Гарэлка была на «пяцёрку» па стобальнай сыстэме. Аўтобус спыніўся.

— Сама не куру і вам ня раю, — гід няўхвальна паглядзела на яшчэ «адтуль» прывезены пачак «Горадні». — І да таго ж ня нашай вытворчасьці.

Юра сарамліва схаваў цыгарэты. Стала ніякавата. Юра пачуўся здраднікам сваёй новай Радзімы праз тое, што правёз пяць блёкаў імпартнай «Горадні» ды такім чынам не падтрымаў айчынных вытворцаў тытуню. Але ж і старой Радзіме ён здрадзіў які месяц назад, калі памяняў свой сіні «пашпарт-паспорт-passport» на ізраільскі «тэўдат зэгут» у блакітнай вокладцы. Тут яшчэ ў галаву ўроіліся недарэчныя думкі пра чырвоную кніжыцу зь сярпом і молатам, якую ён здаў у АВІР пару год таму. Колькасьць здраджаных Юрам радзім павялічвалася да трох.

— Панове! Мы знаходзімся ў музэі пад адкрытым небам. Тут выстаўлены танкі, якія бралі ўдзел у араба-ізраільскіх войнах. Доўгі шлях прайшла наша краіна, перш чым…

Дагледжаныя ізраільскія танкі-вэтэраны амэрыканскай і французкай вытворчасьці прыгожа шыхтаваліся на вялікім пляцы. Пераможна сьвідравалі рулямі неба. Зіхацелі, як велізарныя смагарды, сьвежапафарбаванай бранёю.

— …але ня ўсе на Блізкім Усходзе жадаюць міру, панове!

Гэтак, пад энэргічнае ціўканьне гіда, група экскурсантаў пакрысе наблізілася да задворкаў музэю. Тут было брудна, ды моцны вецер ганяў газэціны і ашмёткі цэляфану.

— А гэта выстаўлена зброя нашых ворагаў, — растлумачыла гід.

Танкі, якія стаялі на задворках, вылучаліся сярод астатніх — занядбаныя, завэдзганыя гразёй, пабітыя плямамі ржы. Супрацоўнікі музэю абы-як пафарбавалі іх у недарэчны чырвоны ці блакітны колеры. Зброі ворагаў тут яўна не любілі, бо танкі на заднім двары былі падобныя да бяздомных клоўнаў.

Неспадзёўкі Юра заўважыў, што ворагі нашы ваявалі на танках нашай вытворчасьці — на легендарнай «Тэ-трыццацьчацьвёрцы», на «Т-54» ды на «Т-62».

Падыходзіць бліжэй. Пяшчотна вядзе рукою па ржавай гусеніцы. Лашчыць позіркам адтуліны для даўно адкручанай оптыкі. Па-сяброўску ляпае па дзіравым паліўным баку. І забываюцца злыбеды. І нясецца Юра назад у часе. Ён — зусім яшчэ зялёны спэцыяліст на заводзе па вырабе аптычнага аснашчэньня для танкаў. Водары п'янкое вясны — чатырохкапеечных піражкоў зь яйкам, самаробных джынсаў з Грушаўкі, леташняга лісьця з зацішных куткоў Батанічнага саду — усе водары разам і кожны зь іх паасобку мяшаюцца з пахам алівы, які точыцца з танка, прыгнанага для экспэрымэнтальных распрацовак проста ў цэх. І складаецца ў паветры магічная формула парфумы «Менск, 70-я», парфумы, якую цяпер рэдка дзе можна дастаць — паспрабуйце хіба што ў летуценных аддзелах мройных унівэрмагаў гандлёвага аб'яднаньня «Настальжыкаап».

Вандроўкі ў часе спыніў чырвоны колер. Адкуль гэтая ідыёцкая афарбоўка, чаму ржа на брані, за што ж яму такая зьнявага? Нявыкрутка з цыгарэтамі, наяўнасьць мноства радзім, але адсутнасьць сапраўднага дому, выгляд згвалтаванай бранятэхнікі (яго бранятэхнікі!) канчаткова спляліся ў Юравым сэрцы шчымлівым клубком крыўды і неспатольнага жалю. Аднак не за сябе і не да сябе. Дзіўным чынам пачуцьці перанесьліся на танк. Юру стала шкада жалезную машыну, як чалавека, як уласнае дзіцятка. І гэтае шкадаваньне вырвалася вонкі. Юра загаласіў:

— Родненькі, любанькі, чаго ж ты да Ерусаліму не дайшоў?!

І моцна абняў рулю.

Гід ажна папярхнулася.

— А-ах ты, прадажнік… Наймiт… Я выганяю вас з экскурсіі!

Але Юры было не спыніць, не стрымаць. З порсткасьцю, якой ніхто не чакаў ад сталага чалавека, ён ускараскаўся на гусеніцу, рыўком адчыніў непрываранены люк і зьнік у танкавым чэраве. Праз імгненьне адтуль данеслася:

— Хрэн я адсюль вылезу!

Барвовая ад разьюшанасьці, гід кінула групу ды пашыбавала па паліцэйскіх, якіх хапала на тэрыторыі музэю, бо сюды на ўрачыстасьці, прысьвечаныя Дню Незалежнасьці, прыехаў сам прэм'ер-міністар. Выслухаўшы ўвесь аповед, сяржант весела закрычаў у рацыю:

— Шымон, Шымон, у нас тут арабскі танк зь нейкім шаленцам! Прыяжджай — парагочам.

«Я так і ведаў — яны ўжо на танках, — сказаў сам сабе глухаваты Шымон, недачуўшы больш за палову. Грубым паліцэйскім ботам ён раструшчыў недапаленую цыгарэту. — Лезуць, шагіды. Мала ім тут усыпалі ў косьці 57 год таму». Шымон, былы артылерыст, удзельнік чатырох войнаў, заўсёды чакаў ад «іх» нечага такога. І ў этэр панеслася: «Арабскі танк… прэм'ер-міністар… замах… джыгад… тэрарысты…»

Не марнуючы ні хвілі, Генштаб паслаў у бок музэю БТРы і войскі спэцпрызначэньня. Гэтымі сьвяточнымі днямі ў Генштабе штохвіліны чакалі ад «іх» нечага такога. Уся краіна чакала нечага такога. Руйнуючы агароджу сумежнага з музэем манастыра і прасуючы коламі кветнік ігумена, БТРы абкружылі тэрактыўны танк.

Тым часам, седзячы ў кабіне, Юра пачаў сьпяваць. Выбар паў на «Перапёлачку». Словы Юра ведаў кепска — з усёй песьні адно двухрадкоўе:

Як у перапёлкі забалелі крылцы,
Ты ж мая, ты ж мая, перапёлачка.

Каб было што сьпяваць, памяняў другім разам «крылцы» на «дзюбку». Потым — «вочкі» на «ручкі». Калі скончыліся часткі цела, Юра перайшоў на апяваньне ўнутраных органаў дашчэнту хворай птушкі — у перапёлкі па чарзе пачалі балець ныркі, глянды і печань. Гукі песьні, перакручаныя і ўзмоцненыя сьценкамі танка, несьліся над музэем ваяўнічымі мантрамі садамхусэйнаўскіх легіёнаў.

Прадстаўнік асобага аддзелу «Шабака» па перамове з тэрарыстамі — чорныя акуляры на арліным носе — накіраваў у бок Юравага танку мэгафон. Гучнагаварыцель засыкаў, і адтуль вырвалася:

— Салям алейкум!

— Як у перапёлкі забалелі зубы…

«Тэрарыст на перамовы не ідзе, пагражае», — нэрвова панеслася ў этэр. Прэм'ер-міністра з усёй сьвітаю тэрмінова эвакуявалі ў сутарэньне манастыра маўчальнікаў. Ігумен, разьюшаны грубым уварваньнем, закусіў кулак, каб не парушыць зароку маўчаньня. У неба паднялася эскадрылья «Ф-16» і верталёт.

Праз сем кольцаў ачапленьня дарэмна намагалася прарвацца гід:

— Панове! Ён, канечне, здраднік, але не падумайце па ім страляць. Гэта негуманна.

Нейкі зух са спэцпрызнача скруціў гіда і сілаю пацягнуў упрочкі. Гід абурылася:

— Хлопцы, што вы робіце? Я ж свая.

Але хлопец толькі мацней учапіўся ў гіда і нават неўпрыкмет піхнуў яе прыкладам у сьпіну. Гід атарапела — нашы білі сваіх.

Песьня спынілася, і з танка пачулася:

— Адпусьці гіда, гад! Зайцман жартаваць ня любіць.

І прадоўжыліся сьпевы.

Гукаўлоўныя рэтрансьлятары імгненна перасьлалі Юравы словы ў Генштаб, дзе група стратэгічных перакладчыкаў пераклала іх на іўрыт («тэрарыст выстаўляе ўмовы»). Праз дваццаць сэкундаў гіда адпусьцілі. А праз семдзесят дзеля ўсякай бяды на баявую варту выйшлі тры атамныя субмарыны.

— Як у перапёлкі забалелі жабры…

Турнуўшы манахаў разам з ігуменам, у кельлях заселі снайпэры. Запанавала злавесная ціша. Нешта павінна было адбыцца.

І тут зьнянацку ажыў этэр: «Ігумен манастыра маўчальнікаў… прэм'ер-міністра… за горла… «Задушу», — крычыць… і душыць, тэрарыст!..»

Калі ўсе разьехаліся, разьляцеліся ды расплыліся ратаваць прэм'ера, ля танка засталіся двое: жаўнер унутраных войскаў, каб вартаваць, і гід з размазаным ад сьлёз макіяжам.

— Аб чым ён сьпявае? — спытаўся жаўнер ды павярнуў галаву ў бок жанчыны. Нізкае сонца асьвяціла яго смуглы твар.

Гід уважліва паглядзела на жаўнера і глыбока зацягнулася пазычанай пэлмэлінай.

— Аб, аб… Табе не зразумець.

Потым ціхенька дадала:

— І мне таксама…

Паміж Аялёнскай далінаю ды падножжам Ерусалімскіх гор з чырвонага ў жоўтыя яблыкі танка неслася Юркава песьня, бясконцая і аднастайная, як Юдэйская пустэльня. А ў мора, дзе дрэйфуе выспа Кіпр, распаленай дзесяцішэкелевай манэтаю закацілася-завалілася вечаровае сонца.

— …Як у перапёлкі забалела сэрца…

**АДАМ ГЛЁБУС**



## Сучасьнікі

### 1978—2005. Лось і крыж

Дудар Алесь Лось завёз у касьцёл крыж, той самы крыж, які мы разам зьнялі са сьцяны ў опсенскім соборы ў 1978 годзе. Тады касьцёл быў ператвораны ў склад будаўнічых матэрыялаў і ўгнаеньняў. Укрыжаваньне на тым складзе выглядала недарэчна. Вялікае, пад два мэтры, яно захоўвалася ў кватэры маіх бацькоў. У нас была дамоўленасьць, калі касьцёл вернецца да вернікаў, мы завязём крыж у Опсу. На пачатку 1990-х у касьцёле аднавіліся службы. Лось прыехаў да мяне на машыне, мы загрузілі крыж і накіраваліся ў Опсу. Мы зь Менску выехаць не пасьпелі, як аўтамабіль заглух. Алесь выклікаў аварыйную службу, а я вярнуўся дамоў. Лось доўгі час працаваў у Польшчы ды Нямеччыне, і мы ня бачыліся. Я ніколькі не сумняваўся, што крыж у Опсе. Алесь завёз крыж, але толькі праз два гады, пасьля таго, як забраў яго з дому маіх бацькоў. Ксёндз Мякіна вельмі ўзрадаваўся вяртаньню рэліквіі, бо ніводнай рэчы, ніводнага абраза опсенцы захаваць не змаглі. Вернікі нешта-нейкае захоўвалі па хатах, а калі ім вярнулі касьцёл, адразу ж папрыносілі ўсё касьцельнае ў сабор. Але прынесенае згарэла, і згарэла не выпадкова. Мясцовыя камсамольцы-пярэваратні, прынамсі, так іх назваў Мякіна, патрабавалі ад уладаў забраць касьцёл і зрабіць у ім дыскатэку. Улады муляліся. Беларускія ўлады заўсёды муляюцца. Тады пярэваратні-камсамольцы зрабілі напад на сабор. Уночы яны ўварваліся ў касьцёл, павыцягвалі на двор усё, што там было, і падпалілі. Чамусьці, Лася і Мякіну вельмі дзівіў сучасны вандалізм. На іх думку, наш час ня мусіць вызначацца падобнымі гвалтамі. Але я прытрымліваюся больш пэсымістычных поглядаў на чалавека. Адзінае, на чым мы сышліся: укрыжаваньне выратавана невыпадкова. Яно мусіць вісець каля ўваходу. Яго ня трэба паднаўляць і рэстаўраваць, каб вернікі бачылі, што культавыя рэчы таксама маюць свой лёс і таксама здатныя трываць і перажываць зьдзек і пакуты.

*27.03.2005, 14:16*

# Знакі прыпынку



**УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ**

* * *

Тут непадалёку ў бок Ramsinniemi (у Хэльсынкі, Фінляндыя) гатэльчык ёсьць невялічкі, мы са Стасем (унукам) праз лясок туды на мора ходзім. Ад гатэльчыка спускаесься на пірс дашчаны, зь якога даў нырца — і паплыў… Зручней, чым ісьці да глыбіні па камянях ад берагу.

За ўсё лета (а такога сонечнага і цёплага, нават сьпякотнага лета не было ў іх, кажуць фіны, ці сто гадоў, ці ніколі) ніхто нас ні разу не спыніў, не пераняў, а гэтым разам пераймае жанчынка і тлумачыць, што хадзіць нам сюды нельга, бо гэта прыватныя ўладаньні. Ну, я прабачыўся, сказаў, што лічыў, пакольку гатэль… а калі не — дык не.

Ідзём дахаты, дарогай тлумачу Стасю, што хадзіць сюды болей ня будзем, бо тут усё прыватнае. Шпунт малы спыняецца, недаўменна азіраецца назад і пытае:

— І мора?..

Тое самае і мне, прабачаючыся, карцела спытаць у жанчынкі. Толькі не як чатырохгадоваму дзіцяці, а як *савецкаму* чалавеку.

* * *

Савецкая сьвядомасць (хай сабе *нельга*, але калі хочацца, дык *можна*) найбольш раздражняецца драбязой.

Тут у другі бок праз другі лясок ёсьць і пірс, і пляж, і мора — для ўсіх. На беразе альтанка, у якой можна кілбаскі ці мяса падсмажыць, а каля яе кафэ маленькае. Са знаёмым, які зь Піцеру прыехаў, узялі піва і кілбаскі ў краме — сядзім, п'ём, смажым… Піва скончылася, дакупілі ў кафэ, пайшлі ў альтанку. Бяжыць з кафэ гаспадыня: «Нельга!..» Што нельга?.. Аказваецца, піва, купленае ў кафэ, можна піць толькі ў кафэ ці за столікамі побач. А ў альтанцы п'юць толькі прынесенае з сабой…

«Чаму так?..»

Яна і сама ня ведае, чаму так, але і высьвятляць з намі не зьбіраецца, чаму… Нельга — і ўсё.

Для нас гэта ідыятызм, і мы пачынаем даводзіць ёй, што гэта ідыятызм, шукаем спачуваньня наўкол, але нам не спачуваюць. «Нельга — і ўсё». Два фіны, зь якімі амаль па-сяброўску мы толькі што размаўлялі, адсоўваюцца і пазіраюць калюча.

Найлепей, не спрачаючыся, перайсьці зь півам пад парасон каля кафэ, там ня горш. Дык не: мы выліваем піва на траву за альтанкай…

На пратэст наш ніхто і ніяк не рэагуе. Вылілі дык вылілі, гэта можна.

# Прададзены гонар, або карупцыя ў шахматах

Гартаючы старонкі сайту «Беларускія шахматы», натрапіў на допіс пра ліпавыя шахматныя спаборніцтвы з загадзя вызначаным фіналам. Яны ладзяцца, каб даць камусьці магчымасьць павысіць рэйтынг альбо набыць міжнароднае званьне. Аўтар сайту спасылаўся на сёлетні турнір ва Ўкраіне, прысьвечаны памяці герояў Чарнобылю. Турнір абярнуўся скандалам: шахматысты, чые імёны былі аблудна скарыстаны ў справаздачах для ФІДЭ, урэшце абверглі зьвесткі пра свой удзел у спаборніцтве. **Вялікі спорт поўніцца скандаламі, і «каралеўская гульня» ня стала выняткам.**

Падзеі ва Ўкраіне — адно знак часу. Не сакрэт, што лёзунг Міжнароднай шахматнай фэдэрацыі «Мы ўсе — адна сям'я» страціў колішні бляск. Мажліва, якраз зь віны тых шахматыстаў і шахматных чыноўнікаў, што прыкрываюцца аўтарытэтам «сям'і», жывучы паводле ўласных «паняцьцяў». Напрыклад, пазалетась грузінскі гросмайстар Азмайпарашвілі з дазволу партнэра вярнуў ход назад і выйграў партыю, стаўшы чэмпіёнам Эўропы. Ці дазволілі б яму судзьдзі так груба парушыць Кодэкс, каб ён не займаў пасады віцэ-прэзыдэнта ФІДЭ?

У Беларусі пра скандальныя вяртаньні хадоў не чуваць. Праўда, яшчэ з савецкіх часоў практыкуецца гульня падстаўных асоб у спаборніцтвах мясцовага ўзроўню, у прыватнасьці, калі апошнія арганізуюцца дзеля «птушачкі». Карэспандэнту «НН» — кандыдату ў майстры — у кастрычніку 2003 г. спадарыня са спорткамітэту прапаноўвала згуляць у першынстве N-скага раёну сталіцы пад чужым прозьвішчам. Аргумэнт высоўваўся жалезны: «усе так робяць». У красавіку пад Радашкавічамі ладзілася міжунівэрсытэцкая спартакіяда (ня блытаць з агледжанай у «НН» унівэрсіядай), дзе адна з камандаў заявіла ўдзельніка, які ня меў дачыненьня да ВНУ. Пільным гульцам з БДУ ўдалося выкрыць падман і вынікі гора-шахматыста былі ануляваны.

15 гадоў таму ў Маскве да майго таварыша па беларускай дэлегацыі падышоў упэўнены чалавек з Каўказу і, не сароме-ючыся, паабяцаў немалую на той час суму, абы мянчук прайграў ягонаму сыну. Мікалай Аляўдзін, чэмпіён Менску 2003 і 2005 (майстар ФІДЭ, рэйтынг ЭЛА 2347), сьведчыць, што аналягічная сытуацыя здарылася зь ім летась, на мэмарыяле Верасава. Удзельнік — малады хлопец — прапаноўваў здаць партыю за грошы без пасрэднікаў. Аляўдзін адмовіўся і партыю выйграў.

Паводле М.Аляўдзіна, праблема неспартовых паводзінаў, фальсыфікацый вынікаў і выкарыстаньня адміністрацыйнага рэсурсу даволі вострая для беларускіх шахмат. Ён назваў пару прозьвішчаў, якія, на яго думку, «купілі» сабе званьні: «Усе пра іх ведаюць, але ніхто наўпрост пра штучныя пройгрышы ці пра «ліпавыя» турніры ня скажа. Можа, і ня варта выкрываць махляроў. Згуляеш з чалавекам, які «купіў» сабе рэйтынг, ён пакажа сваю сапраўдную сілу, і яго рэйтынг да цябе пяройдзе».

«У мяне такіх праблем няма», — адказаў заслужаны майстар спорту Сяргей Азараў на пытаньне пра карупцыю ў шахматах. У той жа час ён не адмаўляе, што ў апошніх турах адказных спаборніцтваў супернікі «праз стому» нярэдка расьпісваюць нічыі.

Анатоль Аліпаў, судзьдзя нацыянальнай катэгорыі, старшы трэнэр СДЮШАР-11, існаваньня «ліпавых» партый і рэйтынгаў не аспрэчвае: «Так, бывае, што шахматысты імітуюць барацьбу ці ўхіляюцца ад барацьбы, — у сям'і не бяз вырадка. Але даказаць нейкую фальсыфікацыю вельмі цяжка. Вунь Віктар Купрэйчык нядаўна ўзьняў пытаньне: ці правільна набыў званьне спадар Л.? У фэдэрацыі паглядзелі табліцу турніру, падпісаныя паважанымі расейскімі судзьдзямі, і пакінулі Л. у спакоі».

Удзельнік сёлетняй Вышэйшай лігі чэмпіянату Беларусі Павал Ламака (кандыдат у майстры спорту, ЭЛА 2409) лічыць, што сумнеўныя турніры ладзяцца скрозь і ўсюды і змагацца зь імі няма карысьці. «Каб меў грошы, я і сам бы «купіў» гросмайстарскае званьне ў Крыме або расейскім Арле».

Уладзімер Сычоў, былы старшыня падкамісіі па кампазыцыі пры Беларускай фэдэрацыі шахмат, расказаў пра тое, як гады тры таму зацьвярджалася званьне спадара М. Пры падачы дакумэнтаў у міністэрства віза старшыні была… мякка кажучы, зроблена чужымі рукамі. Справа выйшла наверх, аднак яе не раздулі, бо, як гаварылася на пасяджэньні выканкаму з удзелам Сычова, «нам не патрэбны звады». М. захаваў сваё званьне.

Выканаўчы дырэктар Беларускай фэдэрацыі шахмат Уладзімер Гінзбург кажа, што ня ведае пра спробы шахматыстаў купіць сабе тытулы, а калі штосьці і было, дык былылём парасло. Сп.Гінзбургу пярэчыць яго калега па «Вясьнянцы» Руслана Мачалава, трэнэрка са шматгадовым стажам: «У шахматах Беларусі цяпер дужа многа бруду — як ніколі».

Міністэрства спорту і турызму на карупцыйныя зьявы пазірае праз пальцы, бо і самі шахматысты часьцяком ня бачаць вялікага ліха ў «прададзеных» партыях ды рэйтынгах. Дык ці трэба ламаць дзіды? Мяркую, што трэба. Пацярпелымі праз хітрыкі дзялкоў аказваюцца аматары шахмат, якія ахвяруюць часам і грашыма, спадзеючыся ўбачыць сапраўдную гульню, спартовыя арганізатары, якім становіцца ўсё цяжэй знаходзіць спонсараў нават на сумленныя спаборніцтвы, і ў канчатковым пляне самі спартсмэны. Да таго ж і артыкулаў Крымінальнага кодэксу аб подкупе і махлярстве ніхто яшчэ не скасоўваў.

**Вольф Рубінчык,**
**rubinchyk@lycos.com**

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ТУРНІР ПА СПАРТОВЫХ ТАНЦАХ працягваецца ў Менску. Апошні дзень — 9 чэрвеня. Завітайце на Ўральскую, 3. Квіткі каштуюць ад 5 да 8 тыс. рублёў.**

# Спартовыя падзеі лета

## Футбол

Матчы нацыянальнай і моладзевай футбольных зборных Беларусі ў рамках адборачнага турніру на чэмпіянат сьвету.

**3 і 7 чэрвеня** моладзевая зборная Беларусі згуляе са зборнымі Славеніі і Шатляндыі. Матчы на стадыёне «Трактар».

**4 і 8 чэрвеня** свае матчы на стадыёне «Дынама» правядзе нацыянальная зборная. Першы матч са зборнай Славеніі, пачатак а 20-й, 8 чэрвеня — гульня з Шатляндыяй. Пачатак а 21-й.

Квіткі на матчы нацыянальнай дружыны нятанныя — ад 5 да 20 тыс. рублёў.

**13 і 20 ліпеня** — матчы першага раўнду Лігі чэмпіёнаў. Беларусь рэпрэзэнтуе менскае «Дынама». У выпадку пасьпяховага пераадоленьня першага бар'еру **26—27 ліпеня і 3 жніўня** «Дынама» чакаюць матчы другога этапу, **9—10 жніўня і 23—24 жніўня** — трэцяга этапу.

**14 і 28 ліпеня** — матчы першага этапу Кубку УЭФА. Хварэем за БАТЭ (Барысаў) і МТЗ-РІПА (Менск), **11 і 25 жніўня** — матчы другога этапу.

Ахвочым наведаць лішні раз суседнюю Літву рэкамэндую выбраць для гэтага 17 жніўня. У гэты дзень моладзевая і нацыянальная футбольныя зборныя згуляюць таварыскія матчы са зборнымі гэтай краіны.

## Гандбол

**12 і 18 чэрвеня** мужчынскія гандбольныя зборныя Беларусі і Ісьляндыі правядуць стыкавыя матчы. Пераможца двубою атрымае права выступіць у фінальнай стадыі чэмпіянату Эўропы. Першая сустрэча — у Рэйк'явіку; **18 чэрвеня** — матч у адказ у Менску. Матч пройдзе ў Палацы лёгкай атлетыкі ва Ўручы. Пачатак а 16-й.

## Тэніс

**20 чэрвеня** стартуе трэці турнір сэрыі «Вялікага шлему» — Ўімблданскі турнір. Можа, Максіму Мірнаму тут пашчасьціць болей, чым на «Roland Garros», дзе ён вылецеў у першым крузе індывідуальнага разраду.

## Лёгкая атлетыка

**З 6 па 14 жніўня** ў Хэльсынкі пройдзе чэмпіянат сьвету. У сталіцы Фінляндыі чакаецца выступ алімпійскай чэмпіёнкі Юліі Несьцярэнкі.

## Цяжкая атлетыка

**З 30 жніўня па 8 верасьня** ў Катары пройдзе чэмпіянат сьвету. У Доху едуць Ганна Бацюшка, Тацяна Стукалава, Віталь Дзербянёў, Аляксандар Анішчанка.

## Плаваньне

**З 17 па 31 ліпеня** ў Манрэалі (Кўэбэк, Канада) пройдзе чэмпіянат сьвету па водных відах спорту. Беларусы едуць бязь дзьвюх залатых рыбак — Алены Попчанкі, што нядаўна атрымала францускае грамадзянства, і Ганны Шчэрбы, якая таксама ня супраць адмовіцца ад беларускага пашпарта.

ІНФАРМАТАР

# Боўлінг і пэйнтбол у Менску


PHOTO.BYMEDIA.NET

**«Сфэра»**
пр.Дзяржынскага, 77а
Т.: 207-47-40, 697-47-40
Кошт (1 дарожка за 1 гадзіну):
пн, аўт, ср, чц, пт з 11.00 да 16.00 — 25 000
(для студэнтаў і школьнікаў — 12 000);
пн, аўт, ср, чц з 16.00 да 6.00 — 25 000;
пт з 16.00 да 6.00 — 30 000;
сб, ндз з 10.00 да 6.00 — 30 000.
Час працы: 11.00—6.00, выходныя дні — 10.00 — 6.00.
Колькасьць дарожак: 4.
Зьніжкі: сталым кліентам.

**«Вэрона»**
вул.Гікалы, 5
Т.: 231-94-81
Час працы: 12.00—6.00.
Колькасьць дарожак: 3.

**«Журавінка»**
вул.Янкі Купалы, 25
Т.: 206-69-09
Час працы: 13.00—6.00, сб, ндз — 9.00—6.00.Зьніжкі: сталым кліентам.

**«Madison»**
вул.Ціміразева, 9
Т.: 226-77-49
Час працы: 13.00 — 6.00, сб, ндз — 9.00 — 6.00.
Зьніжкі: сталым кліентам.

**«Ямайка»**
вул.Альшэўскага, 10
Т.: 254-71-94, 252-07-26
Час працы: 12.00 — 3.00, выходныя і сьвяточныя дні — 12.00 — 5.00.

**Менскі пэйнтбольны клюб (Раўбічы)**
вул.Магілёўская, 5-401 (офіс)
Т.: 222-21-56, 653-53-95, 653-53-94
E-mail: info@pb.by
сайт: www.pb.by
Гульні на трох пляцоўках у Раўбічах («Сьпідбол», «Аэрабол», «Руіны»), пэйнтбольны цір, выязныя гульні, карпаратыўныя гульні (да 100 чалавек), клюбныя праграмы.

Пошукавая гульня **«Схватка»**
Т.: 653-53-95 (Oliwa), 750-06-79 (Ruller)
сайт: www.cx.by

ПАРТЫЯ З ГРОСМАЙСТРАМ



Чытачам заманулася пайсьці **20…Тa8-d8**, на што гросмайстар адрэагаваў хутка: **21. e4-e5.** Выбар небагаты — пабіць пешкай на e5 (што рызыкоўна з прычыны 22. Кc5) або надалей саступіць прастору, як той Глёбус пад націскам міліцыянтаў — гл. «Сучасьнікаў».

Даслаць свой ход за чорных можа любы чытач «НН» да панядзелка, 19.00 — праз форму на bychess.narod.ru/nn/move.html або проста на nn@promedia.by («Каіса»). SMS: 754-04-53.

КАІСА

# Ці сумяшчальныя школа і шахматы?

Малыя й падлеткі, што ўтрапёна захапляюцца шахматамі, абыгрываючы дарослых, цяпер рэдка каго зьдзіўляць. Хрэстаматыйнай стала показка пра Капабланку, які ў чатыры гады пабіў бацьку, а ў трынаццаць стаў чэмпіёнам Кубы. Праўда, у кніжцы «Вундэркінды Беларусі», што летась выйшла ў Менску, фэнамэнальным вынікам называецца нават выкананьне ў 1998 г. 15-гадовым Сержуком Азаравым нормы майстра спорту (маўляў, Гарыку Каспараву норма скарылася ў 16 гадоў), аднак аўтар, доктар філязофскіх навук Юры Гусеў, пэўна, быў «ня ў курсе». За два дзесяцігодзьдзі шахматы моцна памаладзелі, і цяперашнія элітныя гульцы Пэтэр Лека, Эцьен Бакро, Руслан Панамароў у свае 14 гадоў заваявалі тытул ***гросмайстра***. Асабліва ўражлівая на юных «гросаў» Украіна: Каця Лагно выканала адпаведную норму ў 13, Сяргей Каракін — у 12 гадоў. У рэйтынг-сьпісе ФІДЭ С.Каракін, якому ледзь споўнілася 16, мае рэйтынг 2635 пунктаў і дзеліць месца ў першай сотні гульцоў сьвету з 33-гадовым беларусам Аляксеем Аляксандравым…

Калі ж і прагрэсаваць у шахматах, як ня ў школьныя гады? На прасторах СНД здаўна вядуцца дыскусіі, як прыстасаваць гульню да праграмы сярэдняй навучальнай установы, не зашкодзіўшы здароўю вучняў… Інтэлектуальныя практыкаваньні за шахматнай дошкай паляпшаюць прасторавае мысьленьне, уменьне лягічна разважаць, таму карысныя і фізікам, і лірыкам. У шэрагу беларускіх школ адкрыты так званыя «шахматныя клясы», дзе гульня выкладаецца як прадмет, але зазвычай яны трымаюцца на самаадданасьці асобных пэдагогаў. На стадыі экспэрымэнту завязьлі «ўрокі шахмат» у гарадзенскай гімназіі №1, хоць тамтэйшая энтузіястка Тацяна Дабкене і марыла пашырыць свой досьвед на ўсю краіну.

Сталічны камітэт па адукацыі пляную сьпярша ўвесьці шахматы ў праграму клясаў з матэматычным ухілам, «а там паглядзім». Шахматнаму ўсенавучу замінаюць індыфэрэнтнасьць фэдэрацыі, арыентаванай на інтарэсы чыноўнікаў і купкі прафэсійных гульцоў, а не на масавасьць, брак адмысловых катэдраў для падрыхтоўкі настаўнікаў шахмат. Да таго ж нацыянальныя спаборніцтвы школьных камандаў (накшталт «Белай туры»), што дазвалялі пэдагогам ацаніць здольнасьці вучняў пачатковых клясаў, заглухлі дзесьці на рубяжы стагодзьдзяў. Акурат пасьля таго, як паплечнікі «зьелі» арганізатара спаборніцтваў Уладзімера Палея, змушанага пераехаць у Швэцыю.

Аднак ёсьць яшчэ ў краіне людзі, якія пасьпяхова выяўляюць «вундэркіндаў» школьнага і нават дашкольнага веку. Алег Мядзьведзеў, Ланіта Стацко — досыць вядомыя і пэрспэктыўныя юныя шахматысты — падрадаваліся ў Міхаіла Сергіені, трэнэра менскай СДЮШАР-11. Ён жа ў пачатку дзесяцігодзьдзя ініцыяваў правядзеньне спаборніцтваў Беларусі для дзяцей да васьмі гадоў. Развагі сп.Сергіені аб навучаньні шахматам малодшых школьнікаў чытайце ў наступным выпуску «Каісы».

**ВР**

Як бы вы згулялі?



**Сэйфэрт — Палей, Катовіцы, 1990. Ход чорных.**

**Адказ:** Беларускі гулец ахвяраваў пару пешак, але перахапіў ініцыятыву: 1…b4!? 2. Кb4 d4! 3. cd Тb6 4. Кd5 Тb3. Чорным удалося выйграць.

## Errata

У харкаўскім «Кубку рэктара» (гл. «НН», № 18) Віктар Купрэйчык заняў не 7-е, а 9-е месца. У клюбным першынстве Беларусі («НН», № 19) каманда «Юнацтва» прадстаўляла не 11-ю спартшколу, а Рэспубліканскі цэнтар алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках. Перапрашаю.

ВАРТА БАЧЫЦЬ

## Пятніца, 3 чэрвеня

**БТ, 17.05**

«Адкрыты архіў».

Беларусь, 2005, рэж. Алесь Матафонаў.

Культурна-асьветніцкая перадача. Гэты выпуск «Адкрытага архіву» прысьвечаны Ляхавічам і Клецку.

**«Лад», 22.50**

«Горад Зэра».

Расея, 1988, рэж. Карэн Шахназараў.

Трагіфарс.

Галоўны герой (Леанід Філатаў) адпраўляецца ў камандзіроўку — і трапляе ў горад, дзе за фасадам штодзённасьці пануе абсурд. Тайна хавае тайну — і вярнуцца назад усё цяжэй…

Карціна Шахназарава зьнятая напрыканцы сконy савецкай сыстэмы, і ўся недарэчнасьць былога бюракратычнага монстра выстаўленая напаказ — і зло абсьмяянае. Плакальшчык па тым, што зьнікла (і вялікі прыхільнік Лукашэнкі), філёзаф Сяргей Кара-Мурза разглядаў фільм «Горад Зэра» як твор, што адыграў вялікую ролю ў зьнішчэньні Савецкага Саюзу.

## Субота, 4 чэрвеня

**СТВ, 23.40**

«Амэрыканская раскоша».

ЗША, 2003, рэж. Шэры Спрынгер Бэрман, Робэрт Пульчыні.

Камэдыя.

Кожны чалавек можа стаць героем коміксаў… Гэтую ісьціну даказвае Харві Пікар, сьціплы клерк са шпіталю для вэтэранаў, які ператкарае сваё жыцьцё ў крыніцу натхненьня, дзе хворыя зубы — змаганьне з ворагам, а пошук сяброўкі — подзьвіг новага Супэрмэна.

У карціне ролю героя іграе актор Пол Джамаці, але й сам прататып — Харві Пікар — зьяўляецца ў адным з эпізодаў.

**АНТ, 0.15**

«Музыка».

Мэксыка, 2003, рэж. Робэрт Радрыгес.

Самбрэра-вэстэрн.

Легендарны дэбют Робэрта Радрыгеса, зьняты за два тыдні і з ультраніжкім бюджэтам ($7000). Кіно энэргічнае і шалёнае, як п'яны матылёк; выдатнае скарыстаньне жанру вэстэрну — і пазнавальны аўтарскі стыль. Іронія, паэзія, натуралізм — і экспрэсіўны мантаж самога Радрыгеса.


WWW.UNCUT.AT

## Нядзеля, 5 чэрвеня

**НТВ, 13.00**

«Цацка».

Францыя, 1976, рэж. Францыс Вэбэр.

Камэдыя.

Недарэка-журналіст (П'ер Рышар) становіцца жывой цацкай маленькага мільянэра. Адна з найлепшых і самых гарманічных камэдый з П'ерам Рышарам.

**БТ, 19.15**

«Дунечка».

Беларусь—Расея, 2003, рэж. Аляксандар Яфрэмаў.

Мэлядрама, камэдыя.

Саладжавае і бесканфліктнае кіно для 50-гадовых тэатралак — і дзетак, якім трэба забыцца. Дзяўчынку Дунечку тэрмінова ўводзяць у спэктакль: гераіня назірае за тэатральным жыцьцём і ўпотайкі ўлюбляецца ў сямнаццацігадовага актора.

А.Яфрэмаў з годнасьцю здымае кіно, пазбаўленае месца, часу й напружаньня. Хаця ў карціне «Дунечка» ў якасьці часу дзеяньня пазначаны 1970-я, а месцам мусіць быць Купалаўскі тэатар, Яфрэмаў ператварае ўсё ў неабавязковыя каляровыя сны. І хаця гэтыя сны штучныя, наіўныя сьлёзы радасьці гліцэрынавыя, а карціна пустая, гледачам, стомленым страляканкамі, яна спадабаецца.

Варта адзначыць выдатную працу гукарэжысэра Сяргея Сіняўскага, хоць пры паказе па тэлевізіі яна будзе зьведзеная на нішто.

**«Лад», 21.35**

«Джульета і духі».

Італія—Францыя—Нямеччына, 1965, рэж. Фэдэрыка Фэліні.

Лірычны гратэск, мэлядрама, фантазія.

Галоўная гераіня (Джульета Мазіна, якую называлі «Чаплін у спадніцы») пакутуе ад здрады мужа.

Фэліні ўвасабляе на экране неймаверныя барочныя фантазіі, дзіўныя ілюзіі, лірычныя ўспаміны. Гермафрадыт-прарочыца, папяровыя крыльцы для дзяўчынкі-анёльчыка, ажыўленыя духі фантазій (дарэчы, карціну варта перакласьці як «Джульета, апантаная духамі»). Усё гэта злучаецца ў лірычныя, гратэскавыя, трагікамічныя сцэны, дзе ўжо ня столькі важны сюжэт, колькі колер і візуальная раскоша.

**НТВ, 22.40**

«Усход—Захад».

Францыя—Расея, 1999, рэж. Рэжы Варн'е.

Драма.

Пасьля вайны расейскі эмігрант Аляксей Галовін вяртаецца з жонкай-францужанкай у СССР. Мары, шакаваная савецкім ладам, імкнецца вярнуцца назад.

**Андрэй Расінскі**

# Magnificat

## Міжнародны фэст у Глыбокім

З 24 па 26 чэрвеня ў Глыбоцкім раёне (Віцебская вобласьць) пройдзе 1-шы Міжнародны каталіцкі фэстываль хрысьціянскіх дакумэнтальных фільмаў і тэлевізійных праграм "Magnificat-2005". Мерапрыемствы пройдуць у самім Глыбокім, а таксама ва Ўдзеле і Мосары.

Глыбоччына — адзін з астраўкоў каталіцтва ў Беларусі. Тут дзейнічае 12 парафій, ва Ўдзеле знаходзіцца кляштар францішканцаў і касьцёл Беззаганнага Зачацьця Панны Марыі, у вёсцы Мосар — адзін з помнікаў клясыцызму XVIII ст. — касьцёл Сьвятой Ганны. Дарэчы, у Мосары 24 чэрвеня пройдуць урачыстасьці сьвятога Яна.

Заснавальнікамі фэсту зьяўляюцца Каталіцкая асацыяцыя для камунікацый "Signis-Беларусь", незалежная студыя "Стопкадар", рэдакцыя часопісу "Дыялёг", а таксама Віцебская дыяцэзія.

Старшыня "Signis-Беларусь", рэжысэр і апэратар Юры Гарулёў, паведаміў, што ў праграму адабраныя 25 фільмаў з Украіны, Польшчы, Мэксыкі, Расеі, Францыі. Беларусь прадстаўлена трыма стужкамі: "Храм на мяжы" Міхаіла Жданоўскага, "Божа мой" Галіны Адамовіч і "Прымакі" Ўладзімера Бокуна — пра сям'ю праваслаўнага сьвятара.

Гледачам найзручней прыяжджаць 25-га ў само Глыбокае, дзе цягам дня будуць адбывацца кінапаказы.

**Андрэй Расінскі**

## ВЫСТАВЫ

**Канцылярская справа**
**З 7 да 10 чэрвеня** ў павільёне НВЦ "Белэкспа" (вул. Я.Купалы, 27) пройдзе спэцыялізаваная выстава-кірмаш "Канцылярская справа-2005".

**Пажарная і прамысловая бясьпека**
**З 7 да 9 чэрвеня** тамсама — выстава "Пажарная і прамысловая бясьпека".

**Мамант-2005**
**3 і 4 чэрвеня** ў канцэртнай залі "Менск" адбудзецца фінал конкурсу авангарднай моды "Мамант-2005", які ўключае ў сябе два паказы — конкурсны і гала-канцэрт, а таксама клюбныя паказы моды. Акрамя конкурсу маладых дызайнэраў вопраткі пройдзе выстава авангарднага выяўленчага мастацтва і канцэрт авангарднай музыкі. Пачатак а 19-й. Квіткі: 5 000—60 000.

**Рэтраспэктыўнае кіно**
У Музэі гісторыі беларускага кіно (вул.Сьвярдлова, 4) штосераду адбываецца рэтраспэктыўны паказ мастацкіх фільмаў з уделам У.Высоцкага. **8 чэрвеня** — "Саша-Сашанька", **15 чэрвеня** — "Кароткія сустрэчы", **22 чэрвеня** — "Інтэрвэнцыя", **29 чэрвеня** — "Небясьпечныя гастролі", **6 ліпеня** — "Кепскі добры чалавек", **13 ліпеня** — "Сказ пра тое, як цар Пётар арапа жаніў", **20—21 ліпеня** — "Маленькія трагедыі". Пачатак а 18-й.

**Dolce Vita**
У Нацыянальным музэі гісторыі і культуры Беларусі (вул. К.Маркса, 12) да **12 ліпеня** працуе выстава "Dolce Vita і ня толькі" — жаночы касьцюм сярэдзіны 1950—1990-х аўтарства самых вядомых італьянскіх мадэльераў. Сярод экспанатаў — сукенкі, паліто, вечаровыя туалеты ад Эміліё Пучы, Валянціна, Армані, Вэрсачэ.

**Літ-арт**
**Да 5 чэрвеня** ў Нацыянальным музэі гісторыі і культуры (вул. К.Маркса, 12) працуе V рэспубліканская выстава шрыфтавога мастацтва "Літ-арт". Квіткі: 2 000.

**Парыж да рэфэрэндуму**
У Доме фота (вул.Мясьнікова, 78) **да 19 чэрвеня** праходзіць выстава фатаздымкаў Аляксандра Пасканнага "Paris. Парыскае мэтро". Уваход вольны.

**Сувязі**
У "М-Галерэі" Інстытуту імя Гётэ (Фрунзэ, 5) **да 11 ліпеня** пройдзе выстава графікі "Сувязі". Будуць паказаны працы Алены Юр'евай, Вольгі, Сафіі і Валянціны Піскун.

## ТЭАТРЫ

**Опэра**
**2** (чц) — "Хаваншчына".
**4** (сб) — "Чароўная флейта".
**9** (чц) — "Барыс Гадуноў".
**11** (сб) — "Кармэн".
**12** (ндз) — "Вянок папулярных мэлёдый".

**Балет**
**3** (пт) — "Баядэрка".
**5** (ндз) — "Заснулая прыгажуня".

**Купалаўскі тэатар**
**2** (чц) — "Чычыкаў".
**3** (пт) — "Дзіўная місіс Сэвідж".
**5** (ндз) — "Паўлінка".
**6** (пн) — "Смак яблыка".
**7** (аўт) — "Я не пакіну цябе...".
**8** (ср) — "Таполевая завея".
**9** (чц) — "Згублены рай".
**10** (пт) — "Уваходзіць свабодны чалавек".
**12** (ндз) — "Эрык XIV".

**Тэатар беларускай драматургіі**
**2** (чц) — "Чорны квадрат".
**3** (пт) — "Парадоксы жарсьці".
**7** (аўт) — "Валянціна".
**8** (ср) — "Адвечная песьня".
**9** (чц) — "Містэр Розыгрыш".
**10** (пт) — "Адэль".

**Музычны тэатар**
**2** (чц) — "Каралева чардашу".

**Тэатар імя Горкага**
**2** (чц) — "Анджэла і іншыя".
**3** (пт) — "Тата, тата, бедны тата! Ты ня вылезеш з шафы... Ты павешаны нашай мамай паміж сукняй і піжамай".
**4** (сб) — "Суцяшальнік удоў".

**Моладзевы тэатар**
**2** (чц) — "Вясельлю быць, альбо З хлусьні мыты не бяруць".

**Тэатар-студыя кінаактора**
**2** (чц), **3** (пт) — "Філюмэна Мартурана".
**4** (сб), 5 (ндз) — "Міленькі ты мой".

## ФІЛЯРМОНІЯ

**Малая заля імя Р.Шырмы**
**2** (чц) — канцэрт фартэпіяннай музыкі.
**4** (сб) — "Тры вальсы". Песні і рамансы 50—60 г. XX ст.

**Заля камэрнай музыкі**
**2** (чц) — канцэрт фартэпіяннай музыкі.

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Рэактар (757-05-89)**
**9** (чц), 17.00 — фэстываль альтэрнатыўнай культуры «Pro_dvizhenie» з удзелам гуртоў «Куклы», «Ice brains», «Нестандартны варыянт», «IQ48», «Нагуаль», «Безь білету». У праграме таксама татуіроўкі, пірсінг. Стрыжкі, конкурсы і пэрформансы. Квіткі: 11 500, 13 500, 16 500.

## КІНО Ў МЕНСКУ

**"Аўрора"** (253-33-60)
"Стацкі саветнік" (прэм'ера): **3** (пт) 16.00 (іл), 18.30, 20.50; **4, 5** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 20.50.
"Ля мора" (прэм'ера): **3** (пт) 16.20, 18.40, 21.00; **4, 5** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.20, 18.40, 21.00.

**"Берасьце"** (272-87-91)
"Зоркавыя войны: эпізод III. Помста Сытхаў" (2с): **3** (пт) 15.15 (іл), 18.00 (іл), 21.00; **4, 5** (сб, ндз) 12.30 (іл), 15.15, 18.00.

**"Дружба"** (240-90-13)
"Царства нябеснае"*** (2с): **3—5** (пт—ндз) 17.30 (іл), 20.30.

**"Кастрычнік"** (232-93-25)
"Стацкі саветнік" (прэм'ера): **3** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **4, 5** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

**"Масква"** (203-14-48)
"Стацкі саветнік" (прэм'ера): **3** (пт) 16.30, 18.50, 21.10; **4, 5** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.30, 18.50, 21.10.

**"Мір"** (288-22-33)
"Зоркавыя войны: эпізод III. Помста Сытхаў" (2с): **3** (пт) 10.00 (іл), 15.00, 18.00, 20.40; **4, 5** (сб, ндз) 15.00 (іл), 18.00, 20.40.
"Уцёкі"***: **3—5** (пт—ндз) 16.40, 19.00, 21.10.

**"Перамога"** (203-77-66)
"Зоркавыя войны: эпізод III. Помста Сытхаў" (2с): **3** (пт) 13.00, 15.40, 18.20, 21.00; **4, 5** (сб, ндз) 12.30, 15.20 (іл), 18.10, 20.50.

**"Піянэр"** (227-64-87)
"Бой зь ценем"***: **3—5** (пт—ндз) 16.00, 18.30, 21.00.

**"Цэнтральны"** (200-34-16)
"Царства нябеснае"*** (2с): **3** (пт) 12.40, 15.30, 18.20, 21.00; **4, 5** (сб, ндз) 11.30 (іл), 14.30, 17.30, 20.30.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**ТЭАТАР**

**Тэатар юнага гледача**
**2** (чц) — "Дзень нараджэньня ката Леапольда".
**3** (пт) — "Каліф-шавец".
**6** (пн), **7** (аўт), **8** (ср) — "Папялушка".
**9** (чц), **10** (пт) — "Сястра мая Русалачка".

**Музычны тэатар**
**5** (ндз) — "Зачараваны прынц".

**КІНО**

**"Аўрора"**
"Гарфілд": **3** (пт) 10.30; **4, 5** (сб, ндз) 12.00.
"Алёша Паповіч і Тугарын Зьмей": **3** (пт) 11.00; **4, 5** (сб, ндз) 11.30.

**"Берасьце"**
"Ліла і Стыч": **3—5** (пт—ндз) 11.00.

**"Дружба"**
"Міс мядзьведзіца": **3** (пт) 10.30; **4, 5** (сб, ндз) 13.00.
"Прыгоды Фліка": **3** (пт) 13.00; **4** (сб) 15.00; **5** (ндз) 11.00.
"Гуляй, як Бэкхэм": **3, 5** (пт, ндз) 15.00; **4** (сб) 11.00.

**"Масква"**
"Шалёныя скачкі": **5** (ндз) 12.00.

**"Мір"**
"Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана": **3—5** (пт—ндз) 14.00.

**"Перамога"**
"Шалёныя скачкі": **3** (пт) 10.30.

**"Піянэр"**
"Прынц і я": **3** (пт) 10.20; **4, 5** (сб, ндз) 14.00.
"Горад чарадзеяў": **3** (пт) 12.20; **4, 5** (сб, ндз) 12.00.
"Шчаўкунок": **3** (пт) 14.00; **4, 5** (сб, ндз) 10.20.

**"Цэнтральны"**
"Падводная братва": **3** (пт) 11.00.

# Адкрыцьцё фатографа



**ВЫСТАВА ТВОРАЎ СЯРГЕЯ ВІШНЕЎСКАГА. У менскай галерэі «ДМ» (кавярня «Добрыя Мысьлі», вул.Магілёўская, 12) выстаўлены жывапісныя і фатапрацы докшыцкага мастака паваеннай пары. Павандруйце па яшчэ несавецкай Беларусі.**

## КІНО НА DVD

MASTER RECORDS

**"Што рабіць на выпадак пажару?"**
Трагікамічны трылер, Нямеччына, 2001, рэж. **Грэгар Шнітцлер.**
У ролях: **Тыль Швайгер, Марцін Фэйфэль.**
У 1987 годзе анархісты ўсталявалі бомбу. Праз 12 год бомбачка выбухнула…

**"Тыпу Амэрыка"**
Камэдыя, Вугоршчына, 2002, рэж. **Габар Эрэндзі.**
У ролях: **Чаба Піндраш, Дэжэ Саба.**
Галівудзкі прадусар абяцае тром братам запусьціць фільм, калі браты здабудуць палову грошай. У Вугоршчыне касавыя зборы абышлі "Тытанік".

Менск, Кісялёва, 12, т.643-21-08.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Магіла імпэрыі

"Стацкі саветнік" ("Статский советник")
Расея, 2005, каляровы, 125 хв.
**Жанр:** дэтэктыў, прыгоды
**Адзнака:** 4 (з 10)



"Гульні скончыліся", — абвяшчае рэкляма фільму "Стацкі саветнік" паводле раману Б.Акуніна. Разам з гульнямі аўтакраты і баявой арганізацыі эсэраў, на якія палюе Эраст Фандорын, — скончыліся й намёкі на жыцьцё. Стужка Філіпа Янкоўскага — братняя стацкая магіла як імпэрыі, так і яе зьнішчальнікаў. Гэта мёртвае кіно, якое цудоўна імітуе праўду.

Рытм карціны дынамічны, і ў ім ёсьць усё — акрамя аўры жывога, акрамя глытка кінапаветра. Рэжысура правільная й неўпрыкмет трупная — аніводнай шурпата-цёплай сцэны, аніводнай недарэчнасьці, аніводнага моцнага мантажнага стыку.

Усе пэрсанажы фільму вылеплены зь нянавісьці і расстаўлены паводле ранжыру, а каб роспач і разгубленасьць сучасных расейскіх эліт ня кідалася ў вочы, фігуры замаскаваныя гістарычнымі строямі й дэтэктыўнай інтрыгай.

Брыдкімі й мёртвымі выглядаюць тэрарысты-эсэры. Расейская інтэлігенцыя, якая змагалася "за шчасьце народнае", паўстае ў фільме як падпольна-недарэчная паскудная істота, вартая таго, каб ёй плюхнулі ў твар кіслатой.

На працілеглым полюсе — асыцела-летаргічны князь Даўгарукі (Алег Табакоў), атупелыя маскоўскія чыноўнікі, непрыемнасьлюнявы кіраўнік філёраў і сапраўдная радасьць: Мікіта Міхалкоў у звыклай для сябе ролі абаяльнага нягодніка. Хоць яго князь Пажарскі — самая жывая істота карціны (асабліва добра глядзіцца ў жаночай лазьні), унутраная спустошанасьць князя (з вонкавай бufанадай) — гарантыя ягонай сьмерці. Але каралём трупаў зьяўляецца ў фільме Алег Меншыкаў: Фандорын бледны, нерухомы, зьнямогла выпраўлены, нават зайканьне пэрсанажа — не праява жыцьця, а ганаровая памылка дзяржаўнай машыны.

Не дапамагаюць ажыўленьню й цытаты: Фандорын раскладае карты, як Штырліц, а аднакові дурны паліцмайстар (Фёдар Бандарчук) — чарговы варыянт гестапаўца Айсмана.

Імпэрскае расейскае кіно было запачаткаванае "Сібірскім цырульнікам" Міхалкова — у "Стацкім саветніку" гэтае кіно даходзіць да стадыі муміфікацыі. Увасобленая ў кіно грызьня "маскоўскіх" і "піцерскіх", бязьвер'е — і сьвядомая служба подласьці, што зьнішчае душу.

Калі "Сібірскі цырульнік" быў сьведчаньнем нэаімпэрскага павароту ў Расеі, то "Стацкі саветнік" — сьведчаньне вычарпаньня пуцінскага рэжыму.

**Андрэй Расінскі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Summertime and lazing is easy



Нават на старонках афіцыйных мас-мэдыя тэмпэратурныя рэкорды выцесьнілі працоўныя. Фэльетон Лёліка Ушкіна.

Нешта ніхто не адчувае ўзрушэньня ад таго, што 267 гаспадарак краіны выйшлі на 4 000 літраў удойнасьці ад каровы (так піша «Саўбелка»). А з кульбітамі градусаў Цэльсія справа іншая. Як толькі сонца раскумарылася, усімі авалодалі пафігізм і апатыя. Кар’ерныя, сэксуальныя і асабістыя ўстаноўкі забіла ідэфікс: ператварыцца ў «шчасьлівага дзікуна» з кніжкі Русо, распластацца пад пальмай на беразе акіяну і лузаць «Баўнці».

Іншымі словамі, памер неабходнай арганізму дозы фізычнай асалоды рэзка падскочыў. Прычым гэта толькі пачатак сэзону, а што будзе недзе там у ліпені?.. Павальная сіеста.

Праанілізаваўшы сацыяльна-псыхалягічныя вынікі глябальнага пацяпленьня ў Беларусі, мусім сказаць самі сабе страшную рэч: «Шухер! Беларуская пратэстанцкая дактрына апынулася пад пагрозай! Назіраецца паўзучая рэвізія нашага этычнага дыскурсу. Тупое жаданьне плоцевай асалоды, быццам вірус, акупуе сэктар за сэктарам мазгавога вінчэстэра».

Натуральна, першым закладнікам тэмпэратурнага coup d’etat сталі ўлады. Пакуль апошнімі днямі піпл загібаўся ад сьпякоты, яго слугі сядзелі ў абсталяваных кандыцыянэрамі кабінэтах і мазгавалі, як да 2010 году трансфармаваць беларускую вёску ў сэн-сымонаўскія фалянстэры.

Абламіцеся! Ня трэба стыкераў «Сёньня Ўкраіна — заўтра Беларусь», графіці «Зубра», сайту «Хартыі» і нават замежных галасоў, каб зарубіць згаданы праект. Як толькі тэрмомэтар пакажа 25 градусаў, брыгадзір скажа: «Ладна, хлопцы, перакур. А ты, Вася, дуй у магаз па бырла». Тут праграме і капец.

Барацьба зь цялеснымі практыкамі, выкліканымі зьменамі ў атмасфэры, робіцца для нас архіактуальнай. Цікава, што той жа самы гемарой даставаў дзяржаўны мэнэджмэнт у час пераходу грамадзтва ад фэадалізму да капіталізму — зьнішчыць у целе ўсе не адпавядаючыя працоўнай дысцыпліне спакусы. Ахвярай кампаніі, у ходзе якой быў створаны дысцыплінарны таталітарны апарат, сталі сэкс і шыза.

Беларусі ня меней, чым Эўропе, патрэбен дзяржаўны інстытут кантролю за паталёгіямі (цяпэр гэта будзе называцца так) расслабону, які мог бы праводзіць аналягічныя рэформы: у садках нафіг адмяніць усе прагулкі, забараніць пляжы, павыкідваць лаўкі з паркаў. Самі паркі зьнішчыць.

А ўвосень падчас дзяжурнага рэфэрэндуму правесьці папраўку да артыкулу Канстытуцыі аб тым, што грамадзяне РБ маюць права на адпачынак. У новай рэдакцыі, якую, натуральна, падтрымаюць 84% тых, хто мае права галасаваць, артыкул павінен гучаць наступным чынам: «Грамадзяне маюць права на адпачынак ад адпачынку у форме працы».

ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 63125

легенда беларускага друку



Падпіску на «НН» прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку». Падпісацца можна адразу на паўгодзьдзе. Для прыватных асобаў — 4510 рублёў на месяц, для арганізацыяў — 5631 рублёў. Падпіска на шапікі «Белсаюздруку» каштуе 3440 рублёў на месяц. «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень.

Дык падпісвайся!

Запрашаем у падарожжа

**5 чэрвеня (нядзеля)**

па маршруце: **Менск—Косава—Сынковічы—Слонім—Жыровічы—Менск.**

Кошт: 24 тыс. рублёў

**11—12 чэрвеня**

**Вільня—Трокі—Меднікі—Коўна.**

Кошт: 35 эўра

**Т.: 279-05-85, 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер) 264-12-38, 776-24-35 (Павал)**

КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на стар. 24

**Рэклямныя расцэнкі:**
— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.
За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль)— 4000 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 650 руб.
Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.
Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.
На зваротным баку блянку паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».

Даведкі праз т. (017) 284-73-29

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**БАСОВІШЧА-2005**

22—23 ліпеня ў Гарадку, што на Беласточчыне, пройдзе XVI фэстываль беларускага року “Басовішча-2005”. Бяруць удзел генэралы айчыннай музыкі: “N.R.M.”, “Крама”, “Нэйра Дзюбэль”, “Уліс”, а таксама леташнія пераможцы “Тарпач”, “Сонцаварот”, “Таксі”, “НМР”.

Усім, хто пажадае самастойна ўзяць удзел у фэсьце, будзе дадзена “вольная сцэна”. Галоўная ўмова — тэксты па-беларуску. Зь беларускага боку на конкурс едуць 8 выканаўцаў. Тым, хто жадае ўзяць удзел у конкурснай частцы, неабходна да 10 чэрвеня даслаць свае дэмазапісы на адрас: Супрановіч Віталь, а/с 5, 220085, Менск; або зьвязацца з арганізатарамі на тэл. 649-08-88 або 208-46-07 (Віталь).

Для ўсіх ахвотных наведаць адзінае штогадовае сьвята беларускай рок-музыкі арганізуецца традыцыйная дастаўка аўтобусамі.Зьвяртацца можна па вышэй пазначаных кантактах

**HARDCOREМАНІЯ: ЧАДУ!-2**

Пачалася праца над чарговай складанкай “Hardcoreманія: чаду!-2”, дзе будуць прадстаўлены найлепшыя беларускія коравыя каманды ва ўсіх адгалінаваньнях стылю. Дасылайце свае запісы на адрас: Супрановіч Віталь, а/с 5, 220085, Менск; або тэлефануйце 649-08-88 або 208-46-07 (Віталь).

**РАДЫЁ**

Штопятніцы на хвалях радыё “Менск” (92,4 FM) з 23.00 да 0.00 можна слухаць радыёвэрсію гіт-параду “Тузін гітоў”. Вядучы праграмы — Алег Хаменка. Толькі беларускія песьні!

**ВІТАНЬНІ**

**Шчыра дзякуем** спадару Ўладзімеру Ракіцкаму за цудоўную экскурсію па Полацку. Студэнты-багемісты зь Менску

**КНІГІ, ФІЛЬМЫ**

**“Акупацыя. Містэрыі”**, “Швадрон”, “Александрына Шклоўская”, “Вяртаньне” ды іншыя фільмы на CD, мульфільмы на касэтах на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак—пятніца (13:00—19:00)

**Прадам кнігі**: “Беларускі кнігазбор”: Гётэ, К.Каліноўскі, Я.Карскі, Я.Чачот; “Армія Краёва на Беларусі” Я.Сямашкі; “Ад родных ніў” Л.Геніюш, факс. выд., Прага, 1942; “Кароткая гісторыя Беларусі” В.Ластоўскага, “З гісторыі беларускай эміграцыі ў Заходняй Нямеччыне 1939—1951 г.” А.Віньніцкага, “Глыбокае на старых паштоўках” ды інш., багаты выбар па гісторыі, этнаграфіі, архітэктуры, археалёгіі, мастацтве. Т.: 753-70-05

**Прадам кнігі**: энцыкляпэдыю “Археалёгія і нумізматыка Беларусі”, “Тэўтонскі ордэн” А.Краўцэвіча, “Кароткая гісторыя Беларусі” В.Ластоўскага, факс. выд. 1910 г., “Белорусское народное зодчество” ды інш. Т.: 753-70-05

**Кнігі — поштай.** Замаўляйце каталёг: поштай — а/с 333, 220050, Менск; e-mail: exlibris@tut.by; сайт — http://knihi.net. Т.: 643-57-33

**Кнігі — поштай. Новае**: “Беларускі клясычны правапіс. Збор правілаў”, “Arche-Пачатак” №3/2005, “Да гісторыі беларускай літаратуры” А.Адамовіча, “Гук сонечнага гадзіньніка” Г.Андранікавай, “Запісы БІНіМ” №28, “Штодзённасьць за лініяй фронту” Б.К’яры. Т.: 643-57-33, e-mail: exlibris@tut.by

**Кнігі — поштай. Новыя CD**: “Крама” — “Будзь разам з намі — The Best”, “Guda” — “Games Of Gods / Ігры Багоў”. Т.: 643-57-33, exlibris@tut.by

**Шукаю кнігу** “Судьбы национальных меньшинств на Смоленщине. 1918—1938 годы” (Смаленск, 1994), а таксама розныя матэрыялы, прысьвечаныя беларусам Смаленшчыны. E-mail: berrashed@tut.by

**Кнігі** па архітэктуры Беларусі, гісторыі, этнаграфіі, мовазнаўстве, слоўнікі, дзіцячыя кнігі, відэа, аўдыё, фільмы на CD, газэты, значкі на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак — пятніца (13.00—19.00). Т.: 707-40-01

**Дабрачынная раздача кніжак** па гісторыі, філязофіі, паліталёгіі, мовазнаўстве, археалёгіі на прымальных умовах на Румянцава, 13 (ТБМ) штотыднёва (панядзелак — пятніца) з 13.00 да 19.00. Т.: 707-40-01, 234-93-71

**Кнігаабмен.** Т.753-91-96

**Шукаю** даваенныя кнігі й пэрыёдыкі па шахматах ды шашках, часопіс “Сказки в России” (выд. Сарокін, Івана-Франкоўск). E-mail: kirill_urusov@mail.ru

**Праца**

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17-й. Т.: 235-18-72. Юры

**Шукаю працу** філёляга. Т.: 236-13-38

ЦЫМБАЛЫ

Прадам цымбалы. т.262-11-19

Прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 3431.** **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 20.00 01.06.2005.

Замова № 3145.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а